Да даўжніка – з прыставам

СТАР.3

Думаць пра звычайнага настаўніка

СТАР.4

Як палепшыць восеньскі настрой?

СТАР.5

Родная газета на роднай мове

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

ЗВЯЗДА

19 ЛІСТАПАДА 2014 г. СЕРАДА № 219 (27829) Кошт 1800 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

АБАРАНЯЮЧЫ АГУЛЬНЫЯ ІНТАРЭСЫ

Ці адновіцца дыялог у мінскім фармаце па крызісе ва Украіне?

Тое, што адбываецца ў суседняй краіне, што сітуацыя ў ёй пачала пагаршацца, не можа не выклікаць занепакоенасці ў яе суседзяў. Аб гэтым заявіў Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка на сустрэчы з міністрам замежных спраў Расіі Сяргеем Лаўровым, паведамляе БЕЛТА.

«Апошнім часам сітуацыя вакол нашых граніц, Саюзнай дзяржавы насцярожвае. Мы не можам пагадзіцца з той актыўнасцю, якая сёння прымаецца з боку заходніх дзяржаў на заходніх граніцах нашай Саюзнай дзяржавы. Мы не можам пагадзіцца з тэндэнцыяй пагаршэння сітуацыі ва Украіне, не толькі ў Данбаскім, Данецкім рэгіёнах, але і ў цэлым ва Украіне», — адзначыў Прэзідэнт Беларусі.

«Мы вельмі спадзяваліся, што пасля выбараў сітуацыя будзе развівацца ў лепшым кірунку, у кірунку стабільнасці. Але, на жаль, мы гэтага не бачым», — сказаў кіраўнік беларускай дзяржавы.

Аляксандр Лукашэнка лічыць, што сітуацыя вакол Беларусі вельмі цесна звязана і з Расіяй. «Праблемы непадзельныя: нашы праблемы — гэта і вашы праблемы, а вашы праблемы — гэта нашы праблемы, — сказаў Прэзідэнт Беларусі. — Гэта націск на Беларусь, які далёка не абыякавы для Расійскай Федэрацыі. Зразумела, гэта націск і на Расійскую Федэрацыю, у якой і так праблем дастаткова».

«Таму гэтыя праблемы, якія складваюцца вакол нас, перш за ўсё датычацца знешнепалітычных ведамстваў, вісяць над сітуацыяй у Беларусі і, зразумела, Расіі, яны нас не турбаваць не могуць», — падкрэсліў беларускі лідар.

Аляксандр Лукашэнка выказаў пажаданне, каб гэтая тэма была абмеркавана беларускім і расійскім бакамі і, па яго словах, «мы прыйшлі да нейкай адзінай пазіцыі і разам маглі зладжана дзейнічаць у адзіным ключы». «Праблема ёсць, яе трэба вырашаць», — дадаў кіраўнік беларускай дзяржавы, звярнуўшы ўвагу на важнасць сустрэч у Мінску для выпрацоўкі кірункаў дзейнасці.

Што датычыцца двухбаковых беларуска-расійскіх адносін, то Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што праблем, якія насцярожваюць, у адносінах няма наогул. «Мы пачынаем новы год, у прынцыпе, без праблем у нашых адносінах, нават дробных. Мы дамовіліся па ўсіх пытаннях», — сказаў Прэзідэнт Беларусі. На яго думку, калі б усе міністэрствы і ведамствы з абодвух бакоў працавалі так, як міністэрствы замежных спраў і абароны, у дзвюх дзяржаў наогул не было б ніякіх праблем.

У сваю чаргу, міністр замежных спраў Расіі Сяргей Лаўроў, гаворачы аб сітуацыі вакол падзей ва Украіне, падкрэсліў, што галоўная задача на гэтым этапе — стварыць умовы для аднаўлення дыялогу па Украіне ў мінскім фармаце. «Гэта адзіны фармат, дзе бакі канфлікту сядзяць адзін з адным за сталом перагавораў, — сказаў міністр. — Ёсць аснова ў выглядзе мінскага пратакола і мінскага мемарандума. Мы за тое, каб кожны пункт гэтых дакументаў выконваўся няўхільна».

«Паўднёвы ўсход аб'явіў публічна аб гатоўнасці да гэтага. Разлічваем, што апошнія дзеянні Кіева, калі быў прыняты ўказ аб істотным абмежаванні сацыяльна-эканамічных працэсаў і спыненні банкаўскага абслугоўвання паўднёвага ўсходу, не стануць непераадольнай перашкодай для аднаўлення мінскага працэсу, які цяпер — адзіны фармат, што падыходзіць усім», — падкрэсліў кіраўнік МЗС Расіі.

Сяргей Лаўроў адзначыў, што расійскі бок надае павышаную ўвагу пытанням забеспячэння інтарэсаў Расіі і Беларусі ў рамках Саюзнай дзяржавы. Паводле яго слоў, на сумесным пасяджэнні калегій двух знешнепалітычных ведамстваў сярод іншых важных пытанняў разглядалася сітуацыя ў Еўропе ў кантэксце адносін Расіі і Беларусі з Еўрасаюзам, а таксама ў кантэксце сумеснай работы ў Арганізацыі па бяспецы і супрацоўніцтве ў Еўропе, «дзе ўкраінская тэматыка сімвалізуе сабой выкід наверх усяго комплексу супярэчнасцяў, якія назапашваліся апошнія пару дзесяцігоддзяў».

«Мы падзяляем вашу ацэнку таго, што адбываецца ва Украіне. Мы вельмі хацелі б, каб пасля выбараў аднавіўся ўжо на новых асновах прамы дыялог, якому быў дадзены старт тут, у Мінску. І мінскія дамоўленасці цяпер, напэўна, адзінае, што падтрымліваецца ўсімі без выключэння — і самімі ўкраінскімі бакамі, і Расіяй, і Беларуссю, зразумела, і Еўрасаюзам, і Злучанымі Штатамі Амерыкі», — падкрэсліў Сяргей Лаўроў.

Напярэдадні адбылося сумеснае пасяджэнне калегій МЗС Беларусі і Расіі, падчас якога ўкраінскае пытанне таксама было адным з галоўных.

НА ДАРОЖКУ...

Стыхійны восеньскі кірмаш. (Дзесьці паміж Баранавічамі і Нясвіжам.)

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

ЦЫТАТА ДНЯ

Віктар ЧАЙЧЫЦ, старшыня Рэспубліканскай калегіі адвакатаў:

«Грамадзяне павінны з усёй адказнасцю ставіцца да магчымасці звярнуцца ў адпаведныя органы з дапамогай электроннага звароту. Падобныя звароты ні ў якім разе не павінны ператварыцца ў бясконцыя скаргі людзей ва ўсе інстанцыі, яны павінны быць накіраваны на аператыўнае вырашэнне пытанняў, якія ўзнікаюць. Неабходна разумець, што часам беспадстаўныя эмоцыі, неабгрунтаваныя патрабаванні, выкладзеныя ў такім звароце, адцягваюць чыноўніка ад важных надзённых спраў, бо ў адпаведнасці з законам ён абавязаны рэагаваць на кожны зварот. Можа быць, лепш звярнуцца да адваката, своечасовая дапамога якога можа і зусім пазбавіць ад неабходнасці любых зваротаў да чыноўнікаў».

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 19.11.2014 г.

Долар ЗША	10770,00	▲
Еўра	13440,00	▼
Рас. руб.	228,50	▲
Укр. грыўня	691,83	▼

■ Жывіце ў бяспецы

НЕ ПАЙСЦІ НА ДНО

Ці будуць штрафаваць тых, хто выходзіць на тонкі лёд?

Надвор'е пачынае перастройвацца на зімовы лад, і ўсё бліжэй дзень, калі рэкі і азёры пакрыюцца лёдам — на радасць дзецям і рыбакам ды на галаўны боль ратаўнікам. Як жа трэба правільна сябе паводзіць на лёдзе? І якія новаўвядзенні чакаюць аматараў пагуляць ці парыбачыць на ім? Расказаць аб гэтым карэспандэнт «Звязды» папрасіў супрацоўнікаў Рэспубліканскага дзяржаўна-грамадскага аб'яднання «Беларускае рэспубліканскае таварыства ратавання на водах».

Гэтай восенню першы лёд ужо забраў тры жыцці. У Мінску хлопчык праваліўся ў халодную ваду ў кар'еры і пасля памёр у бальніцы. З другога кар'ера, размешчанага ўжо ў Бабруйскім раёне, не вярнуліся два пенсіянеры, якія вырашылі там парыбачыць. Хоць лёд на ім утварыўся, аднак ён быў зусім тонкі — каля 4 сантыметраў. А каб вытрымаць вагу чалавека, патрэбна як мінімум 7...

Фота Васіля ЯНЬКО.

— Мы звяртаемся да дарослых: калі побач з вашым жытлом знаходзіцца рака, возера, сажалка, кар'ер ці нейкі іншы вадаём, не пакідайце дзяцей без кантролю! — заклікае **начальнік рэспубліканскай вадалазна-выратавальнай службы Таварыства ратавання на водах Сяргей Патрыкееў**. — І не будзьце абыякавымі, калі бачыце, што на тонкі лёд выходзяць чыесьці дзеці. Бо дастаткова ўсяго адной секунды, каб здарылася непапраўнае...

СТАР.3

■ Гісторыя без купюр

ІСЦІНА АБ ВЯЛІКАЙ ВАЙНЕ: СЕРБСКІ ПОГЛЯД

Фота Аляксандра ШАБЛЮКА.

У Выдавецкім доме «Звязда» прэзентавалі кнігу, якая развенчвае стэрэатыпы аб тым, з чаго пачалася Першая сусветная.

Ва ўсім свеце цяпер актыўна абмяркоўваецца тэма Першай сусветнай вайны. Многія вядомыя і невядомыя падзеі стагадовай даўнасці знаходзяць адлюстраванне на старонках літаратурных выданняў. Кніга «Сербія ў Вялікай вайне 1914—1918», прэзентацыя якой адбылася ўчора ў канферэнц-зале Выдавецкага дома «Звязда», займае асобнае месца ў гэтым шэрагу.

Гэта ўжо пятае выданне дакументальнай працы, аўтарамі якой з'яўляюцца **дацэнт аддзялення гісторыі філасофскага факультэта Бялградскага ўніверсітэта Міра РАДОЕВІЧ** *(на фота)* **і член-карэспандэнт Сербскай акадэміі навук і мастацтваў прафесар Любадраг ДЗІМІЧ**.

СТАР.6

ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

У ЗША рэзка павялічылася колькасць бяздомных дзяцей



Нацыянальны цэнтр па справах бяздомных ЗША апублікаваў справаздачу аб дзецях, што страцілі прытулак, згодна з якой іх колькасць вырасла на 8%. Атрыманыя даныя заснаваныя на апошніх падліках амерыканскага дэпартамента адукацыі. У лічбах 8% складаюць прыкладна 2,5 млн бяздомных дзяцей. Такім чынам, як адзначаецца ў справаздачы, кожнае трыццатае дзіця ў ЗША можа лічыцца пазбаўленым прытулку.

Пяць чалавек загінулі ў выніку нападу на сінагогу ў Іерусаліме

У Іерусаліме здзейснены напад на сінагогу, у выніку чаго пяць чалавек загінулі, дзевяць былі паранены, паведамляюць інфармагенцтвы. Трагедыя адбылася ў раёне Хар-Ноф на захадзе Іерусаліма. Двое палесцінцаў, узброеных нажамі і сякерамі, уварваліся ў памяшканне падчас малітвы і напалі на вернікаў. Адзначаецца, што тэрарыстаў застрэлілі супрацоўнікі паліцыі Ізраіля.

Казахстан абмежаваў продаж расійскай гарэлкі і піва

Казахстан увёў забарону на продаж некалькіх марак расійскай гарэлкі і піва, паведамляецца на сайце Камітэта па абароне правоў спажыўцоў Міністэрства нацыянальнай эканомікі Казахстана. Прычынай такога рашэння стала выяўленая неадпаведнасць алкагольнай прадукцыі вытворчасці Расійскай Федэрацыі патрабаванням харчовай бяспекі.

ПАДРАБЯЗНАСЦІ

Салодкія газаваныя напоі могуць прыраўняць да тытунёвай прадукцыі?

Амерыканскія эксперты заклікаюць размяшчаць на банках з газіроўкай такія ж папярэджанні, што і на пачках з цыгарэтамі.

Член заканадаўчага сходу Нью-Ёрка Карым Камара прадставіў законапраект, які зацвердзіць новы рэгламент у дачыненні да папераджальнай маркіроўкі на пэўных напоях. Паводле рэкамендацый Сусветнай арганізацыі аховы здароўя, сярэднестатыстычнаму чалавеку трэба знізіць паказчыкі спажывання цукру ў прадуктах з 50 г да 25 г у дзень. У бляшанцы колы змяшчаецца 35 г, піша The Daily Mail. Адзін з варыянтаў папераджальнага надпісу выглядае так (усе словы вялікімі літарамі): «Папярэджанне пра бяспеку прадукту: распіццё напояў, якія змяшчаюць цукар, прыводзіць да атлусцення, дыябету і карыесу».

Сапраўды, вядома, што салодкія напоі звязаны з атлусценнем і дыябетам 2 тыпу. Гэта асабліва небяспечна для дзяцей. Таксама атлусценне пагражае захворваннямі на рак, хваробамі сэрца і інсультам.

КАРОТКА

Кантракт на імпарт расійскага газу ў Беларусь на 2015—2017 гады плануецца падпісаць да 30 лістапада. Аб гэтым паведаміў учора першы намеснік прэм'ер-міністра Беларусі Уладзімір Сямашка.

Беларусь прыцягнула за чатыры гады амаль $8 млрд прамых замежных інвестыцый на чыстай аснове.

Загадчык лабараторыі Навукова-даследчага інстытута фізіка-хімічных праблем БДУ Дзмітрый Грыншпан упершыню ўдастоены высокай узнагароды «Заходняе возера Дружба» Народнага ўрада кітайскай правінцыі Чжэцзян.

У студзені—верасні агульны аб'ём грашовых даходаў насельніцтва склаў Br382,1 трлн, у разліку на душу насельніцтва — Br4 млн 482,9 тыс. у месяц. Ён вырас на 1,5% у параўнанні з адпаведным леташнім перыядам.

Колькасць электронных зваротаў у Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Беларусі ў студзені—верасні 2014 года ў параўнанні з аналагічным перыядам мінулага года павялічылася на 8,5%.

Больш як 1,8 тыс. зняволеных выпушчаны на свабоду па амністыі ў гонар 70-годдзя вызвалення Беларусі.

■ Я зноў выбіраю «Звязду»

«ТАМУ ШТО САМАЯ СПРАВЯДЛІВАЯ»

Аляксандр Рыгоравіч БЛІЗНЮК, пенсіянер, вёска Новадзявяткавічы Слонімскага раёна:

— На пачатку дзевяностых я працаваў кіраўніком саўгаса. У наш сельсавет прыходзіла «Звязда». Я тады пабачыў яе і з тых часоў — вось ужо дваццаць гадоў — выпісваю.

У «Звяздзе» мне падабаецца ўсё! Люблю яе за тое, што цалкам беларускамоўная. Я сам беларус, і продкі мае — беларусы, нават вучыўся па-беларуску, таму ведаю мову і люблю чытаць на ёй.

Газету чытаю «ад вокладкі да вокладкі». Няма такога, каб нешта прапускаў. Я рознабаковы чалавек, таму мяне цікавяць многія тэмы. Асабліва мне падабаецца «Алё, народ на провадзе!» Валянціны Доўнар — толькі вельмі добрая жанчына можа так пісаць. З задавальненнем чытаю «Неасабісты суб'ектыў» Алены Ляўковіч. Я жыву ў вёсцы і заўсёды цікаўлюся матэрыяламі ўкладкі «Мясцовае самакіраванне», сачу за публікацыямі Таццяны Лазоўскай. Цікава піша пра школу Генадзь Аўласенка — гэтая тэма мне таксама блізкая, бо мой сын — дырэктар школы ў Новадзявяткавічах. Карацей, газета цалкам мяне задавальняе!

Я выпісваю некалькі газет і часопісаў, параўноўваю іх. Аднак лічу, што «Звязда» — самая справядлівая. У ёй найменш афіцыйных матэрыялаў і тэмы асвятляюцца рознабакова.

Дзіяна СЕРАДЗЮК.

Працягваецца падпіска на «Звязду» на I паўгоддзе 2015 года!

ЗВЯЗДА Да чытача з любоўю!

Падпісацца на газету можна ў любым аддзяленні паштовай сувязі; з дапамогай аплатна-даведачнага тэрмінала РУП «Белпошта»; праз сістэму «інтэрнэт-падпіска» на сайце www.belpost.by; у кіёсках «Белсаюздрука»; у паштальёнаў.

Падпіска, дарэчы, можа стаць добрым падарункам да свята для вашых родных і блізкіх, для вашых сяброў.

ISSN 1990 - 763X

■ Ідэі маладых

ПАСПРАБАВАЦЬ СВАЕ СІЛЫ

Днямі ў Нацыянальнай акадэміі навук праходзіць Міжнародная навукова-практычная канферэнцыя «Моладзь у навуцы — 2014». Мерапрыемства ладзіцца ўжо ў адзінаццаты раз і збірае маладых навукоўцаў, аспірантаў, магістрантаў, студэнтаў і школьнікаў. Сёлета ў форуме ўдзельнічаюць больш за 400 чалавек з Беларусі, Расіі, Украіны, Казахстана, Арменіі, Польшчы, Літвы, Балгарыі і іншых краін.

— На маю думку, канферэнцыя «Моладзь у навуцы» з'яўляецца своеасаблівым трэніровачным плацдармам для ўсіх, хто хоча паспрабаваць свае сілы, — лічыць **Аляксей ТРУХАНАЎ, намеснік старшыні Савета маладых вучоных НАН Беларусі, кандыдат фізіка-матэматычных навук.** — У першую чаргу для тых, хто, магчыма, не паспеў вызначыцца са сферай, якая яму цікавая, ці не да канца матываваны для таго, каб пайсці ў навуку. Наша мерапрыемства якраз дае магчымасць паспрабаваць сябе. Бо існуе пэўная праблема: многія маладыя людзі пасля ўніверсітэта ідуць працаваць даследчыкамі без належнай матывацыі, напрыклад, па размеркаванні. Нічога добрага з гэтага звычайна не атрымліваецца. Таму трэба ўсімі магчымымі спосабамі падтрымліваць маладых навукоўцаў, якія гэтую матывацыю маюць.

У межах канферэнцыі запланавана правядзенне «круглага стала» пад назвай «Перспектывы міжнароднага навукова-тэхнічнага супрацоўніцтва маладых вучоных», падчас якога ўдзельнікі абмяркуюць пытанні арганізацыі і правядзення І Еўразійскага навуковага форуму маладых вучоных. Усяго на канферэнцыі будзе працаваць 12 секцый, сярод якіх — і традыцыйная «Першы крок у навуку», дзе выступяць навучэнцы школ і гімназій краіны. Усяго ў праграму мерапрыемства ўключана 340 дакладаў.

— Супрацоўніцтва навуковай моладзі Беларусі і Арменіі актывізавалася тры гады таму, — гаворыць **Геворг ВАРДАНЯН, старшыня Савета маладых вучоных НАН Арменіі.** — Ужо другі раз мы бяром удзел у канферэнцыі «Моладзь у навуцы». Уражанні ад мерапрыемства вельмі добрыя. Мне падабаецца, што ўдзел у ім бяруць людзі з самых розных куткоў Беларусі, не толькі са сталіцы. Гэта вельмі важна. Ды і ўвогуле любое маладзёжнае навуковае мерапрыемства мае вялікую каштоўнасць, бо яно фарміруе інтэлектуальную будучыню краіны. Акрамя непасрэднага ўдзелу ў канферэнцыі, мы плануем падпісаць дагавор аб супрацоўніцтве ў сферы маладзёжнай навукі. Такі крок дапаможа нам больш актыўна займацца сумеснымі праектамі, разам працаваць над праграмамі па грантах і многае іншае. Таму падобныя канферэнцыі — гэта яшчэ і добрая пляцоўка для двухбаковых перамоў.

XI Міжнародная навукова-практычная канферэнцыя завершыцца 21 лістапада падвядзеннем вынікаў і ўзнагароджаннем пераможцаў у Вялікай канферэнц-зале Прэзідыума Нацыянальнай акадэміі навук.

Яраслаў ЛЫСКАВЕЦ

■ На кантролі

Што з даўгабудамі?

У Віцебскай вобласці пад пагрозай здача «пад ключ» 12 шматкватэрных жылых дамоў. Палову з іх — у Віцебску і Полацку — так і не пачалі будаваць.

У цэлым за 9 месяцаў гэтага года не забяспечана выкананне задання ў 16 раёнах вобласці. Найменшыя тэмпы ўводу жылля ў Верхнядзвінскім раёне (34,4%), Лепельскім (36,0%), Дубровенскім (36,3%) і Шумілінскім (42,0%) раёнах, — паведаміў «Звяздзе» **Анатоль ЗВАНЦОЎ, начальнік аддзела кантролю за будаўнічым комплексам і ЖКГ Камітэта дзяржкантролю Віцебскай вобласці.**

Сёлета трэба было здаць «пад ключ» каля 410 тыс. кв. м жылля, а ўведзена толькі 251,7 тыс.

— Скончыліся нарматыўныя тэрміны будаўніцтва па 4 шматкватэрных жылых дамах, аднак работы не завершаны. І гэта, нягледзячы на высокую ступень гатоўнасці (дамы на 100 і 80 кватэр — у Полацку, на 40 і 35 кватэр — у Оршы), — дадалі ў КДК.

І нагадалі, што, згодна з адпаведным даручэннем Прэзідэнта, аблвыканкамам і Мінскаму гарвыканкаму прадпісана не дапускаць перавышэння нарматыўнага тэрміну будаўніцтва...

Аляксандр ПУКШАНСКІ

■ Грошы

МЕТАД БІЗУНА І ПЕРНІКА

Нацбанк прапануе ўвесці абавязковае SMS-інфармаванне ўладальнікаў пластыкавых картак і адмяніць абавязковую выдачу карт-чэкаў у крамах

Для паспяховага развіцця ў краіне сістэмы безнаяўных плацяжоў Нацбанк Беларусі будзе выкарыстоўваць як метады стымулявання, так і прымусу. Толькі адміністрацыйнымі метадамі з пазіцыі сілы банкаўскі рэгулятар станоўчага выніку дасягнуць не зможа, упэўнены намеснік старшыні праўлення Нацыянальнага банка Сяргей ДУБКОЎ.

Разам з тым, Нацбанк вырашыў звярнуць увагу на шэраг момантаў у сістэме безнаяўных разлікаў. Да часу пік — 1 студзеня 2016 года, калі нам неабходна атрымаць аб'ёмы безнаяўных плацяжоў у памеры 50%, — застаўся практычна год, а тэндэнцыі павелічэння існуючых аб'ёмаў такіх плацяжоў Нацбанк не радуюць. Менавіта таму рэгулятар сёння завяршыў распрацоўку нарматыўнага дакумента, які рэгламентуе змены ў інструкцыю аб парадку здзяйснення аперацый з банкаўскімі плацежнымі карткамі. Рэгулятар разлічвае, што да канца года ён будзе прыняты.

ПРЫНЦЫП НУЛЯВОЙ АДКАЗНАСЦІ

Адна з навацый дакумента складаецца ў тым, каб банкі абавязкова прапаноўвалі кліентам афармляць паслугу SMS-інфармавання аб руху грашовых сродкаў на іх уласным рахунку пры атрыманні карткі. Гэта паслуга платная. Калі кліент вырашыць, што такая паслуга яму не патрэбна, то для гэтага яму неабходна будзе напісаць адпаведную заяву, якая потым рэгіструецца банкам. Навошта рэгулятару трэба выдумляць падобныя складанасці?

Сяргей Дубкоў лічыць, што абавязковае інфармаванне людзей па картцы аўтаматычна павялічыць празрыстасць усіх аперацый з выкарыстаннем «пластыку». А гэта, у сваю чаргу, дазволіць банкам свабодна выкарыстоўваць прынцып нулявой адказнасці. Па сутнасці, цяпер для банкаў вышэй згаданы прынцып робіцца абавязковым. Паведамленні аб несанкцыянаванай аперацыі разглядаюцца і прымаецца рашэнне аб вяртанні грошай банкамі на працягу 45 дзён, калі аперацыя была здзейснена на тэрыторыі Беларусі, і 90 дзён — калі за межамі краіны.

Аляксандр Сотнікаў прэзентуе «Моцную картку».

Аднак, адмова кліента ад SMS-інфармавання можа тлумачыцца банкам, як нежаданне чалавека карыстацца прынцыпам нулявой адказнасці. «Прынцып нулявой адказнасці і яго якаснае выкананне — гэта інструмент канкурэнтнай барацьбы», — падкрэсліў Сяргей Дубкоў.

Намеснік старшыні праўлення Нацбанка паведаміў, што ў большасці выпадкаў банкі вяртаюць кліентам грошы, якія зніклі з іх рахункаў. З моманту рэкамендацыі Нацбанка аб прынцыпе нулявой адказнасці — з лютага гэтага года — колькасць зваротаў ад грамадзян на гэты конт не перавысіла трох дзясяткаў.

З ТЭРМІНАЛАМІ «ТАРМАЗІЦЬ» НЕ ТРЭБА

У бліжэйшы час гандлёвым кропкам рознага аб'ёму спатрэбіцца ўстанавіць вялікую колькасць плацежных тэрміналаў. Нацбанк ацэньвае такі аб'ём у памеры каля 150-160 тысяч штук. Намеснік старшыні праўлення Нацбанка нагадаў пра адпаведную пастанову Савета Міністраў і Нацыянальнага банка, згодна з якой аплатныя тэрміналы павінны быць абавязкова ўстаноўлены ва ўсіх павільёнах і кіёсках, санаторыях, дамах (базах) адпачынку, аздараўленчых цэнтрах (комплексах), на чыгуначных станцыях, калі яны абслугоўваюць больш за 250 пасажыраў у суткі і на іх ёсць ліній сувязі, у таксі і на дыягнастычных станцыях, дзе праводзяць тэхнічны агляд транспартных сродкаў. Гэтую аперацыю юрыдычныя асобы і ІП павінны правесці ў пералічаных аб'ектах: налета да 1 ліпеня — у гарадах абласнога падпарадкавання і Мінску, да 1 студзеня 2016 года — у гарадах раённага падпарадкавання, а да 1 ліпеня 2017 года — на ўсёй тэрыторыі краіны.

Сяргей Дубкоў паведаміў, што праверкі суб'ектаў гаспадарання паказваюць, што многія з іх адкладаюць установку тэрміналаў на потым, матывуючы гэта тым, што да крайняга тэрміну яшчэ шмат часу. «Нельга даводзіць сітуацыю да крытычнай, каб потым у маі-чэрвені наступнага года не назіраць істэрыку і вялікія чэргі», — папярэджвае намеснік старшыні праўлення Нацбанка. Ён падкрэсліў, што тэрміны пераносіцца не будуць, і заклікаў суб'екты гаспадарання не зацягваць з установкай неабходнага абсталявання.

«МОЦНАЯ КАРТКА» ПА ПРАГРАМЕ ЛАЯЛЬНАСЦІ

Цяпер у Нацбанку разумеюць, што аднымі адміністрацыйнымі мерамі развіццё безнаяўных плацяжоў у краіне не забяспечыш. Таму рэгулятар вітае любыя іншыя спосабы, у тым ліку праграмы лаяльнасці.

Рэспубліканскую кааліцыйную праграму лаяльнасці «Моцная картка» прэзентавалі Плацежная сістэма «БЕЛКАРТ» і Белінвестбанк. Трымальнікі гэтай карткі змогуць атрымліваць зніжкі ў прадпрыемствах — удзельніках праграмы. Пакуль іх 17. Гэта сеткі магазінаў абутку, адзення для дзяцей і дарослых, аўтазаправачныя станцыі і іншыя гандлёвыя аб'яднанні. **Дырэктар плацежнай сістэмы БЕЛКАРТ Аляксандр СОТНІКАЎ** паведаміў, што праект рэалізуецца як мультыбрэндавы і мультыбанкаўскі. Гэта значыць, што да яго могуць далучыцца новыя гандлёвыя сеткі і новыя банкі. Чакаецца, што ў хуткім часе да гэтай праграмы далучацца БПС-Ашчадбанк і Тэхнабанк. Цяпер БЕЛКАРТ вядзе перамовы яшчэ з двума банкамі.

Сяргей КУРКАЧ

НАВІНЫ ПАДЗЕІ ФАКТЫ

ІНВЕСТАРЫ І ПРАДПРЫМАЛЬНІКІ НА АДНОЙ ПЛЯЦОЎЦЫ

Сусветны тыдзень прадпрымальніцтва праходзіць у Беларусі з 17 па 23 лістапада. Гэта самая маштабная сустрэча ў свеце прадпрымальнікаў і стваральнікаў стартап-праектаў.

Кожны лістапад на працягу тыдня бізнесмены ўсяго свету аб'ядноўваюцца праз мерапрыемствы лакальнага, нацыянальнага і сусветнага ўзроўню, якія накіраваны на развіццё наватарскага патэнцыялу. Мерапрыемствы вар'іруюцца ад шырокамаштабных конкурсаў да невялікіх сходаў з мэтай нетворкінгу (наладжвання сувязяў). Асноўнай задачай усіх мерапрыемстваў з'яўляецца злучыць удзельнікаў з патэнцыяльнымі партнёрамі і інвестарамі і раскрыць новыя бізнес-перспектывы. Прадпрымальніцкі тыдзень праходзіць больш чым у 140 краінах і прыцягвае да сябе каля 20 мільёнаў удзельнікаў праз 95 000 мерапрыемстваў ва ўсім свеце.

Беларусь афіцыйна далучылася да Сусветнага тыдня прадпрымальніцтва ў 2011 годзе і ўжо ў 2012-м была адзначана сярод пяці лепшых арганізатараў ва ўсім свеце. Мерапрыемствы тыдня прадпрымальніцтва праходзяць ва ўсіх рэгіёнах Беларусі і ўключаюць у сябе міжнародны форум, майстар-класы і дыскусіі.

Ілья КРЫЖЭВІЧ.

КОНКУРС НА ЗВАННЕ АКАДЭМІКА — 4 КАНДЫДАТЫ НА МЕСЦА

16 дзеючых членаў (акадэмікаў) і 28 членаў-карэспандэнтаў абраны ў Нацыянальнай акадэміі навук. Выбары акадэмікаў і членаў-карэспандэнтаў Нацыянальнай акадэміі навук праводзяцца раз у 2,5—3 гады ў межах вакансій па спецыяльнасцях, якія зацвярджаюцца Прэзідыумам акадэміі.

На 24 вакансіі акадэмікаў і 39 вакансій членаў-карэспандэнтаў прэтэндавалі 40 і 118 кандыдатаў адпаведна. Самы вялікі конкурс быў адзначаны сярод кандыдатаў на званне акадэміка па спецыяльнасці «Біятэхналогія раслін» (чатыры чалавекі на месца). Сярод кандыдатаў на званне члена-карэспандэнта больш за ўсё прэтэндэнтаў было па спецыяльнасці «Тэхналогія машынабудавання» (сем чалавек на месца).

Сярод новых акадэмікаў — 3 члены Бюро Прэзідыума акадэміі навук: першы намеснік Старшыні Прэзідыума НАН Беларусі Сяргей Чыжык і намеснікі старшыні Прэзідыума Сяргей Кілін і Аляксандр Сукала, 2 акадэмікі-сакратары аддзялення навук НАН Беларусі, 5 дырэктараў інстытутаў Акадэміі навук. Акадэмікам па спецыяльнасці «Кардыёхірургія» стаў вядомы кардыёхірург, загадчык лабараторыі хірургіі сэрца РНПЦ «Кардыялогія» Юрый Астроўскі. Сярэдні ўзрост наноў выбраных акадэмікаў складае 61 год, а членаў-карэспандэнтаў — 60 гадоў.

Надзея НІКАЛАЕВА.

СВЯТЫНЮ ПРЫВЕЗЛІ НА МАГІЛЁЎШЧЫНУ

У жыхароў вобласці з'явілася магчымасць дакрануцца да самага старажытнага помніка кніжнай культуры, створанага на тэрыторыі Беларусі, — Тураўскага Евангелля.

Падчас прэзентацыі факсімільнага выдання ў абласной бібліятэцы імя Леніна 10 яго асобнікаў перадалі ўстановам культуры і адукацыі Магілёва, Бабруйска і Мсціслава. Копіі помніка славянскага пісьменства былі надрукаваны па ініцыятыве Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі накладам 500 асобнікаў. Магілёў стаў другім горадам пасля Гомеля, які атрымаў такі каштоўны падарунак.

— Для нас вялікі гонар — валодаць гэтым выданнем, — адзначыла намеснік дырэктара абласной бібліятэкі Вольга Чумакова. — Раней мы мелі магчымасць дэманстраваць яго нашым чытачам толькі ў электронным выглядзе. Прыемна, што падзея адбываецца напярэдадні года, які прысвячаецца моладзі. Такія выданні дапамагаюць выхоўваць у падрастаючага пакалення духоўна-маральныя якасці.

Дарэчы, гэта ўжо другі такі падарунак, які робіць Нацыянальная бібліятэка разам з прадстаўніцтвам кампаніі Xerox у Беларусі. Летась «Ленінка» атрымала факсімільнае выданне віленскага «Буквара» 1767 года, якое ўбачыла свет у рамках гэтага праекта.

Нэлі ЗІГУЛЯ.

■ Меркаванне

Бліжэй, чым падаецца

Што ўплывае на скарачэнне адлегласці паміж Мінскам і Парыжам

Беларусь і Францыя не маюць агульнай мяжы і з'яўляюцца краінамі з вельмі рознай палітычнай, эканамічнай і геакультурнай вагой, але нашы інтарэсы шчыльна пераплятаюцца. Для Францыі, як для гульца сусветнага ўзроўню, усходнееўрапейскі рэгіён заўжды быў адным з прыярытэтаў усходняй палітыкі. З іншага боку, Беларусь шмат чаго пераняла ў Францыі як у палітычнай, так і ў культурнай сферы. За 23 гады незалежнасці Беларусі ўзаемадзеянне між нашымі краінамі паступова нарастае, прычым адразу па трох складніках: культурным, эканамічным і палітычным.

Найлепш ідуць справы ў сферы культуры. Трэба адзначыць эфектыўную працу пасольстваў абедзвюх краін, якія арганізуюць рэгулярныя форумы, гастролі, сустрэчы гарадоў-пабрацімаў, выставы нацыянальнага мастацтва, літаратуры, кіно і г.д. Зберагаецца і даследуецца агульная гістарычная спадчына, звязаная як з напалеонаўскімі часамі, так і з падзеямі Другой сусветнай вайны: у Барысаве рэгулярна праходзяць мемарыяльныя мерапрыемствы «Бярэзіна», ушаноўваецца памяць эскадрыллі «Нармандыя-Нёман». Беларусь паспяхова супрацоўнічае з Францыяй і ў галіне асветы: у Гомелі дваццаты год дзейнічае Франка-Беларускі інстытут кіравання, а беларуская моладзь мае магчымасць атрымліваць адукацыю ў Францыі. Падобны культурны і адукацыйны абмен трэба вітаць і пашыраць, бо гэта доўгатэрміновыя інвестыцыі ў дружбу нашых народаў.

Галоўнай праблемай пашырэння франка-беларускага эканамічнага ўзамадзеяння з'яўляецца інфармацыйны вакуум.

Але ва ўмовах сусветнага крызісу на першае месца выходзяць эканамічныя адносіны. Беларусь вызначаецца сярод постсавецкіх краін сваёй гаспадарчай прагматычнасцю. У Францыі эканамічныя кантакты таксама заўжды ідуць папарадзе палітычных, бо ствараюць неабходную атмасферу даверу і фарміруюць рэальны парадак дня для афіцыйнай дыпламатыі.

Таму абсалютна прадказальным з'яўляецца той прагрэс у бізнес-сферы, які назіраецца ў апошнія 5 гадоў: у 2013 годзе ў Парыжы адбыўся эканамічны форум «Ад Брэста да Брэста», зімой 2014 года пачаў працаваць Франка-беларускі дзелавы клуб, а нядаўна, у кастрычніку, гандлёва-прамысловую палату Парыжа наведала прадстаўнічая беларуская дэлегацыя, якая прэзентавала эканамічныя і інвестыйныя магчымасці нашай краіны.

Францыя з'яўляецца 12-м партнёрам Беларусі па знешнегандлёвым таваразвароце, які чатыры гады запар стабільна ўзрастае, дасягнуўшы амаль 600 млн долараў у 2013 годзе. Беларускі экспарт складае каля 100 млн долараў. Попытам карыстаюцца нашы мінеральныя ўгнаенні, мэбля, прамысловыя вырабы. Францыя пастаўляе ў Беларусь хімічную прадукцыю, лекі, разнастайную тэхніку. Аднак патэнцыял эканамічнага супрацоўніцтва яшчэ далёка не скарыстаны: можна нагадаць, што франка-беларускі таваразварот у чатыры разы ўступае па велічыні беларуска-італьянскаму.

Тым не менш, на тэрыторыі Беларусі паспяхова дзейнічае больш за 40 французскіх і франка-беларускіх прадпрыемстваў, у тым ліку «Данон», «Санафі», «Пежо». Адна з апошніх навін — пад Мінскам у пасёлку Абчак неўзабаве пачнуць вырабляць аўтамабілі «Сітраен» і «Пежо» шасці мадэляў. Беларусь зацікаўлена ў пашырэнні дзейнасці французскіх інвестараў. Мы маем прывабныя свабодныя эканамічныя зоны, Парк высокіх тэхналогій, паляпшаем інвестыцыйны клімат, але яшчэ не рэалізавалі ўсе перавагі свайго геаграфічнага становішча і статусу заходняй «брамы» Еўразійскага эканамічнага саюза.

Францыя з'яўляецца 12-м партнёрам Беларусі па знешнегандлёвым таваразвароце, які чатыры гады запар стабільна ўзрастае, дасягнуўшы амаль 600 млн долараў у 2013 годзе.

Галоўнай праблемай пашырэння франка-беларускага эканамічнага ўзамадзеяння з'яўляецца інфармацыйны вакуум. Таму неабходна паглыбляць інфармацыйны абмен агульнымі намаганнямі журналістаў, чыноўнікаў, прадпрымальнікаў. Веды, валоданне апошнімі тэхналогіямі кіравання з'яўляюцца адным з самых каштоўных рэсурсаў сучаснасці. Перш за ўсё беларускім уладам і бізнесу варта вывучыць вопыт Францыі ў развіцці рэгіянальнай эканомікі на аснове высокатэхналагічных кластараў, якія там называюцца полюсамі канкурэнтаздольнасці.

Культурнае і эканамічнае ўзамадзеянне стварае спрыяльную глебу для паляпшэння палітычных адносін. Беларусь заўжды праяўляла цікаваць да вопыту Францыі — перадавой краіны ў галіне палітычнага кіравання і грамадскага прагрэсу. Варта нагадаць, што Асноўны закон Беларусі мае шмат агульных месцаў з Канстытуцыяй V Рэспублікі генерала дэ Голя. Моцная прэзідэнцкая мадэль дазволіла Францыі пераадолець пасляваенны хаос, арганізаваць незалежную палітыку, увайсці ў клуб ядзерных дзяржаў, гарантаваць энергетычную бяспеку за кошт уласных АЭС. У беларускіх умовах падобная мадэль дапамагла захаваць эканамічную моц і сацыяльна-палітычную стабільнасць, нарасціць чалавечы і тэхналагічны патэнцыял, у тым ліку пачаць будаўніцтва сваёй атамнай станцыі.

З часоў першага візіту Прэзідэнта Беларусі ў Францыю, які адбыўся ў 1996 годзе, дынаміка палітычных адносін нашых краін мянялася, але стратэгічная зацікаўленасць у добрых адносінах ніколі не знікала. Зараз назіраецца чарговы этап актывізацыі палітычнага супрацоўніцтва, кантакты на ўзроўні міністэрстваў і парламентаў сталі рэгулярнымі. У Беларусі і Францыі багата тэм, над якімі нашы краіны даўно і паспяхова працуюць, у тым ліку забеспячэнне належнай аховы мяжы Еўрапейскага і Еўразійскага саюзаў, ліквідацыя гандлю людзьмі, барацьба з транснацыянальнай злачыннасцю і нелегальнай міграцыяй.

Трагічныя падзеі ва Украіне, якія адбываюцца ў гэтым годзе, выводзяць на першы план пытанні захавання міру і стабільнасці ва Усходняй Еўропе і на ўсім кантыненце. Францыі і Беларусі непазбежна давядзецца супрацоўнічаць па пытаннях прадухілення тэхнагенных і гуманітарных катастроф, забеспячэння надзейнага транзіту энерганосьбітаў і наземных грузаперавозак, стварэння аўтарытэтных перамоўных пляцовак. Па гэтых пытаннях інтарэсы Мінска і Парыжа супадаюць натуральным чынам, што вельмі важна ва ўмовах нарастаючай канфрантацыі між Захадам і Расіяй. Беларусь і Францыя заўжды вызначаліся ўзважаным і цвярозым поглядам на пытанні кантынентальнай бяспекі, і зараз гэтым рэсурсам варта скарыстацца дзеля агульнага спакою і карысці.

Аляксандр СІНКЕВІЧ, эканамічны аглядальнік

■ Ціха каб было!

Петардам і шуціхам загадана чакаць свайго часу

У сувязі з набліжэннем навагодніх свят у сталіцы чакаецца рост абароту піратэхнічных вырабаў, таму ў Мінску стартавала так званая «антыпетардная» аперацыя, якая будзе доўжыцца па 15 студзеня.

Супрацоўнікі міліцыі разам з падатковымі інспектарамі, работнікамі органаў па надзвычайных сітуацыях і членамі грамадскіх арганізацый правядуць шэраг прафілактычных мерапрыемстваў па выяўленні фактаў незаконнай рэалізацыі піратэхнікі.

Асаблівая ўвага будзе нададзена аб'ектам гандлю, пляцоўкам каля супермаркетаў і рынкаў, паведамілі ў прэс-службе Мінгарвыканкама. Мабільныя групы з ліку супрацоўнікаў раённых УУС Мінска будуць працаваць штодня па выяўленні падпольных гандляроў. Запланаваны таксама выступленні праваахоўнікаў у працоўных калектывах, навучальных установах. У аперацыі задзейнічаюць і сілы мінскай Дзяржаўтаінспекцыі, якія будуць правяраць транспартныя сродкі на прадмет нелегальнай транспарціроўкі без адпаведных дакументаў.

Сяргей РАСОЛЬКА

ИЗВЕЩЕНИЕ ОБ ОТКРЫТОМ АУКЦИОНЕ

по продаже в частную собственность гражданам Республики Беларусь земельных участков для строительства и обслуживания одноквартирных жилых домов

Организатор аукциона — Валевачский сельский исполнительный комитет

Местоположение объекта аукциона, кадастровый номер	Площадь земельного участка (га)	Наименование инженерных сетей	Начальная цена объекта (руб.)	Сумма задатка (руб.)	Также подлежат возмещению
Участок № 1 РБ, Минская обл., Червенский р-н, Валевачский с/с, аг. Черноградь, ул. Центральная, 9, кадастровый номер 625880811101000252	0,1490	Электроснабжение, газоснабжение, водоснабжение	31 600 000	3 100 000	Затраты на оформление и регистрацию участка, расходы по размещению извещения в СМИ
Участок № 2 РБ, Минская обл., Червенский р-н, Валевачский с/с, аг. Черноградь, ул. Центральная, 9А, кадастровый номер 625880811101000263	0,1474	Электроснабжение, газоснабжение, водоснабжение	32 901 000	3 290 000	Затраты на оформление и регистрацию участка, расходы по размещению извещения в СМИ

1. **Аукцион состоится 24 декабря 2014 года в здании сельского исполнительного комитета по адресу: Минская область, Червенский район, аг. Валевачи, ул. Минская, 15. Начало аукциона в 10.00.**

2. Шаг аукциона к начальной цене земельного участка составляет 5%.

3. Для участия в аукционе граждане предоставляют в комиссию по проведению аукционов заявление; копию заверенного банком платежного документа о внесении задатка; документ, удостоверяющий личность (паспорт) покупателя или его доверенного лица; доверенность, удостоверенную нотариально (в случае, если на аукционе интересы покупателя представляет это лицо).

4. Сумма задатка перечисляется в срок до 22 декабря 2014 года на счет 3600632022731 Валевачского сельского исполнительного комитета в ЦБУ № 627 филиала № 500 — МУ ОАО «АСБ Беларусбанк» г. Червень, МФО 153001601, УНП 600537220, назначение платежа 04901.

5. Победитель аукциона обязан:

Оплатить в течение 10 рабочих дней со дня принятия решения о предоставлении земельного участка стоимость объекта продажи и затраты, связанные с подготовкой и проведением аукциона по оформлению и государственной регистрации создания земельного участка, а также затраты, связанные с размещением извещения о проведении аукциона в средствах массовой информации.

6. Участники аукциона предварительно могут ознакомиться с объектом аукциона путем выезда к месту нахождения этого объекта.

Заявления на участие в аукционе принимаются с момента размещения извещения о проведении аукциона в средствах массовой информации. Время работы в будние дни 08.00–13.00 и 14.00–17.00, в субботу 08.00–13.00 по адресу: Минская область, Червенский район, аг. Валевачи, ул. Минская, 15, сельсовет.

Прием заявлений заканчивается 22 декабря 2014 года в 17.00.

Контактные телефоны: (8 01714) 47 352, 47 319, 58 115, (МТС) 8 029 863 44 09.

Жыццё — адно, радзімы — дзве

Жывапісец Барыс Аракчэеў, які не так даўно пакінуў гэты свет, нагадаў пра сябе добрай і прыгожай падзеяй. У Мінску па вуліцы Леніна, 2 усталявана мемарыяльная дошка ў гонар праслаўленага мастака.

Падзея, якую ініцыіравалі Мінскі гарвыканкам і Беларускі саюз мастакоў, з'яўляецца своеасаблівым працягам той рознабаковай працы, якую па ўшанаванні памяці бацькі праводзіць мастак, кніжны графік Аксана Аракчэева *(на фота)*. Нельга не ўспомніць, што якраз у гэтым доме на вуліцы Леніна, 2 на працягу некалькіх дзесяцігоддзяў знаходзілася майстэрня Барыса Уладзіміравіча. З вокнаў яе відаць плошча Свабоды, Свята-Духаў кафедральны сабор, гарадская ратуша.

— Цяпер я працую ў колішняй майстэрні бацькі і ўсім сэрцам, усёй душой адчуваю яго творчае гарэнне, — дзеліцца сваімі думкамі мастачка Аксана Аракчэева. — Я вельмі рада, што на адкрыццё дошкі, аўтарам якой з'яўляецца скульптар Яўген Колчаў, прыйшло шмат людзей. Мне здаецца, што прыйшлі якраз людзі, якія, калі і не бачылі ніколі бацьку, то ўсё адно адчуваюць яго энергетыку. Праз пейзажы яго, праз карціны, якімі ён перадаваў захапленне ўсёй Беларусью, захапленне родным яраслаўскім краем, дзе нарадзіўся, небабыякавыя да прыгажосці людзі зазіраюць у глыбіні бацькавага натхнення, насычаюцца крынічнай сілай яго колераў і фарбаў.

Фота Наталлі АСМОЛы.

На ўрачыстым адкрыцці мемарыяльнай дошкі выступіў і старшыня Беларускага саюза мастакоў Рыгор Сітніца, які быў добра знаёмы з Барысам Аракчэевым. «Невыпадкова, што Барыса Уладзіміравіча, заслужанага дзеяча мастацтваў Рэспублікі Беларусь, адзначылі ордэнам Францыска Скарыны. Уклад гэтага чалавека, нараджэннем рускага, у беларускую нацыянальную культуру надзвычай вялікі. І ў плане адлюстравання прыгажосці нашай зямлі, і ў сувязі з тым, што ён выхаваў плеяду таленавітых творцаў. А найперш свае мастацкія запаветы перадаў дачцэ — Аксане Барысаўне Аракчэевай. Веру, што і да арыгіналаў, і да рэпрадукцый работ таленавітага, яркага мастака неаднойчы будуць прыкаваны позіркі многіх і многіх нашых суайчыннікаў. Ведаю, што пашанотна ставяцца да здзейсненага Барысам Аракчэевым і ў Расіі, на радзіме творцы...» Пацвярджэннем апошніх слоў стала і вітанне сям'і мастака, арганізатараў праекта па ўсталяванні мемарыяльнай дошкі ад пасольства Расійскай Федэрацыі ў Рэспубліцы Беларусь.

Мікола БЕРЛЕЖ.

■ Анатомія жыцця

СХАВАЦЦА АД ДАЎГОЎ

Ці лёгка прымусіць неплацельшчыкаў разлічвацца?

Амаль кожны дзясяты беларус — даўжнік. На адных вісяць штрафы ДАІ і банкаўскія крэдыты, іншыя ўжо не першы месяц вінаватыя за камуналку, а хтосьці проста шкадуе грошай на сваіх дзяцей. Прымусіць іх плаціць — праца судовага выканаўцы. Увечары, замест таго, каб адпачываць дома за кубкам гарбаты, прыставы ходзяць па кватэрах і наведваюць даўжнікоў. Наш карэспандэнт разам з супрацоўнікамі аддзела прымусовага выканання Партызанскага раёна сталіцы выправілася ў адзін з такіх рэйдаў.

Кацярына Васільеўна апісвае маёмасць. Калі праз 10 дзён неплацельшчык не разлічыцца з даўгамі, яго рэчы распрададуць.

ПАДМАНУТАЯ СЯМ'Я

На ўчастак мы выязджаем каля шасці вечара. Раней няма сэнсу — дома нікога не заспеем. Сёння наведваем тых, хто, як той казаў, «заляцеў на грошы». За кожным — доўг у некалькі тысяч долараў.

— Вы ўпэўнены, што хочаце паехаць? — пытае мяне намеснік начальніка аддзела Кацярына Губарэвіч-Чалядзінская. — Розныя выпадкі бываюць.

Па першым адрасе — банкаўскі даўжнік. Мужчына набраў каля дзясятка крэдытаў: на дзесяць, на дваццаць мільёнаў рублёў. Агульная сума, якую трэба вярнуць, складае аж дваццаць тысяч долараў. Дзверы кватэры нам адчыніла маладая бландзінка ў блакітным халаце — сястра нашага даўжніка

— Юрыя дома няма, — паведаміла жанчына.

— А яго жонка?

— Вунь у тым пакоі сядзіць.

Праходзім да жонкі. Аблезлы дыван на падлозе, сцены без шпалераў. Разам са сваім маленькім сынам жанчына сядзіць на ложку і глядзіць тэлевізар.

— Вы ведаеце, што ў вашага мужа даўгоў на дзвесце мільёнаў? — пытае Кацярына Васільеўна. — Вярнуць не можаце? Тады будзем апісваць маёмасць.

Каштоўных рэчаў у пакоі мала. Забіраем толькі тэхніку: радыётэлефон, калонкі, ноўтбук.

— Я не магу вам аддаць камп'ютар, мне трэба да сесіі рыхтавацца!— абураецца жанчына.

Калі яе муж не верне пазыку, гэтую тэхніку распрададуць праз дзесяць дзён, і гаспадары яе больш не ўбачаць. Хлопчык, што пакуль увесь час ціха глядзеў мультфільмы, падбег да мамы.

— Давай скажам, што гэта мае рэчы і іх нельга забіраць... — шэпча малы.

Жанчына гладзіць сына па галаве, супакойвае, а сама тэлефануе мужу, які і не думае спяшацца дадому.

— Юра, у цябе сумленне ёсць? — у жонкі ад шоку амаль прападае голас. — Ты што робіш са мной? Яны зараз усё вынесуць, разумееш?

— На што ён хоць грошы патраціў? — цікавіцца прадстаўнік банка Гардзей Стацэнка, які сёння таксама далучыўся да рэйда.

— Ды на палюбоўніцу сваю рудую спусціў усё! — упэўнена сястра Юрыя. — Мы ні капейкі не бачылі.

Пасля візіту на першую кватэру мяне не пакідаюць думкі пра падманутую сям'ю і… жудасны пах, што застаўся на вопратцы. Шкада хлопчыка, які вымушаны расці ў брудным пакоі і з ненадзейным бацькам.

КАНФІСКАВАЦЬ ТЭЛЕВІЗАР І... САБАКУ

Яшчэ аднаго банкаўскага даўжніка, што напазычаў на дзесяць тысяч долараў, мы дома таксама не заспелі. Цешча сказала, што ён разам з жонкай і трыма дзецьмі паехаў у Гомель — на заробкі. Жанчына паказала нам некалькі квіткоў: дачка заплаціла мільён рублёў, каб хоць неяк разлічыцца з даўгамі мужа. Але гэтага, зразумела, недастаткова.

— Аб'явім у крымінальны вышук, — вырашае Кацярына Васільеўна.

Судовыя выканаўцы маюць права апісаць амаль усю маёмасць у памяшканні, дзе прапісаны даўжнік. Дакументы на мэблю і тэхніку дзесяцігадовай даўнасці рэдка захоўваюцца, таму, каму якія рэчы сапраўды належаць, будзе вырашаць ужо суд. Так і атрымліваецца: грошы не вяртае адзін чалавек, а пакутуюць праз гэта яго родныя.

Людзей, якія не могуць заплаціць па сваіх крэдытах, хапае. Не ўсе ўважліва чытаюць дагавор, а потым не разумеюць, адкуль набегла столькі працэнтаў і як з гэтым разлічыцца. Вінаватыя і самі банкі. Толькі адзінкі тэлефануюць прыставам, каб спытаць, ці варта пазычаць грошы пэўнаму чалавеку.

ДАВЕДКА

Згодна з інфармацыяй Міністэрства юстыцыі, за шэсць месяцаў гэтага года судовыя выканаўцы спаганялі каля 600 мільярдаў рублёў. 86% гэтай сумы — выдаткі на ўтрыманне дзяцей, што знаходзяцца на дзяржаўным забеспячэнні.

Спачатку даўжнікоў шукаюць па адрасах, дзе яны прапісаны. Не заўсёды паспяхова: некаторым неплацельшчыкам лягчэй збегчы на іншую кватэру, чым вярнуць грошы.

Дарэчы, пра апісанне маёмасці. Судовыя выканаўцы могуць забраць нават свойскіх жывёл. Тым больш што некаторыя пароды каштуюць больш за тысячу долараў. Мера крыху экзатычная, але эфектыўная. Прадстаўнік банка ўспамінае, як аднойчы за даўгі канфіскаваў у жанчыны сабаку. На наступны дзень прыбег яе муж і вярнуў усе грошы, каб забраць дадому любімага гадаванца.

Пакуль едзем у машыне, супрацоўнікі аддзела перабіраюць свае паперы. Сярод даўжнікоў ёсць і такія, хто павінен толькі некалькі тысяч рублёў. Увогуле на аднаго прыстава ў месяц прыпадае ў сярэднім 139 выканаўчых дакументаў. Апошнім часам павялічылася колькасць даўжнікоў са штрафамі фота- і відэафіксацыі. Ёсць і тыя, хто ўхіляецца ад выплаты аліментаў. Кацярына Васільеўна з усмешкай згадвае, як адзін з такіх кліентаў хаваўся ад іх за халадзільнікам. З несумленнымі аліментнікамі і іншымі неплацельшчыкамі, дарэчы, цяпер лягчэй працаваць. Той факт, што іх могуць пазбавіць права кіраваць аўтамабілем і не выпусціць за мяжу, прымушае людзей плаціць.

КРЭДЫТ НА ГАРЭЛКУ

У наступнай кватэры нас чакала гісторыя, якой пазайздросцілі б сцэнарысты любога серыяла. Багаты мужчына ажаніўся з правінцыйнай дзяўчынай, гадоў на 15 маладзейшай за яго, і праз пэўны час развёўся. Маёмасць вырашылі не дзяліць, але жанчына пажадала забраць аўтамабіль. Тады былы муж запатрабаваў вярнуць палову кошту машыны — 24 тысячы долараў. Свае грошы ён пакуль так і не атрымаў. Жонка па-ранейшаму прапісана ў кватэры мужа. Спагнальнік патлумачыў, што яна рэдка з'яўляецца дома: забрала ўсе свае футры і з'ехала некуды. Дачку нават пакінула. Нядаўна, праўда, зноў аб'явілася: разам з адвакатам наставіла ў пакоях «жучкоў».

— Чаму ж вы шлюбны дагавор не склалі?

— Калі жэняцца, ніхто не думае пра развод, — паціскае плячыма багацей. — Хіба я адзін такі? У суседа на ніжнім паверсе — там кватэра больш за маю ў два разы — падобная сітуацыя.

Адзін з даўжнікоў нам проста не адчыніў дзверы, хоць дакладна знаходзіўся дома. Намеснік начальніка аддзела прызнаецца, што часцей так і бывае:

— Яны ж ведаюць, што іх шукаюць. Гэта нам з журналістамі шанцуе — амаль ва ўсе кватэры трапляем.

Часам прыставы сутыкаюцца з неадэкватнымі паводзінамі. Агрэсіўныя неплацельшчыкі могуць і пабіць, і кіпенем абліць, і спусціць сабак.

Апошні на сёння адрас — непрыкметная старая хата. Тут жыве мужчына, які павінен банку 35 мільёнаў рублёў. У парозе нас сустрэла яго былая жонка:

— Праходзьце, ён там ляжыць, не ўстае.

«Зразумела, — падумалі мы, — ужо паспеў напіцца і не трымаецца на нагах». Калі ўбачылі мужчыну, былі ў шоку. На фота ў пашпарце ў яго круглы, укормлены твар. З ложка на нас глядзеў схуднелы і нямоглы чалавек. Высветлілася, што ў мужчыны цыроз печані. Даўжнік некалькі разоў кадзіраваўся, але беспаспяхова. Апошні раз пратрымаўся без гарэлкі амаль год. Тады і крэдыт узяў — на машыну. І зноў сарваўся. Аўтамабіль прапіў, а зарабляць не было калі.

— Доўга, напэўна, не пражыве, — кажа жанчына. — Мы развяліся пяць гадоў таму, але не магу ж яго кінуць. Купляю лекі за свой кошт.

Дадому збіраемся ўжо позна ўвечары.

— І так амаль кожны дзень, — уздыхае Кацярына Васільеўна. — Па пятніцах толькі на ўчастак не выходзім: няхай людзі адпачываюць. Ды і самім хочацца дадому раней прыехаць, правесці вечар з сям'ёй.

Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ. Фота аўтара



У некаторых памяшканнях нават канфіскаваць не было чаго.

НЕ ПАЙСЦІ НА ДНО

ПЕРАХОДЗІМ ПА ЛЁДЗЕ ПРАВІЛЬНА

— Трываласць лёду правяраецца вельмі проста, — працягвае Сяргей Патрыкееў. Трэба ўдарыць па ім пешнямі, шостам або колам. Калі пасля першага ж удару лёд прабіўся і паказалася вада — далей ісці ўжо нельга. Але і адступаць таксама трэба хітра: першыя крокі рабіце, не адрываючы падэшвы ад паверхні. Калі ж падручных сродкаў у вас няма, то сігналам аб небяспецы стане патрэскванне пад нагой. Трываласць лёду можна вызначыць і візуальна. Пры разбурэнні лёд мае рыхлаватую кансістэнцыю і цемнаватае адценне. Асцерагайцеся і прамывін — асабліва гэта датычыцца буйных рэк і месцаў, дзе скідваецца нагрэтая вада. Да таго ж прамывіну можна не заўжды заўважыць пад свежым снегам...

Крытычнае пераахаладжэнне і заняменне канечнасцяў наступаюць праз 10-15 хвілін знаходжання ў ледзяной вадзе.

Яшчэ больш асцярожна трэба ісці па лёдзе групай. Лепш перасоўвацца, вытрымліваючы дыстанцыю прыкладна ў 5-6 метраў. Таўшчыня лёду мусіць складаць ужо 10-12 сантыметраў.

Фарміраванне лёду ў халады і яго адтаванне ў адлігу пачынаецца ад берага ў напрамку цэнтра вадаёма. У гэтым няма нічога дзіўнага, калі мы са школьнага курса фізікі ўспомнім, што цеплаправоднасць вады значна ніжэйшая за цеплаправоднасць паветра. Даўжэй усталёўваецца лёд і на рацэ з інтэнсіўным цячэннем.

НА РЫБАЛКУ — З ВЯРОЎКАЙ

— Наш галаўны боль — гэта рыбакі, якія выходзяць на лёд падчас яго фарміравання або разбурэння, — сцвярджае **вядучы спецыяліст Таварыства ратавання на водах Алег БАРАЗНА.** — Як правіла, у гэты перыяд рыба ловіцца лепш. Але пагоня за ўловам у такі час можа вельмі лёгка скончыцца ў лепшым выпадку купаннем у ледзяной вадзе.

Фізіялагічна ж чалавек устроены так, што арганізм пры пераахаладжанні аўтаматычна пераключаецца на малы круг кровазвароту, у якім канечнасці ўжо не ўдзельнічаюць. І праз вельмі кароткі час, калі небараку не выцягнулі з вады, ні рукамі, ні нагамі рухаць ён ужо не можа.

Як жа правільна выцягнуць чалавека з халоднай вады? Тут на дапамогу зноў жа прыходзіць школьны курс фізікі. Чым большая плошча паверхні цела пры адной і той жа масе, тым яго ціск на лёд будзе меншы. І таму да палонкі трэба не падыходзіць, а падпаўзаць. Але не з пустымі рукамі. Бо падаваць руку чалавеку ў вадзе вельмі рызыкоўна для неспрактыкаванага ратаўніка: той, хто тоне, можа пацягнуць яго за сабой. Таму трэба мець нейкі прамежкавы элемент. Ім можа паслужыць галіна, кій, шалік, куртка... А ў ідэале, адпраўляючыся на лёд, трэба мець з сабой трывалую вяроўку даўжынёй 15-20 метраў.

Можа ўскладніць сітуацыю і цёплая вопратка таго, хто праваліўся. Тое ж футра ці вацін выдатна паглынаюць ваду, становяцца цяжкімі і пачынаюць цягнуць чалавека на дно. Нейкі час трымаць чалавека на паверхні будзе балоневая куртка, калі яна надзьмуецца пухіром.

А калі паблізу нікога няма і даводзіцца спадзявацца толькі на свае сілы, застаецца адно — як мага хутчэй знайсці больш трывалую паверхню лёду, налягаючы на яе. І калі выбрацца ўдалося, не спяшайцеся станавіцца на ногі: трэба аддаляцца ад палонкі, перакочваючыся па лёдзе. Але памятайце — часу ў вас вельмі мала. Крытычнае пераахаладжэнне і заняменне канечнасцяў наступаюць праз 10-15 хвілін знаходжання ў ледзяной вадзе.

А пасля небараку трэба вельмі хутка даставіць па магчымасці ў бліжэйшае цёплае памяшканне, распрануць і разагрэць. Ні ў якім разе не саджайце яго ў гарачую ванну — сэрца можа і не вытрымаць. І неадкладна выклікайце «хуткую дапамогу».

Суразмоўцы прыгадваюць адну трагікамічную гісторыю, якая здарылася з аматарамі падлёднай рыбалкі. На вадаём яны вырашылі дабрацца на аўтамабілі. Паколькі на дварэ доўгі час стаялі моцныя маразы, лёд быў таўшчынёй больш за 25 сантыметраў, ён выдатна вытрымліваў цяжар легкавіка. Ды вось толькі заглушыць рухавік аўтамабіля рыбакі чамусьці забыліся. Лёд пад машынай пачаў пакрысе награвацца, і... у нейкі момант яна булькнула і пайшла на дно. На шчасце, у салоне тады нікога не было.

Па стане на 6 лістапада вада забрала жыцці 558 чалавек. Абарваліся 33 дзіцячыя лёсы.

А вось пазамінулай зімой спроба перасячы раку Чаква ў Столінскім раёне на грузавіку скончылася драматычна. Ратаўнікі, якія за лічаныя хвіліны прыбылі на месца здарэння, убачылі страшную карціну — аўтамабіль, які ехаў за метраў 30 ад берага, цалкам знаходзіўся пад вадой. Глыбіня ў тым месцы дасягала прыкладна чатырох метраў. Ратавальнікі дасталі з кабіны двух загінулых...

ВЫЙШАЎ НА НЕАКРЭПЛЫ ЛЁД — ЗАПЛАЦІ ШТРАФ?

Па стане на 6 лістапада сёлета вада забрала жыцці 558 чалавек. Абарваліся 33 дзіцячыя лёсы. Лічбы шакіруюць. І таму Таварыства ратавання на водах разам з Міністэрствам па надзвычайных сітуацыях ужо распрацавала праект закону аб бяспечных паводзінах на вадзе. Ён ужо пастаўлены ў план разгляду на 2015 год.

— Успомнім анамальную спёку, якая накрыла Беларусь мінулым летам. Тады па ўсёй краіне дзейнічала забарона на наведванне лясоў. Людзей, якіх там знаходзілі, аўтаматычна штрафавалі. Але чаму ж тады нельга забараніць выхад на тонкі лёд, які звязаны перш за ўсё з верагоднасцю гібелі чалавека? — задаецца пытаннем Алег Баразна.

Сярод іншага, у новым законапраекце закладзена норма, якая забараняе дзецям да 14 гадоў выходзіць на лёд без кантролю бацькоў, якія будуць несці за гэта адказнасць. Давядзецца больш пільна клапаціцца аб сваёй бяспецы і рыбакам.

— Падчас падрыхтоўкі мы вывучалі аналагічныя распрацоўкі розных краін — Расіі, Латвіі, Літвы і нават Кыргызстана, — з гэтымі словамі Сяргей Патрыкееў гартае атрыманыя з гэтых краін лісты. — Аднак хачу асобна спыніцца на прыбалтыйскім вопыце. Напрыклад, у Літве рыбакі пры выхадзе на лёд мусяць мець выратавальныя камізэлькі і спецыяльныя шыпы. Па функцыянале яны вельмі нагадваюць звычайныя электраманцёрскія «кіпцюры». Толькі мацуюцца яны не на ногі, а на рукі. Дзейнічаюць вельмі проста — калі рыбак уваліўся ў ваду, то з дапамогай шыпоў ён можа зачапіцца за лёд і выбрацца на паверхню. Калі ж рыбак адправіўся на вадаём без камізэлькі або шыпоў, то яго кашалёк можа аблегчыцца на суму ў 50-200 літаў (у пераліку на беларускія рублі гэта прыкладна 200-800 тысяч).

А вось у Рызе закон яшчэ больш жорсткі. Любому механічнаму транспартнаму сродку шлях на лёд вадаёма забаронены. Выключэнне існуе толькі для трох выпадкаў — калі прысутнасць аўто на лёдзе неабходная для абслугоўвання вадаёма, падчас аказання медыцынскай дапамогі і ў рамках адмысловых мерапрыемстваў, ды і то калі гэта дазволена адпаведнымі органамі. Заканадаўча забаронена там і знаходзіцца на нетрывалым лёдзе. Між іншым, калі для выратавання чалавека, які праваліўся пад лёд, давялося задзейнічаць ратаўнікоў, брыгаду «хуткай дапамогі» або іншыя службы, то сума штрафу ўжо дасягае зусім не малых па беларускіх мерках сум — ад 142 да 350 еўра — больш за 5 мільёнаў рублёў!

❍ ❍ ❍

Калі матэрыял ужо рыхтаваўся да друку, вырашыў пацікавіцца ўзроўнем зарплат у Латвіі. Аказалася, што пасля выліку ўсіх падаткаў сярэдні латвійскі работнік зарабляе 557 еўра. Вось так і атрымліваецца, што ўсяго адзін выхад на тонкі лёд можа пазбавіць чалавека большай часткі яго зарплаты. Але такі буйны памер штрафу — гэта не імкненне да нажывы, а перш за ўсё клопат аб тым, каб людзі воленс-ноленс неабдумана не рызыкавалі. Бо ніякі ўлоў не варты чалавечага жыцця. Насамрэч, хіба існуе для многіх грамадзян лепшы агітатар за ўласную бяспеку, чым велізарны штраф за парушэнне элементарных правілаў?

Валяр'ян ШКЛЕННІК.

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

АСЕННІ БАЛЬ — МЕЛОДЫІ НАТХНЕННЯ

У мінулыя выхадныя сталіца кружылася ў танцы: больш за 200 пар з усёй краіны зладзілі ў Беларускім доме друку рэспубліканскі рэйтынгавы турнір па танцах «Восеньскі баль — 2014».

Удзельнікі розных узростаў — ад 6 да 18 гадоў — і катэгорый спаборнічалі ў майстэрстве па лацінаамерыканскай і еўрапейскай праграмах. Здавалася б, што тут складанага: кружыся сабе пад лёгкія мелодыі вальсаў, атрымлівай асалоду ад энергічных па ча-ча-ча ці румбы... Але ж недарэмна танцы лічацца сур'ёзным відам спорту: за паўтары хвіліны пары мусяць паказаць не толькі ўсю прыгажосць і эмацыйнасць, але і тэхніку танца, таму выкладваліся юныя ўдзельнікі не менш за марафонскіх бегуноў.

Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

І хоць атмасфера на конкурсе была цёплай і сяброўскай, аднак і канкурэнцыя прысутнічала: сярод прафесіяналаў выбралі толькі 6 пераможцаў, якіх узнагародзілі кубкамі і дыпломамі. Гадаванцы сталічнага танцавальнага клуба «Факел» таксама выпрабавалі паркет і атрымалі на конкурсе некалькі прызавых месцаў. Як расказаў **трэнер танцавальнага клуба «Факел» Дзмітрый ХЛУДЗЕЕЎ,** парныя бальныя танцы — гэта, апроч прыгажосці і спартыўнай барацьбы, яшчэ і выдатная неназойлівая школа добрых манер, дзе партнёры з дзяцінства вучацца прыслухоўвацца адно да аднаго, хлопчыкі пачынаюць адказваць за дзяўчатак.

Дзіяна СЕРАДЗЮК.

■ Разам з прыродай

ЭКАЛАГІЧНАЯ АЗБУКА Ў МАЛЮНКАХ

Як дзеці ілюстравалі «Экаслоўнічак»

Ці ведаеце вы, як пазнаць у натоўпе экалагічна свядомага чалавека? Яго лёгка заўважыць у краме, бо замест пластыкавага пакета выкарыстоўвае палатняную торбачку. Дзеці ведаюць пра гэта нават лепш за дарослых, а пра іншыя эказвычкі яны расказалі на прэзентацыі «Экаслоўнічка» — экалагічнай азбукі для школ. Выданне, напоўненае рознымі тэрмінамі — ад ландшафту да ўрбаністыкі, багата ілюстравана малюнкамі дзяцей розных узростаў. Школьнікі паказалі сваё бачанне канкрэтных з'яў — рэсурсазбяражэння, вычарпальных рэсурсаў, дома будучыні.

Конкурс на лепшае адлюстраванне экалагічных тэрмінаў праводзіўся з мая гэтага года ў рамках праекта «Адукацыя ў галіне энергаэфектыўнасці і змянення клімату ў Рэспубліцы Беларусь. Школьная праграма выкарыстання рэсурсаў і энергіі (ШПВРЭ)» пры фінансавай падтрымцы Нарвежскага таварыства аховы прыроды. На сайце міжнароднага грамадскага аб'яднання «Экапраект «Партнёрства» і ў дзіцячых выданнях — часопісе «Рюкзачок» ды газеце «Переходный возраст» — штомесяц з'яўлялася па 5 літар алфавіта і словы на іх. Экалагічныя тэрміны трэба было праілюстраваць. На конкурс дасылалі свае работы дзеці з усіх куткоў краіны — усяго прыйшло 150 малюнкаў. Лепшыя з іх з'явіліся на старонках «Экаслоўнічка».

Мэта праекта — экалагічная адукацыя. Мы хочам даць дзецям тэарэтычныя веды: зразумела патлумачыць, як чалавек уплывае на прыроду і як можна скараціць гэты ўплыў, змяніць паўсядзённыя прывычкі, — распавяла **нацыянальны каардынатар праекта ШПВРЭ Наталля АНДРЭЕНКА.** — А яшчэ мы вучым педагогаў, як правільна падаваць гэтую інфармацыю дзецям.

На ўзнагароджанне прыехалі 50 пераможцаў з розных гарадоў краіны — Віцебска, Пінска, Свіслачы. Многія прыбылі сем'ямі. У падарунак юныя экамастакі атрымалі «Экаслоўнічак» і цудоўную торбачку з тканіны.

Дзеці з вялікай ахвотнай і ўласцівай ім непасрэднасцю ўдзельнічалі ў конкурсах — расказвалі, як можна выкарыстаць яечную шкарлупіну альбо шкляную бутэльку, дзяліліся ведамі ў прыродазнаўстве — больш за ўсіх актыўнічалі самыя маленькія эколагі. Некаторыя аўтары ілюстрацый распавялі пра свае работы. Напрыклад, Косця Шэлег вучыцца ў трэцім класе. На свята-прэзентацыю хлопчык прыехаў разам са старэйшай сястрой Ангелінай з аграгарадка Гацук Слуцкага раёна Мінскай вобласці. Ён праілюстраваў складаны тэрмін — «іанізуючае выпраменьванне».

— На малюнку я паказаў планеты і энергію вакол іх. З ідэяй дапамагла сястра, але маляваў я сам, — адзначыў Косця. — У конкурсе прапанавала паўдзельнічаць настаўніца.

Валянціна СВІСТУНОВА, настаўніца экалогіі ў сталічнай гімназіі №18, прыйшла са сваімі вучнямі. Валянціна Мікалаеўна стала суаўтаркай выдання: яна пісала тэксты-тлумачэнні да тэрмінаў, удзельнічала ў адборы слоў для «Экаслоўнічка». Самыя складаныя тэрміны праілюстравалі навучэнцы 18-й гімназіі — усяго ўдзел узялі 16 чалавек з розных класаў.

Вучаніца Валянціны Мікалаеўны, дзевяцікласніца Ганна Кандрацьева, вырашыла намаляваць сваё бачанне «Хартыі Зямлі».

— У школе нам тлумачылі, што «Хартыя Зямлі» — адзін з найважнейшых дакументаў у галіне экалогіі, — адзначыла дзяўчынка. — Я доўга думала, як можна намаляваць дакумент, каб гэта было цікава. На малюнку вы бачыце, што дарослы і дзіця трымаюць у руках планету, а на заднім плане паказана сіняя птушка — сімвал перамен.

Васьмігадовая Ганна Яблонская прыехала на свята разам з бацькамі. Яна намалявала руку, якая аберагае дрэвы ад заводаў, машын і звалак. У такім вобразе яна адлюстравала тэрмін «Шкода наваколлю».

Дарэчы, у рамках праекта падобныя мерапрыемствы праводзяцца пастаянна. Напрыклад, нядаўна адбыўся конкурс прыпевак пра энергазберажэнне. Скончыўся і фестываль інтэрактыўнай педагогікі, дзе праводзілі вынікі акцыі, прысвечанай другаснай сыравіне. У Беларусі праект рэалізуецца з 2008 года пад эгідай Міністэрства адукацыі і дэпартамента па энергаэфектыўнасці Дзяржаўнага камітэта па стандартызацыі.

Кацярына РАДЗЮК

Фота Аляксандра ШАБЛЮКА.

■ Крок да самастойнасці

СТО ПЫТАННЯЎ МІНІСТРУ АДУКАЦЫІ

Сяргей Маскевіч — аб практыцы размеркавання, карыслівых настроях, «праектным» мысленні і ўмовах для самарэалізацыі моладзі

Больш як сто пытанняў паступіла ў Міністэрства адукацыі ад студэнтаў з усіх беларускіх ВНУ напярэдадні сустрэчы міністра адукацыі Сяргея МАСКЕВІЧА са студэнцкім актывам.

— Прызнаюся, што многія пытанні мяне вельмі парадавалі, таму што, як высветлілася, вы думаеце пра тое ж, што і кіраўнік нашай дзяржавы, члены ўрада і кіраўніцтва міністэрства, — канстатаваў Сяргей Маскевіч, сустракаючыся з лепшымі прадстаўнікамі ВНУ ў сценах Белдзяржуніверсітэта. — Вы думаеце аб развіцці краіны і імкняцеся да таго, каб максімальна поўна быў задзейнічаны ваш патэнцыял, хочаце быць упэўненыя, што вашы веды спатрэбяцца, што вы зможаце сябе рэалізаваць. І, што цалкам лагічна, хочаце ведаць: а якія ж напрамкі развіцця найбольш перспектыўныя? Ваша месца ў будаўніцтве новай Беларусі — асаблівае: 380 тысяч студэнтаў — гэта наймагутнейшы патэнцыял! Прычым у міністэрства паступілі і канкрэтныя прапановы, асабліва важныя для нас, паколькі цяпер фарміруецца праграма мерапрыемстваў да Года моладзі. Рыхтуецца новая канцэпцыя маладзёжнай палітыкі. Мы гатовы прыслухоўвацца да тых, хто заўтра будзе несці адказнасць за лёс нашай краіны...

На думку міністра адукацыі, студэнцкае самакіраванне павінна адыгрываць больш значную ролю на ўзроўні ВНУ. У якасці станоўчага прыкладу ён прывёў Белдзяржуніверсітэт, дзе самакіраванне дастаткова добра развітае і студэнты маюць рэальныя рычагі ўплыву на жыццё ўніверсітэта. Вельмі актыўныя і студэнты БНТУ. Сёння ў міністэрстве думаюць над стварэннем Рэспубліканскага маладзёжнага савета.

— Асаблівую ўвагу мы будзем надаваць рэалізацыі праекта «100 ідэй для Беларусі», будзем ствараць максімальна спрыяльныя ўмовы для далучэння як мага большай колькасці моладзі да гэтага руху, — падкрэсліў Сяргей Маскевіч. — Трэба навучыць моладзь ствараць бізнес-планы, навучыць іх праектнаму мысленню. Але маладыя людзі павінны зразумець, што ніхто з грашыма за імі бегаць не будзе. Любы праект чакае сур'ёзная экспертыза, жорсткі конкурсны адбор. Малады чалавек павінен свой праект абараніць, даказаць яго мэтазгоднасць і перспектыўнасць, прадумаць механізмы ўвасаблення ў жыццё. На жаль, сёння сярод моладзі прасочваюцца і карыслівыя настроі: маўляў, а што нам за гэта дадуць? Клопат дзяржавы — стварыць умовы для самарэалізацыі моладзі, арганізаваць пляцоўкі для рэалізацыі маладзёжных ініцыятыў. А задача моладзі — правільна распарадзіцца гэтымі магчымасцямі...

На сустрэчы з міністрам адукацыі ў студэнтаў была магчымасць задаць пытанні кіраўніку галіны асабіста. Адзін са студэнтаў пацікавіўся думкай міністра наконт функцыянавання шматлікіх прыватных фірмаў, дзе гатовы напісаць за студэнта кантрольную, рэферат, курсавую ці нават дыплом. Прычым такія фірмы адкрыта рэкламуюць свае паслугі.

— Я лічу, што калі ёсць попыт, то абавязкова будзе і прапанова. Студэнты, якія спрабавалі прыцягнуць дапамогу звонку, былі ва ўсе часы. Проста з развіццём інфармацыйных тэхналогій рабіць гэта стала прасцей, і прапановы пасыпаліся, — падзяліўся сваімі думкамі міністр. — Безумоўна, адыграла сваю ролю і даступнасць вышэйшай адукацыі, якая пайшла не на карысць яе якасці. У студэнтаў-завочнікаў мы фактычна адмянілі кантрольныя работы, таму што гэтая форма кантролю перастала быць эфектыўнай. У Гомелі, ва ўніверсітэце спажывецкай кааперацыі, на сесіях завочнікаў практыкуецца відэаназіранне. Але я прытрымліваюся погляду, што пакуль нашы студэнты самі не ўсвядомяць каштоўнасць адукацыі, каштоўнасць атрыманых ведаў, нічога кардынальна не зменіцца. Трэба, каб яны самі далі адказ на пытанне: што для іх галоўнае — атрымаць дыплом ці атрымаць веды?

— А давайце ўсе студэнты свае курсавыя работы будуць «зліваць» на адзіны інтэрнэт-рэсурс. Цікава будзе паглядзець, праз колькі гадоў ці з якой частатой паўтараюцца адны і тыя ж думкі, — нечакана прапанаваў міністр. — Падчас маёй працы рэктарам у Гродзенскім дзяржаўным універсітэце да мяне часта звярталіся студэнты са скаргамі на тое, што той ці іншы выкладчык завышае студэнтам адзнакі, я штосьці ні разу не чуў.

Хтосьці з удзельнікаў сустрэчы прапанаваў міністру распрацаваць крытэрыі эфектыўнасці маладзёжнай палітыкі і стварыць дзяржаўны орган, які б каардынаваў у краіне ўсю маладзёжную палітыку.

Міністр адукацыі, у сваю чаргу, пацікавіўся ў маладых іх стаўленнем да практыкі размеркавання выпускнікоў:

— У большасці краін Еўропы беспрацоўе — гэта звычайная з'ява. А палітыка нашай дзяржавы скіравана на тое, каб прапанаваць выпускнікам першае працоўнае месца. Гэта найважнейшы сацыяльны праект! Але ж хапае маладых людзей, якія кажуць, што ім гэта не трэба. Атрымліваецца, што агульнасацыяльныя рашэнні не могуць задаволіць кожнага...

Натуральна, што студэнты не маглі не пацікавіцца ў кіраўніка сістэмы адукацыі тым, як можна павысіць прэстыж прафесіі педагога ў грамадстве.

— Мяркую, што без павышэння заробкаў зрабіць гэта будзе праблематычна, — канстатаваў Сяргей Маскевіч. — Але пытанне павышэння іміджу настаўніка ляжыць не толькі ў матэрыяльнай плоскасці. Калі сам педагог лічыць сябе аўтсайдарам, так сама будуць думаць пра яго вучні і іх бацькі. А павагу да сябе выклікае толькі паспяховы чалавек. Таму станоўчы імідж педагогаў — у руках саміх педагогаў.

Надзея НІКАЛАЕВА

■ Не вучобай адзінай

Навучэнцам не дадавалі. У талеркі

Міністэрства гандлю праінспектавала работу школьных і студэнцкіх сталовых і выявіла шматлікія парушэнні і злоўжыванні асобных работнікаў.

Кантрольныя мерапрыемствы прайшлі ў мінулым месяцы ў 36 аб'ектах грамадскага харчавання, размешчаных ва ўстановах адукацыі. Парушэнні былі выяўлены на кожным аб'екце, паведамляе прэс-служба міністэрства.

Выпадкі выкарыстання пры прыгатаванні страў прадуктаў са скончаным тэрмінам прыдатнасці або без дакументаў, якія б пацвярджалі іх якасць, выяўлены ў 16 школьных і студэнцкіх сталовых Брэсцкай, Віцебскай, Гомельскай і Гродзенскай абласцей і сталіцы. У 9 аб'ектах грамадскага харчавання выяўлены недакладванні прадуктаў, якія склалі ад 9 да 16 працэнтаў, а ў сталовай Беларускага дзяржаўнага медыцынскага ўніверсітэта дасягалі 40 працэнтаў. Апроч таго, у сталовых некалькіх школ Лельчыцкага і Гомельскага раёнаў выяўлены факты «эканоміі»: знойдзены прадукты, якія па дакументах ужо былі выкарыстаны для харчавання дзяцей. Адпаведная інфармацыя накіравана ў Гомельскі аблвыканкам для прыняцця захадаў.

Сяргей РАСОЛЬКА

■

Центр Промышленной Оценки
• Организация аукционов
• Оценка всех видов имущества

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

ЗАО «Центр промышленной оценки» (организатор аукциона) по поручению Минского райпо (продавец) проводит повторный открытый аукцион по продаже объектов недвижимого имущества в составе:

Лот № 1: здание магазина № 63, об. пл. 97,7 кв.м, инвентарный номер 600/С-136917, 1961 г.п., расположенное по адресу: Республика Беларусь, Минская область, Минский район, Горанский с/с, д. Великое Село.
Начальная цена с НДС – 180 000 000 бел. руб. Земельный участок для обслуживания здания магазина пл. **0,0768 га**, предоставлен продавцу на праве аренды по 06.12.2041 с ограничением (водоохранная зона).

Лот № 2: здание магазина, об. пл. 91,7 кв.м, инвентарный номер 600/С-138765, 1989 г.п., расположенное по адресу: Республика Беларусь, Минская область, Минский район, Юзуфовский с/с, д. Казеково, ул. Центральная 28А.
Начальная цена с НДС – 180 000 000 бел. руб. Земельный участок для обслуживания здания магазина пл. **0,0762 га**, предоставлен продавцу на праве аренды по 05.08.2042.

Лот № 3: здание магазина, об. пл. 80 кв.м, инвентарный номер 600/С-135066, 1993 г.п., расположенное по адресу: Республика Беларусь, Минская область, Минский район, Папернянский с/с, д. Рахманьки.
Начальная цена с НДС – 135 000 000 бел. руб. Земельный участок для обслуживания здания магазина пл. **0,0340 га**, предоставлен продавцу на праве аренды по 24.07.2041, с ограничениями (водоохранная зона реки Вяча; зона санитарной охраны водозабора «Новинки» г. Минска).

Задаток 10% от начальной цены лота перечисляется: резидентами РБ на р/с № 3012343260010; нерезидентами РБ в валютном эквиваленте по курсу Нацбанка РБ на дату платежа на в/с: в долларах США (USD) – 3012343265044; в российских рублях (RUB) – 3012343265028; в ЦБУ № 507 г. Минска ОАО «Белинвестбанк», БИК 153001739, УНП 191021390, получатель платежа ЗАО «Центр промышленной оценки».
Извещение о проведении предыдущего аукциона опубликовано в газете «Звязда» от 25.10.2014 г.
Договор купли-продажи должен быть подписан в течение **10** (десяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата за объект производится в порядке, предусмотренном в договоре купли-продажи.
Порядок проведения аукциона, оформления участия в аукционе, а также определения лица, выигравшего аукцион, оговорен в условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов **www.cpo.by.**
Аукцион состоится **01.12.2014 в 11.00** по адресу: **г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703.** Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **28.11.2014 до 17.00** по указанному адресу.

Тел.: +375 17-280-36-37; +375 29-183-69-71.

ДУМАЦЬ ПРА ЧАЛАВЕКА, А НЕ ХАВАЦЦА ЗА ПАПЕРАМІ,

або Якія праблемы хвалююць педагогаў

■ Не пакінуць сам-насам

«Адукацыя — тая галіна, якая стварае настрой усяго грамадства. Не будзем таіць, праблем у нас шмат, але і галіна наша — велізарная. Мы самі выбралі прафесію педагога і павінны разумець, што пры любых абставінах, нягледзячы на ўсе нашы цяжкасці, невысокія заробкі і высокую нагрузку, мы не можам ісці да дзяцей без добрага настрою», — падзяліўся сваімі думкамі з удзельнікамі VII пленума Цэнтральнага камітэта Беларускага прафсаюза работнікаў адукацыі і навукі яго старшыня Аляксандр БОЙКА.

Фотадэманстрацыя Марыны БЕГУНКОВАЙ.

Адной з тэм, якія ўзніміліся на пленуме, стала распрацоўка праекта праграмы асноўных напрамкаў дзейнасці прафсаюза на 2015—2020 гады. Ва ўдзельнікаў была магчымасць задаць пытанні, якія хвалююць педагогаў, намесніку міністра адукацыі Сяргею Рудаму. А пытанняў аказалася шмат, прычым многія з іх ставяцца перад Міністэрствам адукацыі ўжо не першы год. Напрыклад, пытанне з вызначэннем статусу педагога, які адказвае за бяспеку дзяцей пры іх падвозе ад дома да школы. У выніку аптымізацыі сеткі навучальных устаноў і закрыцця малакамплектных школ паўстала неабходнасць цэнтралізавана арганізоўваць падвоз 70 тысяч навучэнцаў. У кожнай вобласці ў падвозе дзяцей задзейнічана да 300 адзінак аўтобусаў. Але ўзнікае пытанне: чаму настаўнік, у якога таксама ёсць свае малалетнія дзеці, у якасці «грамадскай нагрузкі» павінен у 6.30 раніцы збіраць дзяцей па навакольных вёсках і суправаджаць іх у школу? Намесніку міністра адукацыі была выказана канкрэтная прапанова — вылучыць 10 гадзін арганізацыйна-выхаваўчай работы на тыдзень, якая будзе аплачвацца, на кожны школьны аўтобус. Патрабуецца ўсяго адзін нарматыўны дакумент з боку Міністэрства адукацыі, каб усе рэгіёны былі ў аднолькавых умовах, бо пакуль што кожны дзейнічае ў залежнасці ад абставін. У межах краіны — гэта не такія вялікія грошы...

РАКА, А НЕ РУЧАЁК

Шмат гадоў ставіцца і пытанне аб зніжэнні тыднёвай нагрузкі на выхавальнікаў дашкольных устаноў (з 36 да 30 гадзін). Пра нізкія заробкі ў гэтай сферы і катастрафічны дэфіцыт кадраў ведаюць усе. Як трапна заўважыла адна з удзельніц пленуму, «калі летась адток педкадраў з дашкольных устаноў можна было параўнаць з ручайком, то сёлета ручаёк ператварыўся ў шырокую раку». Гледзячы на заробкі сваіх старэйшых калег, якія маюць вышэйшую кваліфікацыйную катэгорыю і дасягнулі ў аплаце працы сваёй столі, моладзь актыўна пацягнулася шукаць сабе прымяненне за сценамі дашкольных устаноў. У апошнія гады латаць «дзіркі» ў кадравай палітыцы ўдавалася толькі за кошт размеркавання ва ўстановы дашкольнай адукацыі выпускнікоў філалагічнага, гістарычнага факультэтаў і іншых няпрофільных педагагічных спецыяльнасцяў. Напрыклад, у Брэсцкай вобласці сёлета больш за палову ад агульнай колькасці маладых спецыялістаў, якія размеркаваліся ў дашкольныя ўстановы, не маюць адукацыі па профілі «педагогіка дзяцінства». І ніводзін з іх не заключыў кантракт на тэрмін большы за 2 гады, бо перспектывы атрымання кваліфікацыйнай катэгорыі ў іх вельмі цьмяныя. Хутчэй за ўсё, пасля двух гадоў працы па размеркаванні маладыя спецыялісты сістэму дашкольнай адукацыі пакінуць.

Пытанняў аказалася шмат, прычым многія з іх ставяцца перад Міністэрствам адукацыі ўжо не першы год. Напрыклад, пытанне з вызначэннем статусу педагога, які адказвае за бяспеку дзяцей пры іх падвозе ад дома да школы.

Брастаўчане прапаноўвалі ўнесці ў інструкцыю аб атэстацыі адпаведны пункт, які б дазваляў да 1 верасня 2017 года атэстоўваць выхавальнікаў дашкольных устаноў, якія не маюць профільнай адукацыі, на ранейшых умовах. Але іх прапанова не была пачутая. Дарэчы, у Брэсцкай вобласці 47,2% работнікаў дашкольных устаноў не маюць спецыяльнай профільнай адукацыі. А што будзе, калі ў наступным годзе выпускнікі няпрофільных спецыяльнасцяў адмовяцца размяркоўвацца не па сваёй спецыяльнасці? Яны маюць на гэта права. Хто ў гэтым выпадку будзе выхоўваць дзяцей? Сітуацыя склалася вельмі небяспечная...

ПРАФЕСІЙНАЯ ПЕНСІЯ: НЕВЫКАНАЛЬНЫЯ ЎМОВЫ

Па-ранейшаму востра стаіць пытанне прафесійнага пенсійнага страхавання, нягледзячы на неаднаразовыя звароты ЦК прафсаюза ва ўрад, Міністэрства працы і сацыяльнай абароны і Міністэрства адукацыі з прапановамі перагледзець крытэрыі ацэнкі ўмоў працы педагагічных работнікаў. Сёння прафесійнаму пенсійнаму страхаванню настаўнікі падлягаюць пры выкананні трох умоў адначасова. Першая — гэта занятасць не менш чым на поўную стаўку (аклад), у тым ліку — вядзенне педагагічнай дзейнасці ў частцы рэалізацыі адукацыйных праграм у аб'ёме не менш за 18 гадзін на тыдзень. Другая — выкананне арганізацыйна-выхаваўчай работы. І трэцяя — ажыццяўленне дадатковага кантролю за вучэбнай дзейнасцю навучэнцаў. Такім чынам, фактычна сваё права на атрыманне пенсіі па выслузе гадоў могуць рэалізаваць цяпер толькі асобныя настаўнікі. А ўсе педагогі, якія не працуюць менш чым на стаўку; настаўнікі, якія не маюць гадзін арганізацыйна-выхаваўчай работы; настаўнікі дысцыплін, па якіх вучэбнымі планамі не прадугледжаны дадатковы кантроль за вучэбнай дзейнасцю вучняў, не могуць разлічваць на выхад на пенсію па выслузе гадоў. Між іншым, для педагагічных работнікаў устаноў, якія сталі «ахвярамі» аптымізацыі сеткі навучальных устаноў, выхад на пенсію па выслузе гадоў мог быць стаць сапраўдным выратаваннем. Да таго ж, працуючы ў малакамплектнай школе, проста немагчыма выканаць усе вызначаныя крытэрыі.

НЕ ДАПУСЦІЦЬ ЗНІЖЭННЯ ГАРАНТЫЙ

Намеснік старшыні ЦК Беларускага прафсаюза работнікаў адукацыі і навукі Раман ДАПІРА паведаміў, што прафсаюз прыняў актыўны ўдзел у грамадскім абмеркаванні праекта змяненняў і дапаўненняў у Кодэкс аб адукацыі, каб не дапусціць зніжэння гарантый работнікам галіны і навучэнцам. У прыватнасці, была ўнесена прапанова дакладна размежаваць, якія віды атэстацыі педагагічных работнікаў адносяцца да іх абавязкаў (на пацвярджэнне кваліфікацыйнай катэгорыі), а якія — да іх правоў (на прысваенне кваліфікацыйнай катэгорыі). Прафсаюз заклікае замацаваць у кодэксе права педработнікаў на скарочаную працягласць рабочага часу, паколькі ў Працоўным кодэксе гэтае права замацавана толькі за настаўнікамі, гэта значыць, толькі за адной з катэгорый педагагічных работнікаў.

Яшчэ ў 2013 годзе прафсаюз звярнуў увагу Мінадукацыі на нерабочы механізм рэалізацыі нормы, якая прадугледжвае ўзгадненне заснавальнікам установы вышэйшай адукацыі кожнага выпадку зніжэння напаўняльнасці вучэбных груп з Міністэрствам фінансаў. Тым больш што штатная колькасць прафесарска-выкладчыцкага складу залежыць не ад колькасці груп, а ад колькасці кантынгенту. Міністэрства адукацыі плануе ўрэгуляваць гэтую супярэчнасць у Кодэксе.

ЦК прафсаюза прапанаваў улічваць пры нераразмеркаванні маладых спецыялістаў наяўнасць медыцынскіх супрацьпаказанняў да працы не толькі па атрыманай спецыяльнасці, але ў пэўных умовах (маецца на ўвазе прыродны фактар і г.д.).

ЧАМУ НЕМАГЧЫМА СТАЦЬ «ЗАСЛУЖАНЫМ»?

Яшчэ адна неўрэгуляваная праблема — новы парадак аплаты бальнічных лісткоў. У сувязі з новай рэдакцыяй Палажэння аб парадку забеспячэння дапамогамі па часовай непрацаздольнасці і па цяжарнасці і родах на 14-дзённым лістку непрацаздольнасці нізкааплатныя работнікі галіны губляюць больш як 200 тысяч рублёў, а маладыя спецыялісты-настаўнікі на дапамозе па цяжарнасці і родах — больш як 9 мільёнаў рублёў. Прапановы па гэтай сітуацыі неаднаразова накіроўваліся прафсаюзам ва ўрад.

У прафсаюзе задаволены тым, што нарэшце быў зроблены першы крок па змяншэнні празмернага дакументаабароту ва ўстановах адукацыі. Вялікая колькасць папер, якія даводзіцца запаўняць педагогам штодня, і прыцягненне іх да выканання няпрофільных функцый — два пытанні, якія пастаянна ўзнімаліся на самых розных узроўнях. У прафсаюзе спадзяюцца, што прыняцце Міністэрствам адукацыі «Пераліку дакументаў для асобных педагагічных работнікаў устаноў агульнай сярэдняй адукацыі» — толькі пачатак руху ў правільным кірунку.

У Брэсцкай вобласці сёлета больш за палову ад агульнай колькасці маладых спецыялістаў, якія размеркаваліся ў дашкольныя ўстановы, не маюць адукацыі па профілі «педагогіка дзяцінства». І ніводзін з іх не заключыў кантракт на тэрмін большы за 2 гады.

Звярнулі ўвагу намесніка міністра адукацыі ўдзельнікі пленума і на маральную праблему — невялікую колькасць адзначаных узнагародамі педагогаў. Напрыклад, у Гродне няма ніводнага настаўніка, які б меў званне «заслужанага». Няўжо ў вялікім абласным цэнтры адсутнічаюць годныя кандыдатуры?

Як трапна заўважыла **старшыня Рэспубліканскага Савета ветэранаў працы галіны і Беларускага прафсаюза работнікаў адукацыі і навукі Яніна ТРАХІМОВІЧ** (дарэчы, прадстаўніца педагагічнай дынастыі, якая можа параўноўваць розныя «эпохі» ў развіцці нацыянальнай сістэмы адукацыі), трэба больш думаць пра чалавека, а не хавацца за паперамі. «У адукацыі будзе намнога больш парадку, калі кіраўніцтва галіны будзе думаць пра звычайнага настаўніка. І тады статус педагога ў грамадстве абавязкова павысіцца» — падкрэсліла яна.

Надзея НІКАЛАЕВА

■

Управляющий по делу о банкротстве ОДО «Алгоритм» Талиш А.В. – организатор торгов, СООБЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ ТОРГОВ по продаже имущества ОДО «Алгоритм»

Наименование лота № 1:
Изолированные помещения с инвентарными номерами № 400/D-84715 и № 400/D84716 общей площадью 263,9 м².
Расположенных по адресу: г. Гродно, ул. Ленина, 13, 3 этаж здания.

Начальная цена продажи лота: 1 823 455 800 рублей.
Задаток (5%): 91 172 790 рублей.
Торги проводятся в форме аукциона, открытого по составу участников и по форме подачи предложений о цене. Шаг торгов 5%.

Торги состоятся 3 декабря 2014 года в 12.00 по адресу: г. Гродно, ул. Ленина, 13, 3 этаж, каб. директора.

До подачи заявки Претенденту необходимо перечислить задаток в безналичном порядке по следующим платежным реквизитам: ОДО «Алгоритм», р/с № 3012300426007 в ЗАО «Альфа Банк», г. Минск, код, 270, УНП 500019969.
Заявления на участие в аукционе с приложением платежного поручения, подтверждающего внесение задатка, а также: для юридических лиц – заверенной копии свидетельства о гос. регистрации, устава; для индивидуального предпринимателя – заверенной копии свидетельства о гос. регистрации; для физ. лица – копии паспорта, принимаются с момента выхода настоящего объявления до 12.00 02.12.2014 по адресу: 230020, г. Гродно, ул. Кабяка, 9-76. Срок возможного отказа от проведения торгов 12.00 до 02.12.2014.
Победителем аукциона признается участник, предложивший наибольшую цену покупки. После окончания торгов с победителем подписывается протокол и заключается договор. Победитель торгов обязан оплатить стоимость покупки в течение 30 дней после подписания протокола. В соответствии с п. 1 Указа Президента Республики Беларусь от 05.05.2009 № 232 возмещение затрат на организацию и проведение торгов осуществляется участником, выигравшим торги. В случае признания торгов несостоявшимися в связи с подачей заявления на участие в них только одним участником возможна продажа предмета торгов этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов.
Настоящее объявление содержит лишь общие характеристики предмета торгов. Получить полную информацию о порядке и условиях проведения торгов, о предмете торгов можно в рабочие дни с 9.00 до 18.00 по адресу: г. Гродно, ул. Ленина, 13, тел. 8(029)6548442. Ознакомиться с предметом торгов можно в рабочие дни с 10.00 до 14.00 по адресу: г. Гродно, ул. Ленина, 13, 3 этаж.

ПРОЕКТНАЯ ДЕКЛАРАЦИЯ

по объекту «Многоквартирные жилые дома №№ 11, 12, 13, 14 по генплану в районе пересечения улиц Проектируемой № 1, Проектируемой № 2 в границах жилого района «Лебяжий». Дом № 14 без инженерных сетей».

Сведения о застройщике.
Государственное предприятие «УКС Центрального района г. Минска» решением Мингорисполкома № 2292 от 18.11.2004 зарегистрировано в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей за № 190580566.
Юридический адрес: 220004, г. Минск, ул. Мельникайте, 3, Режим работы: понедельник – четверг с 8.30 до 17.30, пятница с 8.30 до 16.15. Обеденный перерыв с 13.00 до 13.45.
Выполняя функции заказчика, в течение последних трех лет КУП «УКС Центрального района г. Минска» построены и введены в эксплуатацию объекты:
- жилой дом № 20 по ул. Камайская;
- жилой дом № 12 по ул. Камайская;
- жилой дом № 15 по ул. Ратомская;
- жилой дом № 16 по ул. Мястровская;
Цель проекта – строительство жилого дома № 14 по генплану в составе объекта «Многоквартирные жилые дома по г/п №№ 11, 12, 13, 14 в районе пересечения улиц Проектируемой № 1, Проектируемой № 2 в границах жилого района «Лебяжий»» общей площадью 12,3 тыс.кв.м, в том числе общая площадь квартир – 10,4 тыс.кв.м.
Вид строительства: новое строительство.
Начало строительства – III квартал 2014 года.
Окончание строительства – II квартал 2016 года.
Проектные решения: жилой дом запроектирован 9-этажным 4-секционным, всего квартир – 162, в том числе однокомнатных – 36 шт., двухкомнатных – 72 шт., трехкомнатных – 54 шт. Секции оборудованы лифтами на 630 кг со скоростью 1,0 м/с, и мусоропроводом. В техническом подполье запроектированы помещения для инженерного обслуживания дома – помещение ИТП и электрощитовая. Входы в техподполье выполнены непосредственно снаружи.
При входных группах в каждую секцию предусмотрено место для пандуса
Конструкция здания – монолитный каркас со стенами с плоскими монолитными перекрытиями.
В квартирах, расположенных на 6-м этаже и выше, предусмотрено устройство вторых эвакуационных выходов на лоджию с глухим простенком от торца лоджии и балкона до оконного проема не менее 1,2 м.
Наружная отделка – атмосферостойкие штукатурки с последующей окраской фасадными красками; облицовка конструкций приямков и крылец плитами искусственного камня.
Окна – деревянные по СТБ 939-93 с одинарным остеклением (двухкамерный стеклопакет).
Витражи остекления лоджий – из профилей ПВХ.
Строительство осуществляется за счет средств физических и юридических лиц.
Проектно-сметная документация прошла в установленном порядке государственную экспертизу, получено положительное заключение РУП «Главгосстройэкспертиза» от 21.06.2010 № 671-15/10. Участок площадью 0,7073 га передан КУП «УКС Центрального района г. Минска» решением Мингорисполкома от 13.03.2014 № 591(1) (до 1 августа 2015 года).
Получено разрешение на организацию стройплощадки Госстройнадзора от 08.09.2014 № 2-209Ж-031/14. Получено разрешение Инспекции департамента контроля и надзора за строительством по г. Минску на производство работ от 26.09.2014 № 2-209Ж-031/14.
В коммунальную собственность г. Минска для переселения граждан из жилых домов, подлежащих сносу в связи с предоставлением земельных участков под жилищное строительство, безвозмездно передается 7,8% общей площади жилого дома.
Для привлечения дольщиков к строительству по договорам создания объектов долевого строительства граждан, состоящих на учете нуждающихся в улучшении жилищных условий, предлагаются:
2 (две) однокомнатные квартиры;
3 (три) двухкомнатные квартиры;
10 (десять) трехкомнатных квартир;
Стоимость 1 м² жилья без затрат, не входящих в сводный сметный расчет, на момент заключения договора долевого строительства для граждан, состоящих на учете нуждающихся в улучшении жилищных условий: 12 681 334 (двенадцать миллионов шестьсот восемьдесят одна тысяча триста тридцать четыре) белорусских рубля.
Стоимость затрат, не включенных в стоимость строительства объекта долевого строительства, но относимые на стоимость строительства в соответствии с законодательством предъявляется дольщику к оплате по мере производства таких затрат или по окончании строительства с заключением дополнительного соглашения при наличии соответствующих оснований.
Условия оплаты – первоначальный взнос в размере **15% стоимости** объекта долевого строительства в течение **10 (десяти) банковских дней** со дня регистрации договора создания объекта долевого строительства в Мингорисполкоме, оставшаяся сумма оплачивается до окончания строительства в соответствии с графиком платежей, являющимся приложением к договору либо единовременно.
Оплата производится в белорусских рублях на специальный и расчетный счет застройщика.
Для заключения договоров необходимы:
- паспорт и личное присутствие лица, с которым будет заключаться договор;
- справка о состоянии на учете граждан, нуждающихся в улучшении жилищных условий.
Документы для заключения договоров будут приниматься с 25.11.2014 г. Прием заявлений осуществляется до момента набора необходимого количества заявлений, соответствующего количеству продекларированных квартир.
Если гражданин либо иной претендент на участие в долевом строительстве в течение 5 (пяти) календарных дней с момента регистрации его заявления не явился для заключения договора и не сообщил об уважительных причинах своей неявки, его заявление на участие в долевом строительстве утрачивает силу и Государственное предприятие «УКС Центрального района г. Минска» оставляет за собой право заключить договор на заявленную квартиру с другим претендентом.
Срок действия настоящей проектной декларации – до момента опубликования новой проектной декларации, которая отменяет действие опубликованной ранее.
Более подробные сведения об объекте долевого строительства и ходе работ по строительству жилого дома можно получить по адресу: 220004, г. Минск, ул. Мельникайте, 3. Режим работы: понедельник – четверг с 8.30 до 17.30, пятница с 8.30 до 16.15, перерыв (понедельник – пятница) с 13.00 до 13.45. Тел. 306-07-26.

УНП 190580566

УЗДЕНСКИЙ РАЙОННЫЙ ИСПОЛНИТЕЛЬНЫЙ КОМИТЕТ

19 декабря 2014 года по адресу: г. Узда, ул. Советская, 22, кабинет 309 (3-й этаж) в 10.00 проводит открытый аукцион на право заключения договоров аренды земельных участков

На аукционные торги на право заключения договора аренды выставляются участки:

№ лота	Продавец	Местонахождение участка	S (га)	Кадастровый номер	Начальная цена (бел. руб.)	Расходы по подготовке (кроме расходов на публикацию извещения) (бел. рублей)
Лот № 1	Узденский райисполком	г. Узда, ул. Новицкого (№ 73 по ПДП)	0,1985	625650100001000581	87 833 868	11 982 771
Лот № 2	Узденский райисполком	г. Узда, ул. Новицкого (№ 68 по ПДП)	0,1996	625650100001000582	88 320 605	11 661 815

Целевое назначение участка – для строительства и обслуживания многоквартирного жилого дома (для размещения объектов многоквартирной жилой застройки). Инженерно-техническое обеспечение земельного участка отсутствует. Срок аренды участка – 99 лет.
Победитель аукциона либо единственный участник несостоявшегося аукциона возмещает расходы, связанные с проведением аукциона и формированием земельного участка, в том числе с государственной регистрацией в отношении создания земельного и публикацией объявлений об аукционе в средствах массовой информации. Оплата в размере цены продажи объекта (за вычетом задатка) производится в течение 10-ти рабочих дней со дня утверждения в установленном порядке протокола о результатах аукциона.
Победитель аукциона либо единственный участник несостоявшегося аукциона обязан:
заключить с Узденским районным исполнительным комитетом договор аренды земельного участка и в течение двух месяцев с момента заключения договора аренды осуществить государственную регистрацию земельного участка, прав, ограничений (обременений) прав на него;
получить в установленном порядке разрешение Узденского районного исполнительного комитета на проведение проектно-изыскательных работ и разработки проекта на строительство объекта в срок, не превышающий двух лет;
приступить к занятию земельного участка не позднее шести месяцев после получения свидетельства о государственной регистрации на него;
осуществить строительство объекта в сроки, определенные проектно-сметной документацией.
Заявления на участие в аукционе с необходимыми документами принимаются по адресу: г. Узда, ул. Советская, 22, кабинет 206, с 8.00 до 17.00 по рабочим дням по 15 декабря 2014 года включительно.
Заключительная регистрация – с 9.00 до 9.45 в день проведения аукциона.
Участники аукциона должны представить следующие документы:
• заявление на участие в аукционе с указанием кадастровых номеров и адресов земельных участков;
• заверенную банком копию платежного поручения о внесении задатка.
При подаче документов на участие в аукционе граждане, представители граждан, индивидуальных предпринимателей и юридических лиц представляют документ, удостоверяющий личность.
Задаток в размере 10 процентов от начальной цены земельного участка перечисляется путем безналичных расчетов платежным поручением (квитанцией) на счет 3600631002518 Главного управления Министерства финансов Республики Беларусь по Минской области в ЦБУ № 625 филиала № 500 Минского управления ОАО «АСБ Беларусбанк» г. Узда, МФО 153001601, УНП 600537220, код платежа на право заключения договора аренды земельного участка – 04002. Граждане, индивидуальные предприниматели и юридические лица, желающие участвовать в аукционе в отношении нескольких земельных участков, вносят задатки в размере, установленном для каждого из этих земельных участков.
Аукцион состоится по каждому лоту при наличии не менее двух участников.
Участники аукциона предварительно могут ознакомиться с земельными участками, которые предлагаются для аренды на аукционе путем выезда к месту нахождения этих участков.
Более подробная информация об аукционах, условиях участия размещена на официальном сайте Узденского районного исполнительного комитета: **www.uzda.minsk-region.by,** либо по телефонам **(801718) 65404, 54705, 56069.**

Краіна здароўя

Выпуск № 17 (328)

■ Асаблівасці харчавання

БАД — НЕ ЭЛІКСІР, А КАНЦЭНТРАТ!

У 1900 годзе сярэдняя працягласць жыцця еўрапейца не перавышала 38 гадоў. Людзі гінулі ад грыпу, сухотаў, халеры, брушнога тыфу і іншых інфекцый. Сёння ў Еўропе жывуць куды больш за 70 гадоў. А ўсё дзякуючы чаму? Правільна, развіццю медыцыны.

— Напрыканцы мінулага стагоддзя ў жыцця нашага грамадства з'явілася новае паняцце — біялагічна актыўныя дабаўкі да ежы, — тлумачыць **урач-рэабілітолаг 3-й цэнтральнай раённай клінічнай паліклінікі г. Мінска Надзея ЛАЎРЭНЦЬЕВА.** — Цікавасць да іх імкліва працягвае расці як з боку насельніцтва, так і з боку спецыялістаў-медыкаў. Гэту цікавасць правільна было б назваць «другім прышэсцем», паколькі многія натуральныя кампаненты, якія ўваходзяць у БАДы, паспяхова прымяняліся ў лячэбных і прафілактычных мэтах са старажытных часоў. Агульная фармулёўка паняцця БАД будзе выглядаць так: «Гэта прыродныя, натуральныя рэчывы, якія актыўна і пазітыўна ўздзейнічаюць на тыя прычыны і механізмы, што выклікаюць у чалавека захворванні».

2,5 тысячы гадоў таму Гіпакрат сказаў, што наша ежа павінна быць лекамі, а нашы лекі павінны быць харчовымі рэчывамі. Цяпер навукова даказана, што 35 працэнтаў ракавых захворванняў негенетычнага паходжання можна папярэдзіць з дапамогай правільнага харчавання, а пры многіх хранічных захворваннях унутраных органаў і сістэм гэтая лічба яшчэ больш высокая. Варта, відаць, падкрэсліць, што выкарыстанне прыродных карэктараў неабходнае не тады, калі захворванне ўжо выяўлена, а на самых ранніх этапах, калі назіраюцца толькі лёгкія праявы. Безумоўна, разумнае эфектыўнае прымяненне БАДаў патрабуе ўсё больш глыбокіх ведаў і навыкаў.

Шэраг папулярных выданняў то палохаюць чытачоў сваімі заявамі аб тым, што БАДы — гэта «хімія», якая можа прывесці да забруджвання арганізма, то ўхваляюць незвычайныя вартасці, нібыта гэта сродкі ад самых страшных захворванняў, «эліксір маладосці» і г.д. Насамрэч БАДы — гэта канцэнтраты прыродных натуральных харчовых і біялагічна актыўных рэчываў, атрыманыя з харчовай сыравіны жывёльнага, марскога, мінеральнага паходжання, харчовых і лекавых раслін або шляхам хімічнага сінтэзу. Гэтыя незаменныя харчовыя і біялагічна актыўныя рэчывы арганізм чалавека сінтэзаваць не здольны, таму мы павінны штодня ўключаць іх у свой рацыён. Інакш з цягам часу мы атрымаем іх моцны дэфіцыт, з-за чаго арганізм аслабне і не зможа процістаяць неспрыяльным фактарам навакольнага асяроддзя. Урэшце пагоршыцца працаздольнасць, паскорацца працэсы старэння. Працяглы дэфіцыт у арганізме гэтых рэчываў можа прывесці да гібелі.

Сёння вядома больш за 15 вітамінаў і больш за 20 мінеральных рэчываў — мікраэлементаў, неабходных арганізму ў міліграмах ці нават у тысячных долях міліграма, без якіх чалавек не можа жыць. Так, пры дэфіцыце ў ежы ёду развіваецца вальняк, пры дэфіцыце селену — дыстрафія міякарда або пухліны.

Ну як не пагадзіцца з Піфагорам: «Чалавек ёсць тое, што ён есць»? Харчаванне — праблема і дзяржаўная, і медыцынская, але ў большай ступені гэта праблема кожнага з нас. Паводле апошніх навуковых даследаванняў, кожная клетка арганізма мае патрэбу ў штодзённым паступленні харчовых мікранутрыентаў. Большасць з іх абсалютна незаменныя, не сінтэзуюцца ў арганізме, а ў прадуктах змяшчаюцца ў малой колькасці.

На шчасце, у наш час з дапамогай высокіх тэхналогій незаменныя, дэфіцытныя нутрыенты і біялагічна актыўныя рэчывы навучыліся атрымліваць з розных крыніц, пасля чаго канцэнтраваць у таблетках, капсулах, парашках, экстрактах, эліксірах і г.д. Так і з'явіліся БАДы. Яны могуць дабаўляцца ў розныя харчовыя прадукты, напоі. Выпуск жа дабавак у выглядзе фармацэўтычных формаў дазваляе рэкамендаваць іх не ўвогуле для харчавання насельніцтва, а канкрэтным групам людзей — дзецям, пажылым, жанчынам і мужчынам у пэўным узросце ці пэўным фізіялагічным стане. Словам, БАД — не толькі канцэнтрат карысных і неабходных чалавеку рэчываў, але і, кажучы вобразна, канцэнтрат сучасных ведаў і тэхналогій.

Вельмі важна ведаць і пра тое, што БАД — гэта толькі дабаўкі да ежы. Яны не могуць замяніць лекі, але з'яўляюцца цудоўным дапаможным сродкам дыетатэрапіі пры лячэнні самых розных захворванняў, а таксама іх прафілактыкі. Таму БАДы павінны, як і любая іншая высокаякасная ежа, прысутнічаць у рацыёне. Рэкамендуецца мэтанакіраванае прымяненне высокаякасных раслінных прэпаратаў. Галоўная рэкамендацыя ў гэтым пытанні — ніякай самадзейнасці. Пачаць прыём варта толькі пасля кансультацыі ў спецыяліста.

■

■ Нетрадыцыйныя метады

ПРАЕХАЦЬ НА КАНІ — УЖО РЭАБІЛІТАЦЫЯ

Масаж, басейн, ванны, размовы з псіхолагам і г.д. — усё гэта можа добра працаваць на прафілактыку захворванняў, агульнае аздараўленне арганізма, а можа і вяртаць цяжка хворых у строй. Рэабілітацыйны напрамак развіваецца неверагодна імкліва. І гэту тэму абмяркоўвалі спецыялісты ваенна-медыцынскіх службаў сілавых ведамстваў Беларусі, Расіі, Азербайджана і Казахстана на нядаўняй сумеснай канферэнцыі.

Супрацоўнікі спецслужбаў таксама хварэюць. Атрымліваюць траўмы, сутыкаюцца з фізічнымі і псіхаэмацыянальнымі перагрузкамі. А стрэсавыя сітуацыі, як вядома, спрыяюць цэламу шэрагу саматычных захворванняў. «Усё гэта можна паправіць з дапамогай аднаўленчага лячэння, — кажа **начальнік ваенна-медыцынскага ўпраўлення КДБ Беларусі Дзмітрый ЗАБЕЛІН.** — Усе хварэюць — ад салдата да генерала, а сучасныя магчымасці рэабілітацыі з'яўляюцца неад'емнай часткай лячэння. Менавіта рэабілітацыя набывае ў апошнія гады ўсё большае значэнне. Мэта канферэнцыі — не толькі падзяліцца вопытам у гэтым кірунку, але і ўмацаваць стасункі, паколькі ў нас ажыццяўляюцца ўзаемны абмен, нашы супрацоўнікі органаў бяспекі паляпшаюць стан здароўя ў Расіі, ва Украіне, Азербайджане, іншых краінах, і наадварот».

Блізкім замежнікам сапраўды стала цікава: а ў якіх умовах ёсць магчымасць папраўляць здароўе ў Беларусі, якая запрасіла на абмеркаванне важнай тэмы да сябе, у санаторый «Лясное» Камітэта дзяржаўнай бяспекі? Санаторый, дарэчы, не з'яўляецца нейкай «закрытай» установай. За 25 гадоў існавання тут адпачылі і прайшлі рэабілітацыю тысячы грамадзян Беларусі, блізкага замежжа, супрацоўнікаў і ветэранаў органаў дзяржбяспекі.

«Наш санаторый невялікі — разлічаны на 175 ложкаў, аднак пра яго добра ведаюць нават за межамі краіны, а таму ў нас людна і летам, і зімой, — тлумачыць **галоўны ўрач санаторыя «Лясное» Сяргей ТАБУНОЎ.** — На сёння мы аснашчаны сучасным абсталяваннем, дзякуючы якому можна не толькі адпачыць, паправіць здароўе, але і правесці неабходныя лабараторна-дыягнастычныя даследаванні. Лячэбная база дазваляе правесці святло- і электралячэнне, ручны і механічны масаж, інгаляцыйную тэрапію, гідратэрапію, бальнеатэрапію, тэрмалячэнне, псіхатэрапію, гідракінезатэрапію, фізія- і касметалагічныя працэдуры, рэфлексатэрапію, іпатэрапію. У першую чаргу размова ідзе пра лячэнне захворванняў сардэчна-сасудзістай і дыхальнай сістэм, скуры і апорна-рухальнага апарату. У нас створана ўнікальная аздараўленчая сістэма, якая спалучае аднаўленчае лячэнне з санаторна-курортным фактарам. «Лясное» размяшчаецца на мяжы Мінскай і Віцебскай абласцей, у жывапісным месцы на беразе возера Дамашкоўскае паблізу Бярэзінскага біясфернага запаведніка».

Ніколі не думала, што момант кармлення Кузьмы з Барынам (гэта конь-сын і яго конь-тата) стане для мяне такім пазітыўным узрушэннем.

У лячэбна-аздараўленчым корпусе размяшчаецца не толькі SPA-комплекс (руская лазня, фінская і інфрачырвоная саўны, 25-метровы басейн з двума джакузі, салярый). Ёсць, напрыклад, галакамера — саляны пакой. Соль падаецца ў выглядзе аэразолю, з-за чаго паветра набывае адпаведны водар і каштоўныя ўласцівасці. Знаходжанне ў такім пакоі на працягу гадзіны за адзін сеанс (дзецям — 30 хвілін) вельмі добра прафілактуе прастуды, дапамагае пры бранхіяльнай астме.

Агульная паветраная крыятэрапія дапамагае лячыць захворванні апорна-рухальнага апарату, скуры і г.д. Холадавы эфект добра вывучаны і, у адрозненне ад неадназначнага маржавання, якое спрыяе хуткаму пераахалоджванню, прыносіць толькі карысць. А таму раздзяваемся да купальніка ці плавак, надзяваем на вушы спецыяльную павязку, на рукі — пальчаткі, рот/нос хаваем пад звычайнай марлевай павязкай і... на 3 хвіліны ў камеру пры 110 градусах са знакам «мінус»! Халоднае паветра забяспечвае выдатны эфект загартоўвання. Паводле ўласных адчуванняў, яно настолькі мабілізуе ўсе сістэмы і органы, што праз 10-15 хвілін, калі сасуды пашыраюцца, узнікае адчуванне, быццам ты здольны звярнуць горы. А паколькі такое нам тут не прапануюць, значыць, выбіраем больш прымальную фізічную нагрузку — адпраўляемся ў басейн!

Пакуль плаваеш, можаш даведацца ад суседкі па заплыве, што такое сухая вуглякіслая ванна. Другая расказвае, як ёй падабаюцца сеансы ва ўрача-псіхатэрапеўта. Пра яго, дарэчы, легенды ходзяць. Быццам адну з пацыентак ён вылечыў ад... боязі паездак у ліфце. Аказалася, гэта не байкі. Расіянка ніколі ў жыцці не карысталася гэтым дасягненнем цывілізацыі. Да каго ні звярталася, ажно да Чумака ездзіла — у кватэру на 7-м паверсе ўсё пешшу хадзіла. Першым, з кім жанчына адважылася пасля некаторых сеансаў псіхатэрапеўтычнага лячэння зайсці ў ліфт, аказаўся беларускі псіхатэрапеўт з санаторыя «Лясное».

Пра спрыяльны эфект верхавой язды гаварыў яшчэ Гіпакрат. У мінулым стагоддзі іпатэрапія («іпас» — конь) выдатна зарэкамендавала сябе ў рэабілітацыі дзяцей з цяжкімі захворваннямі, якія дрэнна паддаюцца лячэнню традыцыйнымі метадамі (аўтызм, разумовая адсталасць, дзіцячы цэрэбральны параліч і інш.). Верхавая язда паляпшае агульны стан арганізма, нармалізуе тонус мышцаў і сасудаў, умацоўвае дыхальную, сардэчна-сасудзістую сістэмы... Пра фарміраванне станоўчага эмацыянальнага фону можна гаварыць проста бясконца. Я, зразумела, коней бачыла не толькі на карцінках. Аднак ніколі да іх не дакраналася. ...Праўда, цяпер гэта ў мінулым. Дакранулася ўсё ж! І ведаеце што? Ні з чым не параўнальныя адчуванні! Ніколі не думала, што момант кармлення Кузьмы з Барынам (гэта конь-сын і яго конь-тата) стане для мяне такім пазітыўным узрушэннем. Калі яны бралі шурпатымі губамі кавалачкі шакаладу з маёй рукі, мне здавалася, што я сама растаю ад шчасця! Праехацца пакуль не асмелілася. Хоць і даведалася, што ў санаторыі адпачывалі ўжо дзве цуда-жанчыны, якія менавіта тут упершыню не толькі дакрануліся да гэтых прыгажуноў, але і асвоілі верхавую язду на даволі добрым узроўні. Адной такой вучаніцы было за 70 гадоў, другой — за 80.

Фота Аляксандра ФЁДАРАВА.

Карміць Кузьму — і боязна, і пазітыўна!

Паводле слоў **дырэктара Рэспубліканскага навукова-практычнага цэнтра медыцынскай экспертызы і рэабілітацыі Васіля СМЫЧКА,** у апошнія гады «ўдзельная вага» лячэння з кожным днём змяншаецца, а рэабілітацыі — павялічваецца. Рэабілітацыйная тэхналогія прысутнічае і на амбулаторным, і на стацыянарным этапах. На жаль, пакуль не так шырока, як за мяжой, выкарыстоўваецца метад работы мультыдысцыплінарных брыгад, у склад якіх уваходзяць некалькі спецыялістаў рознага профілю для аказання пацыенту комплекснай дапамогі. «Урач-рэабілітолаг — гэта проста дыспетчар, вакол якога збіраецца цэлая каманда спецыялістаў, заканчваючы псіхолагам, — заўважыў Васіль Смычок. — Аказанне дапамогі ў вострым перыядзе захворвання — гэта, па сутнасці, «мыш», а тое, чым займаецца рэабілітолаг з камандай — «слон». А ўсё таму, што здароўе — гэта стан поўнага фізічнага, духоўнага і сацыяльнага дабрабыту, а не толькі адсутнасць захворванняў. Нельга проста выдаліць хваробу, неабходна максімальна разлічваць на функцыянальнае аднаўленне магчымасцяў хворага. Пацыент можа ніколі не ўстаць з інваліднай каляскі, але трэба зрабіць так, каб ён «стаяў» у сваіх думках, у коле сям'і, у працоўным калектыве, у грамадстве.

Сёння мы знаходзімся на этапе ўвядзення новых дакументаў — аб парадку ажыццяўлення медыцынскай рэабілітацыі з указаннем паказанняў і проціпаказанняў, аб сістэме стабілізацыйнай дапамогі пацыентам пасля трансплантацыі органаў і тканак, правядзенні медыка-сацыяльнай экспертызы. Распрацуем у хуткім часе крытэрыі ацэнкі ступені страты здароўя ў дзяцей. Новыя падыходы распрацоўваюцца і для вызначэння груп інваліднасці дарослых, плануецца укараніць сістэму працэнтаў страты працаздольнасці».

■

ЭКСТРАКТ ЧАРНІЦ: ШТО ЗА ЭФЕКТ?

У аптэках нескладана знайсці лекавыя сродкі на аснове чарніц. Аднак што такога ёсць у чарніцах, з-за чаго іх прызнала ў тым ліку афтальмалогія?

Яшчэ ў XVI стагоддзі чарніцы прымянялі для лячэння жоўцекамянёвай хваробы, цынгі, кашлю, туберкулёзу. Пазней экстракт з пладоў чарніц пачынаюць прымяняць у тэрапіі дыярэі, дызентэрыі, запаленні слізістай ротавай поласці і глоткі. Адвар лісця ўжывалі як цукрапаніжальны сродак. Сучасныя навуковыя медыцынскія даследаванні, прысвечаныя прымяненню прэпаратаў чарніц, звязаны ў асноўным з вывучэннем іх эфектыўнасці пры сасудзістай афтальмалагічнай паталогіі і сасудзістых ускладненнях цукровага дыябету.

Чарніцы змяшчаюць не толькі глюкозу, фруктозу, цукрозу, але і арганічныя кіслоты (лімонную, яблычную, янтарную, хінную, шчаўевую, малочную), пекціны, дубільныя рэчывы, бэта-карацін, рыбафлавін, марганец, жалеза, нікацінавую і аскарбінавую кіслоты, флаваноіды. Апошнія валодаюць магутнай антыаксідантнай актыўнасцю, стабілізуюць малекулы калагену і паскараюць яго біясінтэз, зніжаюць пранікальнасць і ломкасць капіляраў.



Упершыню здольнасць павышаць вастрыню зроку ў экстракту чарніц выявілі французскія даследчыкі пры назіранні лётчыкаў брытанскіх ВПС падчас Другой сусветнай вайны, якія на старце перад начнымі вылетамі ўжывалі чарнічны джэм! Гэта паляпшала зрокавую адаптацыю ва ўмовах змяркання і цемры. З таго часу было праведзена шмат розных даследаванняў на жывёлах і людзях. І вось аб чым вядома сёння.

• Мяркуецца, што флаваноіды чарніц могуць забяспечыць калі не паляпшэнне глікемічнага профілю, то прафілактыку сасудзістых і неўралагічных парушэнняў пры цукровым дыябеце.

• У эксперыментах на жывёлах з мадэлюю рэўматоіднага артрыту экстракт чарніц выклікаў умераны супрацьзапаленчы эфект.

• У жанчын з дысменарэяй (балючымі месячнымі) прымяненне экстракту чарніц на працягу 3 дзён да пачатку цыкла і на працягу менструацыі суправаджалася зніжэннем інтэнсіўнасці тазавых болю, пачуцця напружання ў малочных залозах, млосці, цяжару і ацёкаў у нагах.

• Прыём экстракту чарніц у дозе 480 мг на суткі на працягу 30-60 сутак змяншаў верагоднасць тромбаўтварэння.

• На эксперыментальных мадэлях пептычнай язвы ў жывёл была прадэманстравана супрацьязвавая актыўнасць экстракту.

• Прэпараты беларускай вытворчасці на аснове стандартызаванага па антацыянідзінах экстракту чарніц паказалі, напрыклад, што на фоне прымянення такога прэпарата, як «Чарніцы-МІК» (531 мг/сут) цягам месяца паляпшаецца перыферычны зрок; змяншаюцца некаторыя змены сятчаткі пры дыябетычнай рэцінапатыі, стрымліваецца прагрэс пашкоджанняў сятчаткі ў хворых на цукровы дыябет.

І восень не такая шэрая

Цяпер такі час года, які ў многіх выклікае стрэс. Таму што лета скончылася, пахаладала, стала менш святла, вырасла рызыка падхапіць прастуду і да наступнага лета... эх, як далёка. Што ж, будзем вучыцца любіць восень. Унясіце ў сваё звычайнае жыццё ўсяго некалькі змяненняў — і ўсё будзе выдатна!

Пад рукой абавязкова павінен быць **імбір —** дадавайце яго ў самыя розныя стравы. Напрыклад, да бульбы, а яшчэ ў каву ці чай.

Не забудзьцеся на самыя розныя **плады пчалярства.** Аддайце ім перавагу перад іншым салодкім і цукрам у чыстым выглядзе. Калі захочацца салодзенькага, акрамя таго ж мёду, купіце ў аптэцы ледзянцы з вітамінам С. Смачна і карысна.

Гародніну і садавіну ешце і ешце. Пакуль яна не страціла свае вітаміны і мікраэлементы. **Гарбуз,** багаты на калій і вітаміны групы В, яшчэ і добра актывізуе работу печані, разгружае сасудзістую сістэму і мякка ачышчае кішэчнік. **Бурак** паляпшае стан скуры і дорыць пачуццё лёгкасці. **Брокалі** карысная для сэрца і касцей. **Вінаград** добра дапамагае аднаўленню, асабліва падчас тых жа прастуд, умацоўвае імунітэт.

Крупы (там шмат вітамінаў групы В) і **насенне** (гарбузовае, льняное, кунжутнае), багатае на амега-кіслоты, — абавязкова.

Пачынайце дзень са шклянкі цёплай (гэта важна!) вады. Гэта спрыяе ачышчэнню печані, захоўвае цеплыню і дапамагае прачнуцца. На працягу дня таксама піце падагрэтую мінеральную ваду.

Раніцай і ўвечары ўцірайце ў цэнтр далоняў і ступняў які-небудзь алей — кунжутны ці нават і нерафінаваны сланечнікавы. Гэта дапаможа захаваць цеплыню, засцеражэ ад вірусаў.

А для таго, каб наогул дапамагчы сваёй сям'і як мага лягчэй спраўляцца з рознымі іспытамі, якія падкідвае нам жыццё, вазьміце на ўзбраенне...

МЕНЮ СУПРАЦЬ СТРЭСУ

Сняданак. Каша аўсяная або геркулес з разынкамі і арэхамі. Можна замяніць на кукурузныя шматкі з малаком або мюслі з арэхамі. Амлет з вяндлінай. Чай зялёны з шакаладам (40 г).

Перакус. Бутэрброд (хлеб з вотруб'ем, сырам і кавалачкам памідора).

Абед. Расольнік. Печань у смятане з варанай бульбай. Адвар шыпшыны.

Полудзень. Шакаладна-бананавы дэсерт (дадаём да пламбіру банан, расплаўлены шакалад, крыху вяршкоў і клубніц).

Вячэра. Вараная ці прыгатаваная на пары грудка індычкі з грэцкімі крупамі. Чай з мятай. Мёд.

Стрэс таксама зніжаюць свежавыціснутыя сокі, авакада, салодкі перац, грэйпфрут, зялёны яблык, банан, ананас, чай з рамонкам і лімонам. Лічыцца, што водар лімона наогул паляпшае працаздольнасць.

СІЛКУЕМ НЕРВЫ

Дадаём у меню прадукты, багатыя на вітамін B_1, B_6, B_{12}: **сухія піўныя дрожджы, рыс, вотруб'е, пшанічныя вырабы, аўсянку, арахіс, свініну, ялавічыну, печань, гародніну, натуральнае малако, яйкі, сою, грэцкія арэхі.** Ворагі гэтага вітаміну — цеплавая апрацоўка, кафеін, кола.

ВЫСТАЎЛЯЕМ ШЧЫТ

Перад іспытамі, экзаменамі неабходна як мага больш ужываць прадуктаў, багатых на хром, — **памідоры, кукурузу, яблыкі, ялавічыну, курыцу, яйкі, мелісу (лімонную мяту), фасолю, гарох, сою, печань, хлеб грубага памолу.**

АДАПТУЕМСЯ

Адаптавацца да любых неспрыяльных умоў, у тым ліку да звычайных інфекцый, дапамогуць **чаі з жэньшэнем, лімоннікам, салодкай, араліяй манчжурскай, эхінацэяй, зялёны чай.**

■

Матэрыялы выпуску падрыхтавала Святлана БАРЫСЕНКА.

■ Доктар адкажа

І ТРЭБА, І... СТРАШНА

«Мне прызначылі прэпарат з ліку антыдэпрэсантаў. Адчуваю сябе дрэнна, але пачаць прымаць лекі перашкаджае нейкі страх. Усё спадзяюся, што ўдасца абысціся без такога лячэння. Раскажыце, калі ласка, чаго варта баяцца, пачынаючы падобнае лячэнне.

Алена Канстанцінаўна,
г. Мінск».

Тлумачыць **урач-псіхатэрапеўт Аксана БЯЛАН:**

— Звычайна чалавек спраўляецца з цяжкасцямі, якія выпадаюць на яго долю. Аднак калі на працягу пэўнага часу адбылося некалькі нязвыклых падзей, то ўнутраных рэсурсаў можа і не хапіць. Тады мы сутыкаемся з дэпрэсіяй, панічнымі расстройствамі, расстройствам адаптацыі, рознымі фобіямі.

Калі вы справіліся з парушэннем эмацыянальнага стану на працягу 2-3 тыдняў, то па дапамогу можна і не звяртацца. Хіба толькі для авалодання новымі навыкамі пераадолення стрэсу або пашырэння іншых здольнасцяў, напрыклад, камунікатыўных.

Аднак калі мінуў месяц, а стан не толькі не паляпшаецца, а яшчэ і пагаршаецца, самы час звярнуцца да псіхатэрапеўта. Падчас візіту першае, што неабходна высветліць, ці ёсць у вас яшчэ рэзервы для таго, каб кантраляваць перажыванні і пачаць псіхатэрапію. Зразумела, чым раней вы звернецеся па дапамогу, тым вышэйшая будзе верагоднасць абысціся без медыкаментознай дапамогі, выкарыстоўваючы толькі ўласна псіхатэрапію. На жаль, як правіла, да псіхатэрапеўтаў прыходзяць тады, калі ўжо ўзнікла пагроза страты працы, сям'і, абвастрыліся нейкія захворванні і ўжо няма сіл нават устаць з ложка ды выйсці з дому. А таму на першы план выходзіць прыняцце рашэння аб пачатку медыкаментознай тэрапіі. Для лячэння праблем настрою, трывожных расстройстваў прымяняюцца антыдэпрэсанты. Сапраўды, як толькі ўрач вымаўляе гэта слова, у пацыента адразу ж узмацняецца трывога, абуджаецца страх.

Першы страх звязаны з тым, што псіхатропныя рэчывы будуць уздзейнічаць на псіхіку. Так, гэта праўда. Пад словам «псіхатропныя» маецца на ўвазе тое, што гэтыя прэпараты аказваюць станоўчы ўплыў на псіхічныя функцыі — настрой, эмоцыі, памяць, здольнасць да канцэнтрацыі ўвагі, сон. У тую ж групу ўваходзяць такія папулярныя прэпараты, як экстракт валяр'яну, сардэчніку, карвалол, валакардзін.

Другі страх звязаны з залежнасцю. У мінулыя дзесяцігоддзі ў практыцы лячэння трывожных расстройстваў нярэдка выкарыстоўвалі транквілізатары, якія вельмі хутка забяспечвалі палёгку і зніжалі эмацыйнае напружанне. Аднак шматгадовыя назіранні паказалі, што для выздараўлення пры расстройствах настрою або трывожных расстройствах патрабуецца мінімум 6-8 месяцаў, а за гэты час развіваецца наркатычная залежнасць. У гэтым іх велізарны мінус. Антыдэпрэсанты не выклікаюць прывыкання і залежнасці. Выбраная спецыялістам тэрапеўтычная доза будзе эфектыўнай увесь перыяд лячэння. Вельмі частая памылка нашых пацыентаў у тым, што яны самастойна адмяняюць лячэнне на фоне першага паляпшэння стану, часцей за ўсё на трэці-чацвёрты месяц тэрапіі, і праз нейкі час адчуваюць вяртанне ранейшых сімптомаў, якія расцэньваюць як залежнасць ад прэпарата. Насамрэч гэта ўсё яшчэ працягваецца недалечаны эпізод.

Трэці страх звязаны з рэкамендацыяй Сусветнай арганізацыі аховы здароўя дадаць у інструкцыю да ўсіх антыдэпрэсантаў паведамленне аб магчымасці з'яўлення суіцыдальных думак. Зніжэнне настрою, апатыя, абыякавасць вельмі часта суправаджаюцца такімі думкамі, а ў працэсе лячэння спачатку вяртаюцца фізічныя сілы і толькі пасля, значна пазней, душэўныя. І гэты прамежак часу можа суправаджацца думкамі аб нежаданні жыць. Пра гэта важна паведамляць урачу, як і пра іншыя змены стану. Аднак без адпаведнай «глебы» такія думкі не з'явяцца падчас прыёму антыдэпрэсанту.

Чацвёрты страх звязаны з сіндромам адмены. Калі вы спыніце прыём у адзін дзень, то сапраўды адчуеце той жа дыскамфорт, які можа быць падчас пачатку лячэння з цэлай таблеткі. Звычайна ўсё праходзіць цягам тыдня. Аднак спецыялісты часцей за ўсё рэкамендуюць пачынаць прыём з паступовага павелічэння дозы, а заканчваць, паступова зніжаючы яе. Калі ж з нейкіх прычын давядзецца раптоўна адмяніць прэпарат (напрыклад, разаўецца алергічная рэакцыя), то гэта абсалютна бяспечна для фізічнага стану і жыцця, хоць нікуды не падзецца ад пэўнага дыскамфорту.

Для лячэння праблем настрою, трывожных расстройстваў прымяняюцца антыдэпрэсанты. Як толькі ўрач вымаўляе гэта слова, у пацыента адразу ж абуджаецца страх.

У амбулаторнай практыцы найбольш распаўсюджаны прэпараты, якія рэгулююць працэсы перадачы нервовых імпульсаў. Напрыклад, сертралін, параксетын, s-цыталапрам, флуваксамін, флуаксецын. Яны лёгка пераносяцца (а таму могуць выкарыстоўвацца пры шэрагу спадарожных захворванняў, пажылымі пацыентамі), хоць і ў іх, як у любых лекаў, ёсць пабочныя эфекты, супрацьпаказанні.

Падчас размовы мы імкнёмся максімальна інфармаваць пацыента аб прэпараце, дзякуючы чаму павышаецца супрацоўніцтва, а значыць, і эфектыўнасць лячэння. Часцей за ўсё ў пачатку прыёму можа знікнуць апетыт і з'явіцца млоснасць, часам узмацняецца пачуццё трывогі, нападае сан-

лівасць і затарможанасць. Каб максімальна знізіць магчымыя эфекты, неабходна паступова, на працягу 10-14 дзён, нарошчваць дозу да мінімальнай тэрапеўтычнай (у большасці выпадкаў дастаткова адной таблеткі), а таксама не забываць прыходзіць на прыёмы (для кантролю стану).

Пры адсутнасці эфекту ад лячэння або пры больш выяўленай сімптаматыцы прымяняюцца антыдэпрэсанты, якія ўздзейнічаюць на перадачу сератаніну і норадрэналіну (венлафаксін). З улікам двайнога дзеяння з'яўляецца пэўная асаблівасць у тым, як пераносіцца лячэнне, ёсць свае пабочныя эфекты, але праяўляюцца яны часова і звычайна праходзяць на працягу месяца. У гэтай групы прэпаратаў доза падбіраецца ў залежнасці ад таго выніку, які мы жадаем атрымаць, і гэты працэс можа заняць звыш двух тыдняў.

У апошнія гады з'явіўся прэпарат агамелатын, які працуе з мелатанінавымі рэцэптарамі, дзякуючы чаму дапамагае пры расстройствах настрою, сну. Пабочныя эфекты ў яго падобныя.

Пры выяўленай дэпрэсіі, якая суправаджаецца напружаннем, узрушэннем, стойкім парушэннем сну, болем, не страцілі актуальнасць і трыцыклічныя антыдэпрэсанты. Гэтую групу вылучае вялікі спектр супрацьпаказанняў і такіх пабочных эфектаў, як санлівасць, кволасць, затарможанасць, сухасць у роце, трэмар (дрыжанне), павышэнне апетыту. Аднак паступовае павелічэнне дозы пад кантролем агульнага стану мінімізуе дыскамфорт.

З дапамогай антыдэпрэсантаў мы робім першы крок да выздараўлення — пачынаем кантраляваць свае эмоцыі, набываем сілу, энергію. Наступны крок будзе больш працяглым па часе і па затрачаных намаганнях. Гэта будзе карэкціроўка ўяўленняў, разуменняў і змена звычак. А самы лепшы памочнік у гэтым — псіхатэрапія.

■

■ Можна прыстасавацца

■ Рэха Першай сусветнай

«Я раптам бачу, што многія салдаты ляжаць мёртвыя. Іх — большасць...»

На брацкай магіле ў Залессі амаль праз 100 гадоў установілі помнік тым, хто загінуў ад атрутных газаў у далёкім 1916-м

Пакуль у Смаргоні ўзводзіцца мемарыяльны комплекс памяці ахвяр Першай сусветнай вайны, з'яўляюцца адметныя пазнакі — часцей крыжы, зрэдку невялікія помнікі — і на іншых месцах. Напэўна, менш сімвалічных, але таксама важных. А можа, нават больш важных. Яны не такія велічныя і маштабныя. Пра іх, як і пра тыя месцы, амаль ніхто не ведае. А там, між іншым, спачываюць людзі, шмат людзей, якія загінулі ў Першую сусветную вайну. Палеглі за радзіму, за народ, а магчыма, і за нас з вамі...

Фотаздымак ваеннага ўрача Аляксандра Зусмановіча, зроблены ў 1916 годзе.

Так выглядае магіла ў Залессі сёння.

Часам пошукі невядомых магіл той вайны ператвараюцца ў цікавыя расследаванні. На гэты раз штуршком да дзеяння стаў фотаздымак, які трапіў на вочы вядомаму журналісту і фатографу Уладзіміру Багданаву — чалавеку, які шмат гадоў займаецца тэмай Першай сусветнай вайны і па праве лічыцца экспертам па пахаваннях гэтага перыяду. Фота ваеннага ўрача Рускай імператарскай арміі Аляксандра Зусмановіча, зроблена ў 1916 годзе. На ім адлюстравана свежая магіла перад драўлянай царквой, крыж, на зваротным баку — разборлівы надпіс: «Брацкая магіла загінулых ад удушлівых газаў, пушчаных праціўнікам супраць ст. Залессе. 1916 г.».

— Гэта была адна з першых найманейшых газавых атак ворага, — расказвае Уладзімір Багданаў. — Яна адбылася ў ноч з 1-га на 2-е жніўня 1916 года (19-20 ліпеня па старым стылі). Салдаты рускай арміі былі не падрыхтаваны. Загінула крыху больш за 280 вайскоўцаў, са строю было выведзена 3846 чалавек. Сёння вядома звыш 70 імёнаў тых, хто загінуў. Ахвяры той трагедыі служылі ў Каўказскай грэнадзёрскай дывізіі. Сярод салдат гэтай дывізіі, дарэчы, быў і Міхаіл Зошчанка.

Вось што вядомы пісьменнік пазней расказваў пра гэта ў сваёй кнізе «Перад узыходам сонца»: «Я стаю ў акопах і з цікаўнасцю пазіраю на развалiны мястэчка. Гэта — Смаргонь. <...>. Цямнее. Я вяртаюся ў сваю зямлянку. Душная ліпеньская ноч. Зняўшы фрэнч, я пішу лісты. Ужо каля гадзіны. Трэба класціся. Я хачу пагнаць веставога. Але раптам чую нейкі шум. Шум нарастае. Я чую тупат ног. І бразгаценне кацялкоў. Але крыкаў няма. І няма стрэлаў. Я выбягаю з зямлянкі. І раптам салодкая ўдушлівая хваля ахоплівае мяне. Я крычу: «Газы!.. Маскі!..» І кідаюся ў зямлянку. Там у мяне на цвіку вісіць процівагаз. Свечка згасла, калі я імкліва забег у зямлянку. Рукой я намацаў процівагаз і стаў нацягваць яго. Забыўся адкрыць ніжнюю затычку. Задыхаюся. <...>. Мы ляжым чатыры гадзіны. Пачынае святлець. Цяпер відаць, як ідуць газы. Гэта не суцэльная сцяна. Гэта клуб дыму шырынёй у дзесяць сажняў. Ён павольна насоўваецца на нас, падганяючыся ціхім ветрам. Можна адысці направа або налева — і тады ён праходзіць міма, не закранаючы. Цяпер не страшна. <...>. Я раптам бачу, што многія салдаты ляжаць мёртвыя. Іх — большасць. Іншыя ж стогнуць і не могуць падняцца. Я чую гукі ражка ў нямецкіх акопах. Гэта атрутнікі іграюць адбой. Газавая атака скончана. Абапіраючыся на палку, я цягнуся ў лазарэт. На маёй хустцы кроў ад жудасных ванітаў. Я іду па шашы. Я бачу пажоўклую траву і сотню здохлых вераб'ёў, якія звaліліся на дарогу».

Сапраўды, у працэнтных адносінах страты былі каласальнымі. Толькі ахвяр удушлівай атакі магло быць менш. Справа ў тым, што рускія салдаты яшчэ добра не ведалі, што гэта такое, і, натуральна, не былі падрыхтаваны. Гэта ўжо потым яны смялей у падобных выпадках выкарыстоўвалі марлевыя павязкі, спецыяльныя маскі, процівагазы.

«Першапачатковы пах газавага воблака быў прыемны: пахла яблыкамі, садавіной, скошаным сенам; першыя ўдыхі газу не выклікалі непрыемнага адчування, і нязвыклыя да газавых нападаў салдаты не спяшаліся да сваіх процівагазаў», — пісаў потым у рапарце генерал-лейтэнант Каўказскай грэнадзёрскай дывізіі Дзмітрый Парскі.

Я ўжо сыходзіў і проста для ачысткі сумлення паказаў яму фотаздымак. І трэба ж такое! Ён не толькі ведаў пра царкву, але і добра яе памятаў.

Пасля таго, як Уладзімір Багданаў абмеркаваў фотаздымак з аднадумцамі, ён пачаў збірацца ў дарогу. «Быў фотаздымак, канкрэтная падзея, знакавая ў гісторыі Першай сусветнай вайны, вядомыя некаторыя імёны пахаваных. Стала цікава паглядзець на гэтае месца, даведацца, дзе дакладна знаходзіцца магіла», — так думаў фатограф перад падарожжам.

Толькі на вясковых могілках у Залессі брацкай магілы не знайшлося і блізка. Больш за тое, пра яе нават нічога не нагадвала. Ніякіх зачэпак. Аднак яны ўсё ж такі з'явіліся. Праўда, перш Уладзіміру Багданаву прыйшлося неадноўчы абысці могілкі, каб хаця б знайсці прыкладнае месца, дзе ў савецкія часы стаяла драўляная царква, якая і была б арыенцірам у далейшым пошуку. Не знайшоў. І толькі калі ён, расчараваны, ужо збіраўся з'язджаць, пашчасціла на сустрэчу.

— Гэта быў мясцовы жыхар Аляксандр Броўка, яго хата знаходзіцца амаль каля могілак, — успамінае Уладзімір Анатольевіч. — Я ўжо сыходзіў і проста для ачысткі сумлення паказаў яму фотаздымак. І трэба ж такое! Ён не толькі ведаў пра царкву, але і добра яе памятаў. Аляксандр Канстанцінавіч паказаў, дзе яна стаяла, як была павернута.

І тут высветлілася, што пусты прамавугольнік, на які Уладзімір Багданаў адразу звярнуў увагу, раней з'яўляўся фрагментам цэнтральнай алеі могілак, якая вяла ад старой дарогі да царквы. Храм стаяў бокам да алеі і знаходзіўся зусім недалёка ад цаглянай каплічкі, якая стаіць і сёння. Такім чынам, на яе і трэба было арыентавацца. Вядома, лепш было б на царкву, але ад яе, на жаль, не засталося і следу.

Аляксандр Броўка паказаў у траве шэраг камянёў, якія ўтваралі фундамент былой царквы. Па іх стала зразумела, што храм быў невялікі, а частка месца, дзе ён стаяў, ужо занята магіламі. Пачалі шукаць разам: разглядваючы то фотаздымак, то мясцовасць. Аднак усё роўна не было ніякіх зачэпак. Пакуль Броўка не паказаў на невялікі помнік у металічнай агароджы, які адлюстраваны і на фотаздымку.

— Я на гэта нават увагі не звярнуў, шукаў толькі камяні-помнікі, — прызнаецца Уладзімір Багданаў. — А сапраўды, на старым фота напалову схаваная за дрэвам, амаль упрытык да царквы «прыклеілася» агароджа з маленькім абеліскам. Прыгледзеліся: помнік стаіць на пастаменце з трох плоскасцяў — такі ж, як і на могілках цяпер. Пасля таго, як з'явіліся два пункты каардынатаў, усё астатняе аказалася зусім простым. Варта было адысці на прыкладнае месца, адкуль амаль 100 гадоў таму мог здымаць Зусмановіч, і выявіліся яшчэ аб'екты, якія выдатна ўпісаліся ў наш «пазл». Неўзабаве стала зразумела: мы знайшлі месца, дзе была брацкая магіла.

Ахвяры той трагедыі служылі ў Каўказскай грэнадзёрскай дывізіі. Сярод салдат гэтай дывізіі, дарэчы, быў і Міхаіл Зошчанка.

Пустое месца, даўно парослае травой, вылучалася з агульнай карціны. Больш позніх пахаванняў там не было. «Відаць, мясцовыя жыхары ведалі, хто там пахаваны, таму і не чапалі гэты ўчастак могілак», — мяркуе Уладзімір Анатольевіч.

Аднак пустым гэтае месца было да нядаўняга часу. Сёння там сучасны помнік: каменны фундамент, крыж. Здаецца, так усё і было. І толькі члены беларускага дабрачыннага фонду памяці Першай сусветнай вайны «Крокі», куды і ўваходзіць Уладзімір Багданаў, а таксама мясцовыя жыхары ведаюць, якія намаганні ім давялося прыкласці, каб салдаты Вялікай вайны, нарэшце, набылі свой дом. Няхай і на тым свеце.

— Крыж, які цяпер стаіць на магіле, зроблены з дуба ў мастацкім афармленні мастака Барыса Цітовіча, — расказвае член фонду «Крокі», адзін з удзельнікаў стварэння помніка Андрэй Янчуковіч. — Паколькі гэта масавае пахаванне, помнік павінен быў адпавядаць колькасці тых, хто тут спачывае. І, здаецца, мы справіліся з пастаўленай задачай. Ён хоць і не зусім вялікі, але ўражвае. На чорным карэльскім граніце белымі літарамі паўторaны надпіс, які быў на старым крыжы: «Тут спачываюць грэнадзёры 14-га Грузінскага, 15-га Тыфліскага, 16-га Мінгрэльскага і ніжэйшыя чыны 6-га пяхотнага Лібаўскага палка, атручаныя газамі 20 ліпеня 1916 г.».

Месца памяці ствараласа літаральна на дабрачыннай аснове. Хто чым мог, тым і дапамагаў — як той казаў, крыха да крыхі. Да гэтай справы падключыліся і мясцовыя жыхары: адны забяспечылі спецыялістамі, іншыя дапамаглі з транспартам, матэрыяламі. Разам з імі ва ўкладцы пліты, устаноўцы помніка ўдзельнічалі і школьнікі. «Якраз у такіх агульных справах і праяўляецца глыбінная хрысціянская сутнасць нашага народа. Вельмі важна, што і моладзь неабыякавая да нашай гісторыі. Бо ўся гэтая праца робіцца менавіта для падрастаючага пакалення, якое не павінна забываць сваю гісторыю», — мяркуе Андрэй Янчуковіч.

Падчас устаноўкі помніка на брацкай магіле загінулых ад удушлівых газаў пад Смаргонню.

…Пакуль сярод нас ёсць ініцыятыўныя людзі, мы можам быць спакойнымі. Але крыўдна, што гэта на сённяшні дзень патрэбна толькі нам, беларусам. А ў падобных невядомых магілах ляжаць і выхадцы з усёй былой вялізнай імперыі. І як бы мы ні хацелі, тая вайна не скончыцца, пакуль не будзе годна пахаваны яе апошні салдат.

Вераніка КАНЮТА.
Фота Уладзіміра БАГДАНАВА

ІСЦІНА АБ ВЯЛІКАЙ ВАЙНЕ: СЕРБСКІ ПОГЛЯД

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Як падкрэсліла аўтар, сёння сусветная еўрапейская гістарыяграфія ўсё яшчэ не можа крытычна і паўнавартасна ахапіць і сінтэзаваць усё тое, што ў апошнія гады было напісана і сказана аб Вялікай вайне. «І на гэта ў першую чаргу ўплывае рэвізіянісцкая гістарыяграфія, адна з мэт якой — змяніць уяўленне людзей аб прычынах і перадумовах пачатку Першай сусветнай вайны, — мяркуе Міра Радоевіч. — І гэта адбываецца не першы раз. Яшчэ з 1918 года Германія імкнулася даказаць, што не яна вінаватая ў пачатку Вялікай вайны. Але ўпершыню краіны-пераможцы таксама падключаюцца да працэсу перагляду. Больш ніколі, як сёння, гістарыяграфія не знаходзілася пад уплывам палітыкі, асабліва той яе часткі, якая тычыцца Першай сусветнай вайны. Гэта стала адной з самых галоўных прычын, па якой мы ўзяліся за напісанне кнігі».

— Як вядома, гэтая вайна пачыналася не як сусветная (яна называлася Вялікай вайной), і толькі пазней яе наступствы паказалі, што маюць сусветны ўзровень, — зазначыў **пасол Сербіі ў Рэспубліцы Беларусь Велька КАВАЧАВІЧ**. — Для гістарычнай навукі 100 гадоў — дастатковы час, каб ісціна аб кожнай падзеі была адкрыта. Зараз мы з'яўляемся сведкамі таго, што прадпрымаюцца спробы фальсіфікацыі гістарычных даных і абвінавачвання пэўных краін у ініцыяцыі Першай сусветнай вайны.

— На працягу многіх гадоў ствараўся стэрэатып, што Сербія вінаватая ў развязванні Першай сусветнай вайны, — працягвае **перакладчык кнігі на рускую мову, беларускі літаратуразнаўца, славіст Іван ЧАРОТА**. — Гэта ўжо як аксіёма. Так, выстрал Гаўрылы Прынцыпа — перадумова, але не прычына вайны. Уся сусветная грамадскасць трапіла ў пэўны змрок, дэманізуючы сербаў. Сербія, маўляў, ва ўсім вінаватая. Кніга якраз пераадольвае гэтыя стэрэатыпы. І, канешне, з'яўляецца антытэзай рэвізіянісцкай гістарыяграфіі.

Выданне першапачаткова не было арыентавана толькі на сербскіх чытачоў. Таму яно перакладзена на сербскую, рускую, англійскую і нямецкую мовы. Той, хто хоча даведацца ўсю праўду аб той вайне, можа пазнаёміцца ў кнізе з яе прычынамі, фактамі, падзеямі. Прычым размова ідзе аб дакладных звестках, заснаваных не толькі на сербскіх крыніцах, але і на практычна ўсіх сусветных крыніцах па тэме. А гэта тысячы і тысячы дакументаў.

Прэзентацыя кнігі ўжо адбылася ў Каралеўскім цэнтры ў Аўстраліі, у Вене і Браціславе. «Мы хацелі напісаць кнігу, якая будзе звернута да простага чытача. У нас няма ілюзій і амбіцый, што мы зменім ход развіцця рэвізіянісцкай гістарыяграфіі. Аднак мы вельмі будзем рады, калі пра тое, што напісана аб Сербіі ў Вялікай вайне, даведаецца як мага больш чытачоў», — прызнаецца Міра Радоевіч.

— Хацелася б, каб дзякуючы гэтай кнізе мы лепш разумелі адно аднаго і сталі яшчэ больш блізкімі, — лічыць **старшыня «Бялградскага форуму за мір раўнапраўных», былы міністр замежных спраў Югаславіі Жывадзін ЁВАНАВІЧ**. — Адзначаючы разам стагоддзе пачатку Першай сусветнай вайны, я рады сказаць, што мы адзначаем і 20-годдзе дыпламатычных адносін паміж Сербіяй і Беларуссю. Гэта вялікі поспех, што сербская гістарыяграфія прысутнічае ў многіх рэгіёнах свету, на вялізнай прасторы, дзе размаўляюць на рускай мове.

Цяперашняя сітуацыя ў свеце нагадвае сітуацыю напярэдадні Першай сусветнай вайны. — Сёння гонка ўзбраенняў нават на вышэйшым узроўні, чым перад Вялікай вайной, — упэўнены Жывадзін Ёванавіч. — І калі мы не будзем нешта рабіць, то мір не гарантаваны. Трэба змагацца, каб актывізаваліся ўсе механізмы для ўладжвання канфліктаў. І гэтая кніга якраз садзейнічае мірнаму вырашэнню праблем, уключаючы канфлікт ва Украіне.

Вераніка КАНЮТА.
Фота Аляксандра ШАБЛЮКА.

■ Незвычайнае побач

САСНА-ПОМНІК

У Бялыніцкім раёне ёсць дрэва, на якім захаваўся надпіс ваенных часоў

Гэтыя мясціны, дзе на плошчы звыш 3,5 тысячы гектараў раскінуўся Заазерскі гідралагічны заказнік, і насамрэч таямнічыя. Турыстам тут ёсць што паглядзець. Тое ж этнічнае капішча з каменнымі крыжамі проста ў лесе. Рытуальнае месца «ля трох бяроз», дзе язычнікі пакланяліся багіні Маржане — жонцы Сварога. Унікальная сістэма рэк і азёраў з багатай флорай і фаўнай. Калі б дрэвы маглі гаварыць, яны, напэўна, паведалі б шмат цікавых гісторый аб гэтым краі.

Тая самая сасна.

Магілёўскай настаўніцы Наталлі Лісоўскай, якая прыехала ў вёску Заазер'е да сваякоў, пашчасціла пачуць адну з іх. Калі яна з роднымі збірала ў лесе грыбы, ім на вочы трапілася сасна, дзе роўнымі літарамі нечая рука вывела: «Вечная памяць партызану-чырвонаармейцу Балуеву М.П.» Калі верыць пазначанай на дрэве даце, то зроблена яна была больш за 70 гадоў таму...

— Мы не прайшлі міма яе толькі па нейкай шчаслівай выпадковасці, — кажа Наталля. — Сасна знаходзіцца ў баку ад дарогі, кара на ёй амаль уся абсыпалася. І гэты надпіс нас вельмі ўразіў.

Родны дзядзька, які добра ведае тутэйшы лес, нічога толкам патлумачыць не змог. Але ў Заазер'і знайшлася жанчына, якая прыадкрыла заслону таямніцы. Вольце Клапоцкай, калі пачалася вайна, споўнілася ўсяго 9 гадоў. Вёска была вялікая, але немцы амаль усю яе спалілі ў ліпені 1941-га. Перыядычна яны праводзілі аблавы: у мясцовых лясах быў партызанскі атрад. У карных аперацыях выкарыстоўвалі жыхароў, прымушаючы іх ісці жывым ланцугом. І партызаны павінны былі біць па сваіх, каб выратавацца. Пра сасну, дзе чырвонаармейцы пахавалі свайго таварыша, Вольга Данілаўна чула ад старэйшых жанчын. А пасля вайны нават прысутнічала на перапахаванні гэтага байца на могілках у Заазер'і. Вельмі яе ўразіла, калі ў зямлю апускалі маленькую чырвоную скрыню з астанкамі.

Падрабязнасці той ваеннай гісторыі Наталля Лісоўская знайшла ўжо праз сваіх знаёмых у Маскве. У адным з тамоў кнігі «Памяць» Маскоўскай вобласці ёсць кароткі запіс аб тым, што Мікалай Балуеў нарадзіўся ў 1922 годзе ў вёсцы Нова Шчолкаўскага раёна. У 1941-м у складзе асобнай баявой групы галоўнага разведвальнага ўпраўлення Генеральнага штаба быў адпраўлены на фронт. Загінуў у баі 20 кастрычніка 1942 года і пахаваны ў вёсцы Заазер'е Бялыніцкага раёна Магілёўскай вобласці.

З прэзентацыі, якая знайшлася пра байца у інтэрнэце, Наталля даведалася, што Мікалай быў старэйшым сынам у сям'і Балуевых і пасля 7 класаў пайшоў працаваць токарам на завод «Радыёлямпа». У пачатку вайны ён быў мабілізаваны і па рэкамендацыі Маскоўскага Камітэта камсамола накіраваны ў разведшколу. Пасля вучобы ў складзе асобай баявой групы галоўнага разведупраўлення Генштаба яго адправілі ў тыл ворага. Пры садзейнічанні партызан група Балуева прасочвала месцы дыслакацыі немцаў і іх перамяшчэння па чыгуначных дарогах.

Аб тым, як загінуў Мікалай, родныя Балуева даведаліся ад школьнікаў Заазерскай школы. У 1984 годзе яго маці звярнулася ў фразінскую школу №1, дзе вучыўся сын, а адтуль яе запыт адправілі ў Беларусь. У лісце, які атрымала жанчына, паведамлялася, што падчас блакады, якую рабілі немцы ў 1942 годзе, Мікалай знаходзіўся ў дазоры. Ён залез на сасну, прывязаўся да яе рамянямі і вёў па ворагу агонь. Яго знайшла нямецкая аўчарка, і хлопца расстралялі на гэтым жа дрэве...

На жаль, Заазерскай школы ўжо даўно не існуе. І гісторыя аб разведчыку Балуеву, лічы, забылася. Не вядомы дакладна і нумар таго партызанскага атрада, дзе ён ваяваў. Настаўніца гісторыі Эсьмонскага комплексу дзіцячы сад — сярэдняя школа Таццяна Шэстак мяркуе, што гэта быў 121-ы ці 21-ы атрад. Інфармацыі пра Мікалая Балуева ў школьным музеі, на жаль, няма, але ў раёне існуе тапонім «Балуева сасна». Недалёка ад гэтага дрэва знаходзіцца балота, дзе растуць журавіны. Мясцовыя так і кажуць «пайсці ў ягады да Балуевай сасны».

Крыўдна, што пра разведчыка амаль ніхто не ведае. Магчыма, не выпадкова гэта сасна трапіла на вочы настаўніцы з Магілёва. Яна збіраецца разам са сваімі вучнямі правесці даследчую работу і выйсці на школу, дзе вучыўся Мікалай Балуеў.

Дарэчы, у інтэрнэце мне выпадкова трапілася на вочы паведамленне. «У 1941 годзе 10 выпускнікоў школы №1 (тады школы №9) г.Фразіна Маскоўскай вобласці пайшлі на фронт і не вярнуліся. Сярод іх быў Мікалай Пятровіч Балуеў. У школе ёсць музей баявой славы, дзе захоўваюцца матэрыялы аб выпускніках ваенных гадоў. У маі 2011 года ў школе адбылася сустрэча з унукамі Мікалая Балуева. Яны перадалі яго лісты да сваёй маці і асабістыя рэчы. І былі вельмі ўдзячны за тое, што іх гераічнага дзеда памятаюць.

Нэлі ЗІГУЛЯ

Вольга Клапоцкая адна з нямногіх, хто памятае тую ваенную гісторыю.

Наталля Лісоўская каля абеліска, дзе перапахаваны Мікалай Балуеў.

■ Філатэліст

20 ГАДОЎ НА ШЛЯХУ СУПРАЦОЎНІЦТВА

Міністэрства сувязі і інфарматызацыі Рэспублікі Беларусь 15 лістапада выпускае ў абарачэнне новы паштовы блок, прысвечаны 20-годдзю ўсталявання дыпламатычных адносін паміж Рэспублікай Беларусь і Рэспублікай Сербія. Усебаковае супрацоўніцтва паміж гэтымі краінамі заснавана на традыцыйна блізкіх духоўных і культурных сувязях двух народаў, славянскай агульнасці і шматлікіх кантактах. У дзень выпуску паштовага блока на паштамце сталіцы адбудзецца спецыяльнае гашэнне на канверце «Першы дзень».

■ Кнігарня

Да зорак вядуць... энцыклапедысты

У Доме Масквы ў Мінску адбылася прэзентацыя кнігі Андрэя Герашчанкі «Шлях да зорак: Малая энцыклапедыя касманаўтыкі», якая пабачыла свет у «Беларускай Энцыклапедыі імя Петруся Броўкі».

Праект гэты падаецца не выпадковым у рабоце вядучага кніжнага выдавецтва краіны. У ёмістай па змесце, насычэнні інфармацыяй кнізе — расповед пра будову Сусвету, гісторыю развіцця і дзень сённяшні касманаўтыкі, пра тых ураджэнцаў Беларусі, якія засведчылі сябе ў асваенні касмічных прасцяраў. Багацце фактычнага, навукова-пазнавальнага матэрыялу, прадстаўленага ў своеасаблівай энцыклапедыі, адрасаванай найперш юнаму чытачу, уражвае. Няма ніякіх сумненняў, што кніга патрэбна і ў школе, і ва ўсіх бібліятэках краіны. Нельга не сказаць, што выданне навукова-пазнавальнай літаратуры, адрасаванай дзецям, — адзін з выразных напрамкаў у рабоце выдавецтва «Беларуская Энцыклапедыя імя Петруся Броўкі».

Сяргей ШЫЧКО.

Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»

ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА

Наименование	Характеристика
ЛОТ 1	
Наименование объекта, краткая характеристика, адрес расположения	Капитальное строение, инв. № 422/С-37393 (назначение – здание административно-хозяйственное, наименование – здание конторы старой бойни), площадью 206,4 кв.м, расположенное по адресу: г. Щучин, ул. К. Маркса, 1А.
Земельный участок, на котором расположен объект	Кадастровый номер 425850100003000501, площадью 0,0885 га (назначение – земельный участок для обслуживания здания конторы старой бойни) по адресу: г. Щучин, ул. К. Маркса, 1А. Примечание – земельный участок имеет ограничения (обременения) прав в использовании: земельный участок, расположенный в охранной зоне линий электропередачи, код – 13,2, площадью – 0,0022 га
Начальная цена продажи	125 000 000 (сто двадцать пять миллионов) белорусских рублей с учетом НДС
Сумма задатка	6 250 000 (шесть миллионов двести пятьдесят тысяч) белорусских рублей
ЛОТ 2	
Наименование объекта, краткая характеристика, адрес расположения	Капитальное строение, инв. № 422/С-34930 (назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ, наименование – здание каменного склада), площадью 404,4 кв.м, расположенное по адресу: г. Щучин, ул. Советская, 17.
Земельный участок, на котором расположен объект	Кадастровый номер 425850100001000190, площадью 0,0962 га (назначение – земельный участок для реконструкции, содержания и обслуживания здания склада) по адресу: г. Щучин, ул. Советская, 17. Примечание – земельный участок имеет ограничения (обременения) прав в использовании: земли, находящиеся в охранных зонах линий электропередачи, код – 6, площадью – 0,0062 га
Начальная цена продажи	308 000 000 (триста восемь миллионов) белорусских рублей с учетом НДС
Сумма задатка	15 400 000 (пятнадцать миллионов четыреста тысяч) белорусских рублей
ЛОТ 3	
Наименование объекта, краткая характеристика, адрес расположения	- капитальное строение, инв. № 422/С-35314 (назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ, наименование – склад), площадью 752,3 кв.м, расположенное по адресу: г. Щучин, ул. 17-е Сентября, 42. - капитальное строение, инв. № 422/С-35315 (назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ, наименование – лаборатория), площадью 62,8 кв.м, расположенное по адресу: г. Щучин, ул. 17-е Сентября, 42, корп. 1. - капитальное строение, инв. № 422/С-35316 (назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ, наименование – склад), площадью 52,2 кв.м, расположенное по адресу: г. Щучин, ул. 17-е Сентября, 42, корп. 2. - капитальное строение, инв. № 422/С-35317 (назначение – здание специализированное коммунального хозяйства, наименование – насосная), площадью 11,9 кв.м, расположенное по адресу: г. Щучин, ул. 17-е Сентября, 42, корп. 3. - капитальное строение, инв. № 422/С-35318 (назначение – здание специализированное автомобильного транспорта, наименование – гараж-мастерская), площадью 205,9 кв.м, расположенное по адресу: г. Щучин, ул. 17-е Сентября, 42, корп. 4. - капитальное строение, инв. № 422/С-35321 (здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ, наименование – склад), площадью 279,8 кв.м, расположенное по адресу: г. Щучин, ул. 17-е Сентября, 42, корп. 5. - зеленые насаждения, расположенные по адресу: г. Щучин, ул. 17-е Сентября, 42.
Земельный участок, на котором расположен объект	Кадастровый номер 425850100003000374, площадью 0,7492 га (назначение – земельный участок для содержания и обслуживания строений и построек хлебопекарни) по адресу: г. Щучин, ул. 17-е Сентября, 42.
Начальная цена продажи	3 000 000 000 (три миллиарда) белорусских рублей с учетом НДС
Сумма задатка	150 000 000 (сто пятьдесят миллионов) белорусских рублей
Продавец	Щучинский филиал Гродненского областного потребительского общества, 231513, г. Щучин, ул. Пушкина, 26.
Организатор торгов	Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Гродно ул. Врублевского, д. 3, каб. 209, тел. 41-98-32
Условия аукциона	Аукцион без условий
Условия оплаты	По договоренности сторон
Срок заключения договора купли-продажи	Не позднее 5 рабочих дней с момента подписания протокола аукционных торгов
Номер р/с для перечисления задатка	Р/с 301 257 917 0017 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской области БИК 153001739, УНП 500833225
Аукцион состоится 22 декабря 2014 г. в 11.00 по адресу: г. Щучин, ул. Пушкина, 26.	

К участию в аукционе допускаются физические лица, юридические лица и индивидуальные предприниматели, подавшие организатору аукциона в названный в извещении срок заявление с приложением необходимых документов и внесшие в установленном порядке на указанный в извещении текущий (расчетный) счет сумму задатка, получившие билеты участников аукциона с указанием даты регистрации заявления и заключившие с организатором аукциона соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона.

Для участия в аукционе в указанный в извещении срок в Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» подается заявление на участие в аукционе со следующими документами:

заверенная банком копия платежного поручения о внесении суммы задатка на текущий (расчетный) счет, указанный в извещении;

юридическим лицом – резидентом Республики Беларусь – копия документа, подтверждающая государственную регистрацию юридического лица;

индивидуальным предпринимателем – документ, подтверждающий государственную регистрацию индивидуального предпринимателя, и его копия, которая заверяется организатором аукциона;

юридическим лицом – нерезидентом Республики Беларусь – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть подготовлена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения; документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с удостоверенным переводом на белорусский или русский язык.

При подаче документов на участие в аукционе организатору аукциона предъявляются:

представителем юридического лица, индивидуального предпринимателя – доверенность (документ, подтверждающий полномочия должностного лица) и документ, удостоверяющий личность этого представителя;

физическим лицам – документ, удостоверяющий личность физического лица;

представителем физического лица – доверенность и документ, удостоверяющий личность представителя.

Прием заявлений на участие в аукционе со всеми необходимыми документами заканчивается в установленные организатором аукциона день и время, указанные в извещении. Заявления, поступившие после установленного срока, не рассматриваются. Сроком поступления заявления является дата его регистрации в журнале регистрации заявлений на участие в аукционе.

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время, но не позднее чем за 3 календарных дня до назначенной даты проведения аукциона, о чем организатором аукциона извещаются участники аукциона.

В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов. Если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним лицом, предмет аукциона продается этому лицу при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 процентов.

Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, каб. 209, с 8.30 до 17.30 (понедельник – четверг) и с 8.30 до 16.30 (пятница).

Последний день приема заявлений – 16 декабря 2014 г. до 15.00.

Телефон для справок: 41-98-32 – Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки».

Полисы страховой компании ЗАСО «Промтрансинвест» по обязательному страхованию гражданской ответственности владельцев транспортных средств на территории Республики Беларусь серии ВР №№ 5410992, 5410993, 5410994, 5410995, карта международного моторного страхования (страховой сертификат «Зеленая карта») серии BY/07 № 09264582, квитанции о приеме наличных денежных средств (страховых взносов) формы 1-СУ серии КС №№ 8495831, 8495832, 8495833, 8495834, 8495835 **считать недействительными.** УНП 100357923

ФИЛИАЛ «ЦЕНТР «БЕЛТЕХИНВЕНТАРИЗАЦИЯ» ИЗВЕЩАЕТ:

28 ноября 2014 г. в 11.00 состоятся повторные открытые аукционные торги по продаже имущества, принадлежащего на праве собственности ОАО «Бобруйск АТЭП» (продавец торгов) в составе Лота № 1:

Лот № 1 (предмет торгов): Кап. строение с инв. ном. 710/С-51596 (площадка для подготовки водителей автотранспортных средств (автодром)), пл. 4416,0 кв.м; кап. строение с инв. номером 710/С-51597 (забор кирпичный), пл. 540,0 кв.м

Адрес предмета торгов:	г. Бобруйск, Могилевская обл., ул. Орджоникидзе, 100к
Продавец (право собственности)	Открытое акционерное общество «БобруйскАТЭП», УНП 700071974, ОКПО 058935867000, 213830, г. Бобруйск, ул. Орджоникидзе, 100, р/с 3012259180015(BYB), 3012259185052(USD,EUR) в РКЦ № 24 в г. Бобруйск филиала ОАО «Белагрпромбанк» Могилевское областное управление
Организатор торгов	Филиал «Центр «Белтехинвентаризация», УНП 102353509, ОКПО 55484006, 220034, г. Минск, ул. Чапаева, д. 4, к. 222, (р/с 3012105618108 в Региональной Дирекции № 700 ОАО «БПС-Сбербанк», код 153001369)
Место проведения торгов и подачи документов	г. Бобруйск, ул. Чонгарская, 54, в здании Бобруйского управления филиала «Центр «Белтехинвентаризация»
Информация о земельном участке	Предмет торгов расположен на земельном участке с кадастровым номером 741000000007002152, площадь – 0,4852 га, по адресу: ул. Орджоникидзе, 100к, г. Бобруйск, правовой режим – право постоянного пользования
Начальная цена предмета торгов	336 520 080 рублей с учетом НДС, размер задатка – 40 000 000 рублей, шаг аукциона – 5%
Номер расчетного счета для перечисления задатка	Получатель платежа – Филиал «Центр «Белтехинвентаризация»: р/с 3012105618108 в Региональной Дирекции № 700 ОАО «БПС-Сбербанк», код 153001369, г. Минск, пр. Машерова, 80, УНП 102353509
Характеристика предмета торгов	
площадка для подготовки водителей автотранспортных средств (автодром), пл. 4416 кв.м, 1987 года ввода в экспл., составные части: покрытие – асфальтобетон, основание – щебень; **забор кирпичный сплошной**, 1987 года ввода в экспл., длина 219 м, составные части: столбы – кирпичные, цоколь – бетонный	
Условия продажи	Без условий
Срок заключения договора купли-продажи	В течение 20 рабочих дней с даты подписания протокола о результатах аукционных торгов
Срок и условия оплаты за предмет торгов	Определяются по согласованию победителя торгов (претендента на покупку) с продавцом при заключении договора купли-продажи, возможна рассрочка платежа
Срок подачи документов для участия в торгах, осмотра предмета торгов и внесения задатка	по 25 ноября 2014 г. включительно до 17.00
Победитель (Претендент на покупку) возмещает затраты на организацию и проведение торгов не позднее 3(трех) рабочих дней с момента подписания протокола о результатах аукционных торгов на основании счета-фактуры, выдаваемой Организатором торгов.	

**Более подробная информация об условиях участия в торгах, перечне документов, прилагаемых к заявлению на участие в торгах, опубликована в газете «Звязда» от 26 сентября 2014 г.

Получить дополнительную информацию о продаже имущества можно по адресу: г. Бобруйск, ул. Чонгарская, 54 или связавшись с нами по телефонам: 8 (0225) 72 01 32, 72 13 93, 8 (044) 710 50 85 в рабочие дни с 8.30 до 17.30.

ДОПОЛНЕНИЕ К ПРОЕКТНОЙ ДЕКЛАРАЦИИ,

опубликованной 25 февраля 2014 г. в газете «Звязда» по объекту Многоквартирный жилой дом неповышенной комфортности № 3 по генплану с помещениями общественного назначения, подземной автостоянкой в квартале улиц Одоевского, Бельского, Пономаренко, П.Глебки (продолжение) в г. Минске.

Общество с ограниченной ответственностью «Антасам» информирует о дополнении к проектной декларации объекта долевого строительства, опубликованной в газете «ЗВЯЗДА» № 35 от 25 февраля 2014 г.:

Внести следующие дополнения:

Абзац «Для привлечения физических, юридических лиц и индивидуальных предпринимателей к строительству по договорам создания объекта долевого строительства предлагаются:» дополнить:

5 (Пять) машино-мест в подземной гараж-стоянке. Цена 1 машино-места общей площади помещений общественного назначения в текущих ценах на момент опубликования проектной декларации составляет 188 475 000 (Сто восемьдесят восемь миллионов четыреста семьдесят пять тысяч) белорусских рублей эквивалентной 17 500 долларам США по курсу, установленному Национальным банком Республики Беларусь на 18 ноября 2014 г. УНП 100727641

ОБЪЯВЛЕНИЕ О ТОРГАХ

Наименование (описание) имущества и его стоимость	**ЛОТ № 1.** **Объект недвижимости: капитальное строение с инвентарным номером 200/С-85128, площадью 1067 кв.м, назначение – здание специализированное животноводства, наименование – здание коровника;** **- Недвижимые улучшения – составные части и принадлежности к капитальному строению:** **Уборная дощатая, площадью 1 кв.м;** **Забор – железобетонные плиты высотой 2 м, протяженностью 128 м, общей стоимостью 335 000 000 рублей.**
Собственник (владелец) имущества	ОАО «Витрайбыт», УНП 300064006, юридический адрес: Витебская область, Витебский район, Вороновский с/с, аг. Вороны, ул. Ленинская, 36а
Местонахождение имущества	Витебская область, Витебский район, Октябрьский с/с, 18, восточнее д. Шапуры. По всем вопросам, касающимся осмотра имущества, обращаться к юристу Гарастюк Екатерине Петровне (8-033-3061901)
Наличие обременений	Нет
Место (адрес), дата и время проведения торгов	Отдел принудительного исполнения управления принудительного исполнения главного управления юстиции Витебского облисполкома г. Витебск, ул. «Правды», 32 04 декабря 2014 года в 14.00
Справочная информация об организаторе торгов	Отдел принудительного исполнения управления принудительного исполнения главного управления юстиции Витебского облисполкома 210029, г. Витебск, ул. «Правды», д. 32, каб. 322 http:// vitebsk.court.by Судебный исполнитель Ланцунцевич Сергей Александрович, тел. (0212) 600069 Начальник отдела Бураков Игорь Вячеславович, тел. (0212) 60 09 75
Условия и порядок проведения торгов	1. Подать письменную заявку на участие в торгах и дать подписку об отсутствии препятствий для приобретения имущества, предусмотренных законодательством. 2. Внести задаток в размере 10 процентов от стоимости имущества на депозитный счет управления принудительного исполнения главного управления юстиции Витебского облисполкома № 3642903001066 филиала № 200 – Витебского областного управления ОАО «АСБ Беларусбанк», код 635, УНП 300002505 не позднее 14.00 03 декабря 2014 года. Минимальная величина первого шага торгов – 5% стоимости лота. В соответствии с пунктом 1 Указа Президента Республики Беларусь от 05.05.2009 № 232 «О некоторых вопросах проведения аукционов (конкурсов)» возмещение затрат на организацию и проведение торгов осуществляется участником, выигравшим торги.

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ОБЪЕКТОВ открытого акционерного общества «Управляющая компания холдинга «Агрокомбинат «Мачулищи»

Начальная цена продажи снижена на 20%.

Аукцион состоится 2 декабря 2014 г. в 15.00 по адресу: г. Минск, ул. Казинца, д. 4, оф. 411.

Наименование предмета аукциона	Лот № 1: Изолированное помещение (продовольственный магазин) по ул. Колесникова, 36 в г. Минске и торговое оборудование в количестве 220 ед.
Характеристика предмета аукциона	
Изолированное помещение (продовольственный магазин) (инв. № 500/D-708041651) общей площадью 856,7 кв.м, 2012 года постройки. **Торговое оборудование:** Агрегат сателлитный многокомпрессорный TPNT 2-S10.39Y (1 ед), весы CAS DB-150H (2 ед.), весы с печатью этикеток DIGI SM300 Pc пл.Ethernet со стойкой (1 ед.), весы электронные DS-788BN 15кг (2 ед.), весы электронные DIGI без стойки и со стойкой SM300P с плат. Ethernet (3+6=9 ед.), вешало для туш 1400*700*1800, 7 крюков, нерж., сталь (1 ед.), витрина холодильная среднетемпературная Неман 240 ВС (ВС-0,84-2,5-2-5-Х) – 1 ед; витрина холодильная низкотемпературная Неман 180 ОВ ВН ВН-,5-1,65-2-1Т– 1 ед, витрина холодильная низкотемпературная Неман 2 250 ОВ – (1 ед.), витрина холодильная пристенная среднетемпературная Неман 375П ВС – (2 ед.), витрина холодильная пристенная среднетемпературная Неман 188 П ВС – (1 ед.), витрина холодильная пристенная среднетемпературная фруктовая Неман 188 П ВВ – (1 ед.), витрина холодильная пристенная среднетемпературная фруктовая Неман 250П ВВ – (1 ед.), витрина холодильная среднетемпературная Неман 180 ВС – (1 ед.), витрина холодильная среднетемпературная кондитерская Неман 300 ВС – (1 ед.), витрина холодильная среднетемпературная Неман 240 ВС – (1 ед.), витрина холодильная среднетемпературная Неман 250 ВС – (1 ед.), витрина холодильная среднетемпературная Неман Неман УН 90 ВС-0,23-0,9-2-5Х – (1 ед.), воздухоохладитель WFBL 3-39E (3 ед.), воздухоохладитель WFBL 3-895E (4 ед.), горка винная 950*500*2200 мм (6 ед.), горка хлебная СК 100 комплект (4 ед.), горячий стол TW-450 (1 ед.), инф. киоск Shuttle SG-15c многолучевым сканером с Ethern (1 ед.), камера т/изоляционная холодильная низкотемпературная КХН-5,51 (4 ед.), камера т/изоляционная холодильная КХН- 7,71 (1960 * 2260 * 2200) 80 мм (1 ед.), камера т/изоляционная холодильная КХН-4,41 (1400*2000*2240) 100мм (1 ед.), камера т/изоляционная холодильная КХН-6,61 (1960 * 1960 * 2200) 80 мм (1 ед.), кассовый бокс КМ 100.Х.010.220.Т40 (4 ед.), конденсатор КСЕ 64С2, Германия. – (1 ед.), ларь морозильный ЕКТОР 56 SGL – (1 ед.), локальные вычислительные сети – (1ед.), мясорубка МИМ-350 (1 ед.), наружные сети электроснабжения (1 ед.), охранная сигнализация (1 ед.), пила для мяса КТ-210, Финляндия – (1 ед.), пожарная сигнализация – (1 ед.), прилавок глухой + калитка 1100*600*900 – (1 ед.), прилавок глухой 1100*600*900мм (1 ед.), принтер печати чеков А798 – (6 ед.), принтер печати этикеток DMX-E4205 DT (1 ед.), стерилизатор для ножей КТ-621 – (1 ед.), стол технологический с полипропиленовой столешницей – (1 ед.), считывающая кассовая система, состоит из: системного блока, клавиатуры, считыв. устройства, дисплей покупателя, монитор кассира ОТ84NBCD5503, денежный ящик, сканер chekWay ID3000 (4 ед.), считывающая кассовая система (АКМ-2) (состоит из: системного блока, клавиатуры № 2801М167607, считыв. устройства, дисплей покупателя, монитор кассира, денежный ящик) (2 ед.), телевизионная система видеонаблюдения (1 ед.), терминал сбора данных Mobile Compia M3 MC-6400 (1 ед.), турникет поворотный механический (1 ед.), фаршемешалка IP30M 07 CE 400/50/3, Италия – (1 ед.), холодильник-морозильник ХМ 4009-022 (2 ед.), шкаф метал. для одежды и сумок + доп. секция для шкафа МСК2944 на заклепках (3 ед.), шкаф холодильный DM105-S (R-134a) (ШХ -0,5 ДС) – (5 ед.), шкаф холодильный DM110-Sd-S (R-134a) (ШХ -1,0 купе) (6 ед.), шкаф холодильный СМ114-S (R-134a) – (2 ед.), шкаф холодильный СМ 107S (R-134a) (ШХ-0,7) – (2 ед.), жалюзи вертикальные – (49,25 кв.м), жалюзи горизонтальные (3,06 кв.м), камера хранения закрытая – (2 ед.), ковер грязесборный ВИКАС-ПЛАСТ (2 ед., общ. пл. 19,44 кв.м), коммутатор 5-PORT N-WAY FAST ETHERNET – (2 ед.), облучатель бактерицидный настенный ОБН-150 (1 ед.), овоскоп лабораторный ПКЯ-10 – (1 ед.), прилавок остекленный 1100*600*900 мм (3 ед.), роллета AR 41 1111*2345 мм в компл. с ПИМ и ЗАМКОМ – (1 ед.), рукосушитель JXG-208 -(3 ед.), стеллаж 700*600*1800 сер. Лайт каркас разборный уголок 40*40. 4 полки решетки. нерж.сталь (1 ед.), стеллаж 800*358*1875 (бук) (2 ед.), стеллаж кухонный 1500*600*1600 4 полки. стойки и полки оцинков. сталь СТСО (8 ед.), стеллаж овощной (1 ед.), стеллаж пристенный СК100 комплект (25 ед.), стеллаж СТН 12/6-4, 1200*580*1600 4 полки полностью нерж. сталь – (8 ед.), стол (колода) для разделки мяса, каркас стола нерж. сталь 500*500*800 (1 ед.), стол д/нарезки хлеба 400х600х900 (1 ед.), стол покупателя 900х600х900мм (4 ед.), стол производственный с полкой, полн. из нерж. стали и бортом – (15 ед.), стол упаковочный 400х500х900 (1 ед.), стол упаковочный 800х400х900 (1 ед.), тара-оборудование д/хлеба с дерев. лотками (6 ед.), тележка-подставка для торговых корзинок (3 ед.), урна металлическая 30л (1 ед.), шкаф ШМГ-2-1790-600-500 (28 ед.), шкаф-витрина 800/350/720 (1 ед.), шкаф-мойка 900/600/900 (1 ед.), шкаф-сушка 800/350/720 (1 ед.).	
Начальная цена с НДС, рублей	**17 458 953 600** (Семнадцать миллиардов четыреста пятьдесят восемь миллионов девятьсот пятьдесят три тысячи шестьсот) рублей с учетом НДС 20%
Задаток, рублей	**87 295 000** (Восемьдесят семь миллионов двести девяносто пять тысяч) рублей
Условия оплаты	Разовый платеж
Организатор аукциона	ООО «БелИнвестОценка», г. Минск, ул. Казинца, д. 4, оф. 411

Продавец объекта – **ОАО «Управляющая компания холдинга «Агрокомбинат «Мачулищи».**

Организатор аукциона – **ООО «БелИнвестОценка».**

К участию в торгах допускаются юридические и физические, подавшие заявление на участие в аукционе (по форме, установленной Организатором аукциона); заявление об ознакомлении с документами, продаваемым Объектом (по форме, установленной Организатором аукциона) и заключившие с Организатором аукциона соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона и иные документы.

Задаток перечисляется Организатору аукциона на р/с № 3012105044012 в ЦБУ № 701 ОАО «БПС-Сбербанк», код 369. Получатель – ООО «БелИнвестОценка», УНП 191692351.

Заявления на участие в аукционе принимаются в рабочие дни **с 9.00 до 17.00 по 01.12.2014 включительно** по адресу: г. Минск, ул. Казинца, д. 4, оф. 411 (здание ГО «Белресурсы»). Заключительная регистрация участников 02.12.2014 с 14.00 до 14.45 по месту проведения аукциона.

Участник, ставший победителем аукциона, после окончания аукциона обязан: подписать протокол аукциона; возместить затраты на организацию и проведение аукциона в течение 3 банковских дней после проведения аукциона; заключить договор купли-продажи с продавцом не позднее 20 рабочих дней со дня подписания протокола о результатах аукциона.

Всем желающим предоставляется возможность предварительно ознакомиться с объектами продажи. Конт. лицо: Дмитрий Владимирович 8(029) 113-24-66.

Дополнительную информацию можно узнать у Организатора аукциона: **8 (017) 398-28-50, 398-29-44, 8 (029) 142 33 07; e-mail: belinvo@tut.by, на сайте belinvo.by.**

Извещение о продаже объекта опубликовано в газете «Звязда» 27.11.2013 № 223 (27588).

ИЗВЕЩЕНИЕ о проведении 03 декабря 2014 года повторных торгов с условиями по продаже единым комплексом имущества, принадлежащего на праве хозяйственного ведения унитарному предприятию «АгроМАЗ»

Предмет торгов (сведения о продаваемом имуществе, входящем в состав предмета торгов)
Капитальное строение с инв. номером в ЕГРНИ 611/С-27834 общей площадью 1034,4 кв.м, с составными частями и принадлежностями согласно техническому паспорту, составленному по состоянию на 25.04.2011 (наименование – Мясоперерабатывающий комплекс); труба дымовая (инв. № 2032601); ванна для мойки (инв. № 4290301); оборудование МПЦ (инв. № 4510500); волчек МП-160 (б/у) (инв. № 4573811); термодымокамера УК-3/2 (инв. № 4510501); водяная баня WB-11 (инв. № 4510502); пила ленточная (инв. № 6003915); стиральная машина АРДО (инв. № 4508388); весы для взвешивания скота (инв. № 4703902); весы товарные ВТ-4014-500 Ш (инв. № 4703900); весы электронные ТВ-S-200, 2-А-1 (инв. № 4700101); трихениллоскоп ПТ-80 (инв. № 4520001); электрофотометр SH-830 (инв. № 4736001); эстакада (приспособление для погрузки и выгрузки скота) (инв. № 2035701); вешала для голов (инв. № 7017000); тележка для кож (инв. № 4573812); установка вакуумная для массирования мяса УВМ-400 (инв. № 4580300); весы лабор. (инв. № 4700102); весы электронные лабораторн.ВК-600 (инв. № 4700103); инъектор АN 20 (инв. № 4510201); тележка ручная (инв. № 4573810); принтер этикеток Х-2000V (инв. № 48000311); аквадистилятор электрический ДЭ-ТЗМОИ (инв. № 4601000); тележка ручная (инв. № 4573811); пеногенератор (инв. № 4510200); площадка для сбора костей (инв. № 4510203); экран для потока воздуха (инв. № 4510202); весы с печат. этикеток (инв. № 47070003); контейнер для отходов МПЦ (инв. № 7000011); шкаф для посуды (мебель) (инв. № 258); шкаф вытяжной металлический (инв. № 4519001); стеллаж в морозильную камеру (3 шт., инв. №№ 7001013, 7001014, 7001015); стеллаж для хранения моющих дезинф. средств (2 шт., инв. № 7001016, 7001018); стеллаж для хранения моющих и дезинф. средств (инв. № 7001017); стеллаж для хранения внутрицеховой тары (2 шт., инв. №№ 7001019, 7001020); подставка для мойки фортухов с подводом воды (2 шт., инв. №№ 7001021, 7001022); шкаф сушильный ШС-80 (инв. № 7002001); контейнер малый комбинированный (4 шт., инв. №№ 7000010, 7000011, 7000012, 7000013); стеллаж для тары (2 шт., инв. №№ 7001011, 7001012); стеллаж в камеру посола (5 шт., инв. №№ 7001023, 7001024, 7001025, 7001026, 7001027); подставка для сушки обуви (2 шт., инв. №№ 7001036, 7001037); стеллаж для охлаждения (6 шт., инв. №№ 7001028, 7001029, 7001030, 7001031, 7001032, 7001033); стеллаж для субпродуктов (инв. № 7001034); стеллаж для посола и хранения кишечного сырья (инв. № 7001035); стеллаж для охлаждения (инв. № 7001038); оборудование для МПЦ (инв. № 45105001); автоматический сигнализатор паров аммиака (инв. № 4402754); прибор КСМ 2-076, 2 тон (инв. № 4402753); комплект льдогенератора GB 1540 (инв. № 4510200); холодильное оборудование (инв. № 4506254).
Площадь земельного участка – 1,4664 га, кадастровый номер 620400000001000727
Местонахождение – Минская область, Березинский район, д. Василевщина
Начальная цена – 2 481 795 946 белорусских рублей без учета НДС
Сумма задатка – 240 000 000 белорусских рублей

Продавец имущества – унитарное предприятие «АгроМАЗ», 223311, Республика Беларусь, Минская область, Березинский район, д. Василевщина.

Организатор торгов – УП «Минский городской центр недвижимости», ул. К. Маркса, 39, к. 10, 220030, г. Минск.

Условие торгов – победитель торгов (покупатель) оплачивает вознаграждение за организацию и проведение торгов, включающее затраты на организацию и проведение результативного аукциона, в размере 1 процента от цены продажи предмета торгов, указанной в протоколе о результатах торгов, в течение 3 рабочих дней со дня проведения торгов.

Торги проводятся в соответствии со ст.ст. 417, 418 Гражданского кодекса Республики Беларусь и порядком проведения аукциона по продаже имущества унитарного предприятия «АгроМАЗ», утвержденным организатором торгов.

К участию в торгах допускаются юридические и физические лица, заключившие соглашение с организатором торгов о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона, внесшие задаток, а также представившие организатору торгов в установленный срок следующие документы:

заявление на участие в аукционе (по форме, установленной организатором торгов); заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, порядком проведения аукциона (по форме, установленной организатором торгов); копию свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); копию устава (для юридических лиц); копию платежного документа о внесении задатка; документы, подтверждающие полномочия представителя юридического (физического) лица; а также, при необходимости, иные документы в соответствии с порядком проведения аукциона.

Задаток перечисляется на расчетный счет УП «Минский городской центр недвижимости» № 3012104971019 в региональной дирекции № 700 ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск, код 153001369, УНП 190398583 не позднее окончания срока приема документов на участие в торгах.

Торги проходят в форме открытого аукциона с условиями на повышение начальной цены. Торги проводит аукционист, определенный организатором торгов. В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов, а наивысшая цена (цена продажи) фиксируется в протоколе о результатах торгов и не включает НДС. В ходе торгов участники могут предлагать свою цену за продаваемое имущество в соответствии с порядком проведения аукциона.

В случае, если торги признаны несостоявшимися в силу того, что заявление на участие в них подано только одним участником или для участия в них явился только один участник, предмет торгов продается этому участнику (покупателю) при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов.

Договор купли-продажи между продавцом и победителем торгов (покупателем) заключается после предъявления копии платежных документов о перечислении суммы вознаграждения за организацию и проведение торгов и подписывается в течение 10 рабочих дней со дня проведения торгов.

Оплата стоимости приобретенного имущества с учетом НДС осуществляется победителем торгов (покупателем) в порядке, предусмотренном в договоре купли-продажи. По согласованию с продавцом возможна рассрочка платежа.

Торги проводятся **03 декабря 2014 года в 12.00** по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов. Прием документов, а также консультации по вопросам участия в торгах осуществляются **с 19.11.2014 по 01.12.2014 включительно** в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 (по пятницам – до 16.45) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6.

Телефоны для справок: (017) 327-48-36 (017) 273-88-12, (044) 775-70-06.

Считать недействительным страховой полис СООО «Белкоопстрах» по добровольному страхованию от несчастных случаев и болезней на время поездки за границу формы 2РН, 2РП, серии БМ № 0742182 **в связи с утерей.**

ПРОЕКТНАЯ ДЕКЛАРАЦИЯ

(о проекте строительства «Жилая многоквартирная застройка со спортивным комплексом (спортивный зал, административно-бытовые помещения) и многоэтажным гаражом-стоянкой в границах улиц Шаранговича, Горецкого в г. Минске. 3-я очередь строительства. Жилой дом № 7 по генплану»)

Информация о застройщике: Открытое акционерное общество «МАПИД», расположенное по адресу: г. Минск, ул. Р. Люксембург, 205, режим работы: понедельник–четверг – 8.30–17.30, пятница – 8.30 – 16.15, обед – 12.45 – 13.30, суббота, воскресенье, государственные праздники – выходной.

Зарегистрировано в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей за № 100008115 решением Мингорисполкома № 197 от 26.02.2001 г.

Сведения о проектах строительства жилых домов в г. Минске, в которых принимал участие застройщик в течение трех лет, предшествующих заключению договора:

1. Жилой дом № 7 по ул. Киреенко, фактический срок строительства 16 месяцев.
2. Жилой дом № 26 по ул. М.Горецкого, фактический срок строительства 13 месяцев.
3. Жилой дом № 22 по ул. М.Горецкого, фактический срок строительства – 10 месяцев.
4. Жилой дом № 1 по ул. Прушинских, фактический срок строительства – 10 месяцев.
5. Жилой дом № 3 по ул. Прушинских, фактический срок строительства – 13 месяцев.
6. Жилой дом № 5 по ул. Прушинских, фактический срок строительства – 10 месяцев.
7. Жилой дом № 28 по ул. М.Горецкого, фактический срок строительства – 13 месяцев.
8. Жилой дом № 7 по ул. Прушинских, фактический срок строительства – 7 месяцев.
9. Жилой дом № 9 по ул. Прушинских, фактический срок строительства – 8 месяцев.
10. Жилой дом № 32 по ул. М.Горецкого, фактический срок строительства – 11 месяцев.
11. Жилой дом № 11 по ул. Прушинских, фактический срок строительства – 7 месяцев.

Информация о проекте и об объекте строительства:

Цель проекта – строительство многоквартирного жилого дома, в том числе с привлечением к строительству не менее 10% общей площади жилых помещений граждан, из числа многодетных семей, состоящих на учете нуждающихся в улучшении жилищных условий в администрациях районов г. Минска.

Положительное заключение государственной экспертизы № 1035-15/13 от 30.12.2013 г.

Местоположение строящегося многоквартирного жилого дома – г. Минск, Фрунзенский район, жилой дом № 7 по генплану в жилой многоквартирной застройке со спортивным комплексом (спортивный зал, административно-бытовые помещения) и многоэтажным гаражом-стоянкой в границах улиц Шаранговича, Горецкого. 3-я очередь строительства.

Характеристика объекта.

Объект – 119-квартирный, 10-этажный крупнопанельный жилой дом серии М-464-У1М с помещением товарищества собственников на первом этаже. Квартиры, предназначенные для заключения договоров создания объектов долевого строительства с гражданами, нуждающимися в улучшении жилищных условий, строятся с выполнением в полном объеме отделочных, сантехнических и электротехнических работ, предусмотренных проектно-сметной документацией. Стены: наружные, внутриквартирные и межквартирные перегородки – железобетонные панели. Перекрытия – железобетонные. Отопление – центральное. Электроснабжение – скрытая проводка.

Проектно-сметной документацией предусмотрены: канализация, горячее и холодное водоснабжение, радио, телевидение, мусоропровод, лифт, лоджии, остекление лоджий.

Стоимость 1м² общей площади объекта долевого строительства на дату опубликования проектной декларации для граждан из числа многодетных семей, состоящих на учете нуждающихся в улучшении жилищных условий в администрациях районов г. Минска и осуществляющих строительство по направлениям администраций районов г. Минска, а также по направлению экономического суда г. Минска согласно решению Мингорисполкома № 3302 от 26 декабря 2013 г.:

Для нормативной площади:

- с государственной поддержкой – **6 615 000 руб.;**
- без государственной поддержки – **7 045 000 руб.**

Для площади, превышающей нормативную площадь:

- с государственной поддержкой – **13 370 000 руб.;**
- без государственной поддержки – **13 800 000 руб.**

Застройщик вправе изменить цену объекта долевого строительства (цену договора) в случаях изменения статистических индексов стоимости строительно-монтажных работ в нормативный период строительства жилого дома, а также в случае отсутствия вины застройщика в невыполнении срока исполнения застройщиком обязательств по договору при наличии подтвержденных решением местного исполнительного и распорядительного органа форс

ГОРАД, ЯКІ ЛЮБІЦЬ СПОРТ

МІНСК ПРЭТЭНДУЕ НА ПРАВЯДЗЕННЕ ЛЕТНЯГА ЕЎРАПЕЙСКАГА ЮНАЦКАГА АЛІМПІЙСКАГА ФЕСТЫВАЛЮ Ў 2019 ГОДЗЕ

Заяўка Мінска будзе прэзентавана на Генеральнай асамблеі еўрапейскіх алімпійскіх камітэтаў, якая пройдзе ў Баку 21–22 лістапада, выбары сталіцы летняга ЕЮАФ-2019 таксама адбудуцца ў ходзе работы Генасамблеі ЕАК.

Падобны фестываль праводзіцца ў няцотныя гады і з'яўляецца комплексным спартыўным мерапрыемствам. Яго праграма ўключае спаборніцтвы па дзевяці відах спорту, сярод якіх баскетбол, веласпорт, валейбол, гандбол, дзюдо, лёгкая атлетыка, плаванне, спартыўная гімнастыка і тэніс. У турніры прымаюць удзел юнакі і дзяўчаты ва ўзросце ад 14 да 18 гадоў. Краіна-арганізатар атрымлівае права ўдзелу ў спаборніцтвах па ўсіх відах спорту поўным складам без праходжання адбору на папярэднім этапе.

Саветнік і прэс-сакратар Нацыянальнага алімпійскага камітэта Беларусі Настасся МАРЫНІНА расказала «Звяздзе» аб прэстыжы фестывалю і планах па яго правядзенні ў Мінску.

— Прыняцце такога спартыўнага мерапрыемства стане важным крокам у гісторыі развіцця алімпійскага руху, знакавай падзеяй у спартыўным жыцці горада, краіны і ўсёй Еўропы, а таксама дасць магчымасць умацаваць імідж і аўтарытэт Беларусі. Упершыню беларуская сталіца прыняла алімпійскія спаборніцтвы ў 1980 годзе, калі на стадыёне «Дынама» быў запалены алімпійскі агонь і прайшоў кваліфікацыйны турнір па футболе, а таксама адзін з матчаў чвэрцьфіналу. Цяпер з'явілася магчымасць адкрыць Мінск для маладых спартсменаў усяго кантынента.

Важна адзначыць, што пры правядзенні ЕЮАФ павінны быць выкананы ўсе працэдуры Міжнароднага алімпійскага камітэта: эстафета і запальванне алімпійскага агню, парад нацый і цырымонія адкрыцця, клятва спартсменаў і спартыўных суддзяў, узняцце алімпійскага сцяга.

Плануецца, што ад Беларусі ў працы Генасамблеі ЕАК прыме ўдзел заявачны камітэт «Мінск-2019». У яго склад увойдуць алімпійская чэмпіёнка Афін-2004 па атлетыцы ў бегу на дыстанцыі 100 м Юлія Несцярэнка, алімпійскі чэмпіён Барселоны-1992 па веславанні на каноэ Дзмітрый Даўгалёнак, генеральны сакратар НАК Беларусі Георгій Катулін, міністр спорту і турызму Аляксандр Шамко, памочнік Прэзідэнта па пытаннях фізічнай культуры, спорту і развіцця турызму Максім Рыжанкоў, а таксама афіцыйны прадстаўнік Мінгарвыканкама.

— Падчас прэзентацыі на Генасамблеі ЕАК будзе працаваць выставачная зона, дзе будзе прадстаўлена заяўка Мінска. Да гэтага мерапрыемства НАК, упраўленне спорту і турызму Мінгарвыканкама, прадпрыемствы «Мінскрэклама» і «Мінсктурыст» падрыхтавалі і выпусцілі промапрадукцыю: сувеніры, друкаваныя матэрыялы, рэкламныя стойкі і іншае. Сама цырымонія прэзентацыі заяўкі, а таксама працэдура галасавання адбудуцца 22 лістапада, — адзначыла Настасся Марыніна.

— Аргкамітэт па правядзенні спаборніцтваў прапануе дзве зоны. Першая — цэнтральная, усе аб'екты будуць размяшчацца на адным з самых спартыўных праспектаў у свеце — праспекце Пераможцаў. Так, «Мінск-Арэна» прыме спаборніцтвы па баскетболе і дзюдо. Побач пройдуць спаборніцтвы па веласпорце. У басейне БДУФК адбудзецца турнір па плаванні. У Мінскім футбольным манежы — па гандболе, на базе гарадскога цэнтра алімпійскай падрыхтоўкі па тэнісе па вуліцы Жудро спартсмены разыграюць узнагароды ў турніры па вялікім тэнісе. На базе мінскага Палаца спорту пройдуць спаборніцтвы па спартыўнай гімнастыцы. На абноўленым стадыёне «Дынама» — па лёгкай атлетыцы. Другая зона размесціцца на «Чыжоўка-Арэне», там пройдуць спаборніцтвы па валейболе.

Плануецца, што пражываць спартсмены і члены дэлегацый будуць у студэнцкай вёсцы, дзе падчас чэмпіянату свету па хакеі размяшчалася фан-зона і вялікая частка прыезджых гасцей. Цырымонія адкрыцця пройдзе на абноўленым стадыёне «Дынама», а святочная вечарына для ўсіх удзельнікаў — на «Мінск-Арэне».

У рамках гэтага фестывалю падрыхтавана і вялікая культурная праграма, дзякуючы якой удзельнікі, спартсмены, заўзятары, члены ўсіх дэлегацый змогуць пазнаёміцца з багатай культурнай і спартыўнай гісторыяй Беларусі.

Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ.

Даты. Падзеі. Людзі

19 ЛІСТАПАДА

1784 год — 230 гадоў таму нарадзіўся (вёска Вулька, Гродзеншчына) Міхаіл Кірылавіч Баброўскі, беларускі славіст, доктар тэалогіі (1823). У 1806 годзе скончыў Беластоцкую гімназію. З 1833-га жыў у мястэчку Шарашова Пружанскага павета. Член археалагічнай акадэміі ў Рыме, парыжскага і лонданскага азіяцкіх таварыстваў, камітэта па выпрацоўцы харвацкага правапісу. Прафесар Віленскага ўніверсітэта, кіраўнік беларуска-літоўскага філалагічнага гуртка. Збіраў беларускія рукапісы і кнігі. Гімназістам пачаў вывучаць архіў і бібліятэку Супрасльскага манастыра, дзе ў 1822 г. адкрыў і зрабіў здабыткам навукі Супрасльскі летапіс. Даследаваў гісторыю славянскага кнігадрукавання, збіраў матэрыялы аб дзейнасці І. Фёдарава, П. Мсціслаўца, Ш. Фіёля. Зрабіў навуковае апісанне старажытных кірылічных і глагалічных літаратурных помнікаў Ватыканскай бібліятэкі, увёў у навуковы ўжытак шэраг найважнейшых помнікаў гісторыі і культуры. Садзейнічаў узнікненню беларусазнаўства, разам з І. Даніловічам быў пачынальнікам беларускага нацыянальнага адраджэння. Зноўку адкрыў для беларускай і еўрапейскай навукі імя і справу Ф. Скарыны, звесткі пра якога ўвайшлі ў неапублікаваную «Гісторыю славянскіх друкарняў у Літве». З яго багатай творчай спадчыны захаваліся толькі асобныя рукапісы. Памёр у 1848 годзе.

1891 год — нарадзіўся (вёска Ярэмічы, цяпер Карэліцкі раён) Міхаіл Іванавіч Гурын-Маразоўскі, беларускі палітычны дзеяч. Удзельнік рэвалюцыйнага руху ў Заходняй Беларусі. З 1921 года — рэдактар газет «Беларуская вёска», «Савецкая Беларусь». З 1924-га — на падпольнай рабоце ў Заходняй Беларусі. Рэвалюцыйная група пад яго кіраўніцтвам меркавала і, трэба заўважыць, небеспадстаўна, што беларусы, якія жывуць па розныя бакі мяжы, вызначанай Рыжскім дагаворам, аднолькава пазбаўлены нацыянальнай волі. Свае надзеі яны ўскладалі на народнае паўстанне ў Заходняй Беларусі восенню 1924 года і стварэнне рэвалюцыйнага ўрада рабочых і сялян. Ён і толькі ён, на іх думку, мог вызваліць заходніх беларусаў ад польскай акупацыі. Аўтар успамінаў «З недалёкага мінулага». У 1928 годзе быў забіты ў Вільні агентам НКУС — многія тагачасныя беларускія палітыкі недаацанілі вераломства бальшавікоў, іх бязмежную жорсткасць. З тымі, хто, ведаючы гэта, адхіліў запрашэнне наведаць «першую ў свеце сацыялістычную дзяржаву, «спяцы» з Лубянкі распраўляліся ў самой Польшчы, перапраўшы туды найбольш падрыхтаваных кадраў, такіх, як Судаплатаў, Усціновіч і іншыя.

1919 год — на аснове коннага корпуса пад камандаваннем С. М. Будзёнага, сфарміраванага 26 чэрвеня 1919 года, была створана Першая Конная армія, вышэйшае

аператыўнае аб'яднанне савецкай кавалерыі ў перыяд замежнай ваеннай інтэрвенцыі і грамадзянскай вайны ў СССР 1918–1920 гадоў.

Было сказана

Максім ТАНК, народны паэт Беларусі:

«Да гэтага часу
Не маем слоўнікаў
Рэк, азёр,
Лясоў, звяроў,
Птушак і рыб.
Можа, таму
Паміж імі і намі
Столькі
Нявырашаных спраў,
Прыкрых непаразуменняў
І трагічных памылак».

НАРОДЖАНЫЯ 19 лістапада

З'яўляючыся ў душы рэфарматарамі, яны павінны настойліва ствараць штосьці новае. Яны часта захоплены замацаваннем ці ажыццяўленнем сваіх уладарных паўнамоцтваў, прычым гэта можа адбывацца як у сям'і, так і ў сацыяльнай групе і на службе. У большасці выпадкаў яны вылучаюцца звышнатуральнай самаўпэўненасцю, прычым за гэтым хаваецца і іх сіла, і іх слабасць адначасова. Дзякуючы свайму характару, часам задзірліваму, гарэзліваму, яны здольны не толькі абудзіць добрае ў людзях, але і разумець самую сутнасць жыццёвых сітуацый. Яны добра развітыя фізічна, клапоцяцца аб сваёй сям'і і крочаць «у нагу» з часам.

Крынічка

«Цякла тут з лесу невялічка
Травой заросшая крынічка».
Якуб КОЛАС.

Вядучая рубрыкі Ірына ТАМКОВІЧ. Тэл. 8 (017) 287-18-15

ЗАХОЎВАННЕ САДЖАНЦАЎ ЗІМОЙ

Набытыя ўвосень саджанцы кустоў многія садоўнікі не паспяваюць своечасова пасадзіць або прыкапаць у грунт на зімоўку. Калі бачыце, што тэрміны прайшлі, а страчваць саджанцы вельмі не хочацца, іх можна захаваць да вясновай пасадкі ў склепе, пад снегам або ў халоднай прыбудове пры ўмове падтрымання спрыяльнай для іх тэмпературы 0–5°С.

Больш «высокія градусы» выклічуць абуджэнне пупышак і ўтварэнне далікатных галінак на саджанцах, якія крануцца ў рост дзякуючы назапашаным унутраным сілам і пажыўным рэчывам, але пасля хутка знясіляцца. Пазбаўленыя святла і глебавага сілкавання, расліны, якія пачалі вегетацыю зноўку, неўзабаве загінуць. Выратаваць іх можна, хіба што перавёўшы на гаршковае вырошчванне ў цёплым памяшканні.

Пры тэмпературы ніжэй — 6°С у кустоў пашкодзяцца карані, нягледзячы на зімаўстойлівасць іх кроны да –35°С. Такая прыродная дыспрапорцыя ўласцівая практычна ўсім садовым культурам, калі верхняя частка здольная супрацьстаяць наймацнейшым маразам, а карані не вытрымліваюць паніжэння да –6–12°С і адміраюць.

...У СНЕГАВЫМ СХОВІШЧЫ

Аптымальным месцам прысутнасці роўнай і патрэбнай тэмпературы лічыцца снегавое сховішча, але перад захоўваннем у снезе саджанцы неабходна надзейна ўпакаваць у ахоўную абалонку.

Для гэтага іх акуратна звязваюць пучком, стараючыся не абламаць бакавыя галіны. З мешкавіны або нятканага матэрыялу робяць падабенства мяшка, напаўняюць яго сумессю пілавіння, вільготнага моху ці торфу. У гэты субстрат апускаюць пучок каранёвымі часткамі, раўнамерна падсыпаюць яго па краях, старанна ахоўваючы субстратам ніз пучка, і затым абвязваюць мяшок вакол каранёвай часткі. Пасля ўвесь пучок цалкам абгортваюць поліэтыленам і абвязваюць спакаваныя саджанцы скотчам у некалькіх месцах, каб замацаваць плёнку. Абалонка абароніць не толькі карані, але і стане перашкодай для мышэй.

У такой абгортцы расліны закопваюць у снег на зацененым будынкамі участку або каля агароджы, што абараняе ад выветрывання снежнага сховішча і сонечных прамянёў.

...У СКЛЕПЕ

Калі ёсць магчымасць захоўваць саджанцы ў склепе, дзе ўсю зіму стабільная тэмпература, замест поліэтылену можна выкарыстоўваць нятканы матэрыял, у які саджанцы ўкручваюць аналагічным спосабам, абвязваюць вяроўкай і потым накрываюць упакаваны пучок прыдатным матэрыялам. Напрыклад, непатрэбнай ватовай коўдрай.

...У ХАЛОДНЫМ БУДЫНКУ

Каб захаваць кусты да вясновых пасадак у халодным хляве ці яме гаража, дзе ўнутраная тэмпература наўпрост залежыць ад вулічнага клімату, трэба зрабіць дадатковае сховішча. Падбіраюць прыдатную драўляную або пластыкавую скрыню, якую запаўняюць сухім пілавінням, драўнянымі габлюшкамі або сенам і ўкладваюць у яго спакаваныя саджанцы. Зверху закрываюць непатрэбным цёплым адзеннем, калі скрыня не мае накрыўкі.

Памеры скрыні пажадана падбіраць так, каб прамежак паміж абгорнутым пучком і сценкамі скрыні, запоўнены пілавіннем, складаў прыкладна 10–15 см. Такое захоўванне саджанцаў, якое складаецца з некалькіх ахоўных слаёў штучнага «кліматычнага буфера», калі зберажэ не ўвесь пасадачны матэрыял, то большую частку раслін.

■ Кантрамарка

Як прайсці па музеі Дастаеўскага?

З пункта А ў пункт Б выйшлі некалькі чалавек. Адначасова з пункта Б у пункт А таксама выйшла група людзей… Не, гэта не задача з падручніка па матэматыцы. Сёння так можа пачынацца спектакль.

Фота Аляксандры МАНУЙЛЕНКІ.

ТЭАТР ЯК КАМП'ЮТАРНАЯ ГУЛЬНЯ

Уявіце: 2014 год, Фёдар Міхайлавіч Дастаеўскі бярэ ў рукі дыктафон ды выпраўляецца шукаць прататыпаў для персанажаў сваіх раманаў. Штодня жыхар вялікага горада сустракае тысячы людзей. На кім і чаму затрымаў бы пісьменнік сваю ўвагу, з кім бы загаварыў? Адказ на гэтае пытанне паспрабаваў знайсці малады пецярбуржац, галоўны рэжысёр «Эцюдтэатра» Сямён Серзін у спектаклі «Музей Дастаеўскага». Аднак расказ пра гэтую экспазіцыю давядзецца пачаць з кароткага знаёмства з сучаснымі тэатральнымі жанрамі — спектакль-квэст, тэатр спецыяльна падабраных месцаў (site-specific) і verbatim. Сінтэз гэтых трох жанраў і стаў каркасам для працы рэжысёра.

У сучасным тэатральным працэсе ўсё больш заўважнай робіцца тэндэнцыя сыходу са сцэны ў нетэатральную прастору. Рэжысёры ставяць і паказваюць спектаклі ў малапрыстасаваных, на першы погляд, для гэтага месцах: закінутых заводах, музеях, ажыўленых гарадскіх кварталах і нават у залах парламента. Жанр site-specific абнуляе глядацкае ўспрыманне, руйнуючы ўсе нашы чаканні ад паходу ў тэатр (ад буфета да камфортнага мяккага крэсла, у якім з табой нічога не здарыцца) — мы не ведаем, што з намі адбудзецца, калі мы трапім на спектакль: дзе будзем стаяць ці сядзець, наколькі будзем уключаны ў дзеянне. Да таго ж site-specific дазваляе адчуць водгук месца: напрыклад, заўважыць на гарадской вуліцы тое, чаго мы не заўважалі раней.

Жанр спектакля-квэста шмат у чым супадае з жанрам site-specific, аднак пад гэтае азначэнне падпадаюць толькі тыя пастаноўкі, дзе гледачы мусяць рухацца, змяняючы лакацыі. Зусім як у камп'ютарных гульнях-квэстах, дзе гульцы мусяць асвойваць віртуальную прастору. Сваю назву тэатральныя квэсты займелі менавіта дзякуючы віртуальнаму свету.

А вось verbatim (ад лацінскага «даслоўна») — гэта ўжо выключна тэкставая гісторыя, падмурак дакументальнага тэатра. Жанр, заснаваны на даслоўным фіксаванні мовы героя драматургам і далейшай даслоўнай перадачай зафіксаванага тэксту акцёрам, пры якой захоўваецца не толькі факталагічны складнік, але і інтанацыі, моўныя асаблівасці герояў.

Спектакль «Музей Дастаеўскага», які спалучыў гэтыя тры жанры, быў створаны ў Маскве ў межах лабараторыі «Месца дзеяння», што арганізаваў Саюз тэатральных дзеячаў Расійскай Федэрацыі, каб абжыць нядаўна адкрытыя побач з Тэатральным цэнтрам на Страсным «Баярскія палаты». Падчас рамонту з асабняка на Страсным бульвары, у якім захаваліся рэшткі баярскіх палат (анфілада скляпеністых зал са сценамі з чырвонай цэглы), было прынята рашэнне зрабіць нетэатральную тэатральную пляцоўку, дзе ў межах II маладзёжнага форуму-фестывалю «Артміграцыя» і адбыўся прэм'ерны паказ «Музея Дастаеўскага».

ПУБЛІЧНЫ ДОМ — ЦАРКВА — ШЫНОК

Перад пачаткам у вашых руках папяровая карта, дзе абазначана пяць маршрутаў, і нумар вашага, які дастаецца выпадкова. Самастойна крочыць у паўзмрок зал з экспазіцыяй «Музея Дастаеўскага» нельга, трэба чакаць сталкера. Нарэшце з'яўляецца дзяўчына з падсвечнікам у руцэ — яна павядзе вас на экскурсію.

Напачатку вы трапляеце ў публічны дом, дзе ў вітрынах танчаць дзяўчаты і жанчына сталага веку, вабячы гледачоў да сябе, каб распавесці пра свае «паламаныя» лёсы. Тут і надалей будуць гучаць гісторыі, пачутыя рэжысёрам і акцёрамі ў сучасным Пецярбургу, але ўкладзеныя ў вусны герояў Дастаеўскага: на карце абазначаны імёны, і вы дакладна ведаеце, да каго трапілі. Пасля публічнага дома, мінуўшы залу з відэаінсталяцыяй, вы апынаецеся ў Храме князя Мышкіна, дзе гучаць словы веры і бязвер'я. Потым — у шынку з Раскольнікавым, які прамаўляе тэкст, папраўляючы шалік заўзятара футбольнай каманды «Зеніт». Пасля спускаецеся ў падвал, дзе ў поўнай цемры чуваць замагільныя галасы з апавядання «Бабок». І, нарэшце, выходзіце на некалі Сямёнаўскі пляц, а цяпер Піянерскую плошчу ў Пецярбургу, дзе Фёдар Міхайлавіч Дастаеўскі перажыў інсцэніроўку смяротнага пакарання. Да гэтага жахлівага вопыту пісьменнік не раз вяртаўся ў сваіх творах. І вось цяпер, седзячы ў вялікай пустыннай клетцы, ён чытае з планшэта адно з гэтых апісанняў для гледачоў. У нейкі момант спыняецца і пачынае гаварыць пра смерць вуснамі сучаснага героя. Замаўкае. Спектакль скончаны.

Гледачы выходзяць з чырвонацагельных залаў фактычна паглядзеўшы пяць розных пастановак: паслядоўнасць сцэн для кожнага з маршрутаў была свая. Але з якой бы лакацыі спектакль ні пачаўся і дзе б ні скончыўся, вы ўсё роўна наблізіцеся да герояў Дастаеўскага. І ў прамым сэнсе: напрыклад, пасядзіце поруч з Раскольнікавым, бо прастора спектакля-квэста вымагае ад акцёраў існавання побач з гледачом. І ў пераносным: спраецыруеце іх вобразы на сучасных людзей і зможаце ўявіць сябе героем рамана.

ПРАСТОРА: УСЯРЭДЗІНЕ І ЗВОНКУ

Галоўная мэта спектакля-квэста і спектакля ў жанры site-specific — гэта стварэнне адносін паміж прасторай і гледачом. Месца, дзе рэжысёр і акцёры расставілі акцэнты дзеяннем, правакуе гледача на ўзнікненне пэўных пачуццяў. Часцей за ўсё гэтыя пачуцці выводзяць чалавека з зоны асабістага камфорту. Напрыклад, у цёмным падвале, дзе гучыць фрагмент апавядання «Бабок», для даследавання навакольля гледачы могуць карыстацца толькі слыхам. Гэта абвастрае ўспрыняцце тэксту і правакуе пачуццё трывогі.

Прастора можа супраціўляцца, як адбылося са мной у лакацыі князя Мышкіна. Вузкі пакой-пенал быў ператвораны ў царкву, дзе пахла ладанам, гарэлі свечкі, а на далёкай сцяне ледзь заўважна праступала выява Божай Маці, намаляваная крэйдай. Сцэнаграфія ўрыўка (мастак спектакля — Соф'я Мацвеева) у спалучэнні з маналогамі князя ад імя хлопца, які верыць, і дзяўчыны, якая не верыць, заступалі за нейкую крытычную мяжу тваёй унутранай асабістай прасторы і ўспрымаліся варожа. Прыняць знешнюю прастору і дзеянне стала магчымым толькі пасля пытання князя да залы і шчырага аповеду аднаго з гледачоў пра свайго маленькага сына.

Варта заўважыць, што матэрыял рэжысёр выбіраў, выходзячы менавіта з прасторы і яе архітэктуры, якая «цісне» на чалавека. Нездарма і Фёдар Міхайлавіч урэшце апынуўся ў клетцы, і галоўнай тэмай пастаноўкі стала смерць.

КВЭСТ У ПОШУКАХ СПЕКТАКЛЯ

Ці можна штосьці падобнае сёння пабачыць у Мінску? Зазначу, што засваенне нетэатральнай прасторы ў беларускім тэатры ідзе вельмі павольна. У нас і з тэатральнай далёка не ўсё добра — дастаткова паглядзець, напрыклад, колькі камерных сцэн працуе сёння ў сталіцы і колькі тэатраў маюць у іх неабходнасць. Праўда, у тых, хто хоча зазнаць сутыкненне з прасторай, шанц ёсць: варта толькі больш пільна сачыць за афішай праектных і эксперыментальных тэатраў. Апошні прыклад беларускага квэста — галерэя рэдзі-мэйд-аб'ектаў пад адкрытым небам «Стрытвокер», капрадукцыя Цэнтра эксперыментальнай рэжысуры (Беларусь) і эксперыментальнага тэатра Kud Ljud (Славенія). Стваральнікі галерэі вывучалі прастору Верхняга Горада і знаходзілі там творы мастацтва сярод звычайных рэчаў. І гэта, на жаль, прасцей, чым адшукаць дах над галавой для тэатральных эксперыментаў… Аднак дзе б з тэатральнага пункта А ў тэатральны пункт Б ні рухаліся гледачы, з'ява спектакля-квэста на постсавецкай прасторы (недзе хутчэй, недзе марудней) пазбаўляецца статусу ўнікальнай, пакідаючы словы «музей» і «галерэя» ў назве выключна як форма- і месцаўтваральныя.

Алена МАЛЬЧЭЎСКАЯ

СЁННЯ

Сонца

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск	8.44	17.05	8.21
Віцебск	8.39	16.49	8.10
Магілёў	8.34	16.55	8.21
Гомель	8.24	16.58	8.34
Гродна	8.58	17.22	8.24
Брэст	8.52	17.29	8.37

Месяц

Маладзік 22 лістапада.
Месяц у сузор'і Шаляў.

Імяніны

Пр. *Аляксандры, Ніны, Анатоля, Васіля, Мікалая, Паўла.*
К. *Альжбеты, Саламеі, Іпаліта, Максіма, Паўла, Севярына.*

Фота Аляксандра ШАБЛЮКА.

ЗАЎТРА



...у суседзяў

ВАРШАВА	+1..+3°С	КІЕЎ	+2..+4°С	РЫГА	+1..+3°С
ВІЛЬНЮС	+2..+4°С	МАСКВА	-4..-2°С	С.-ПЕЦЯРБУРГ	-5..-3°С

УСМІХНЕМСЯ

Кот прабег па клавіятуры, і я выпадкова падключыўся да сістэмы размеркавання сродкаў вядомага банка. Але пакуль я думаў, што буду рабіць з нечаканым багаццем, гэты гад прабег назад.

— Чаму жанчыны так любяць выходзіць замуж за ваенных?

— Таму, што тыя ўжо ўмеюць гатаваць, шыць, запраўляць ложак, маюць моцнае здароўе і прывучаны выконваць каманды.

Аб'ява ў краме крокавай даступнасці на Рублёўцы:

«Кожнаму, хто набыў скрыпку Страдывары, — скрыпач, выпускнік Маскоўскай кансерваторыі па класе скрыпкі, у падарунак!»

caricatura.ru

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: Н. ДРЫЛА (намеснік галоўнага рэдактара), Н. КАРПЕНКА (першы намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, А. ЛЯЎКОВІЧ (першы намеснік дырэктара), Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК.

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда»

АДРАС: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 287 18 38, 287 17 21, сакратарыята — 292 05 82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292 44 12; «Мясцовае самакіраванне» — 292 44 12, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20 37 98, Віцебску: 43 23 74, Гродне: 43 25 29, Гомелі: 40 91 92, Магілёве: 32 74 31, па Мінскай вобл.: (017) 292 21 03; бухгалтэрыі: 287 18 81.

http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zvyazda.minsk.by,
(для зваротаў): zvarot@zvyazda.minsk.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zviazda.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004.

220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 5 разоў на тыдзень. Тыраж 19.679. Індэкс 63850. Зак. № 4731.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

Нумар падпісаны ў 19.30 18 лістапада 2014 года.